Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 ЖНІЎНЯ 2008 г.
СЕРАДА
№ 145
(26258)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.


Ліст у нумар

## Зробім Навагрудак яшчэ больш прывабным для турыстаў!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У наступным, 2009 годзе, спаўняецца 965 гадоў з часу верагоднага заснавання старажытнага Навагрудка, 250 гадоў з часу выхаду ў свет першай кнігі па яго гісторыю (Львоў, 1759) і 65 гадоў з дня вызвалення горада ад фашысцкай акупацыі.

Грамадскасць і ўлады Навагрудка рыхтуюцца годна сустрэць гэтыя гістарычныя даты: працягнуць увекавечанне імёнаў выдатных людзей, звязаных са шматвяковай гісторыяй Навагрудчыны, правядуць шэраг цікавых мерапрыемстваў, якія зробяць свой славуты горад яшчэ больш прыгожым, ўтульным і прывабным для яго жыхароў і гасцей.

Нядаўна ў горадзе быў устаноўлены помнік Елісею Лаўрышаўскаму (скульптар Г.В. Буралкін), легендарнаму заснавальніку першага на Навагрудчыне манастыра. У будынку былой беларускай гімназіі (СШ № 1) адкрыты музей Барыса Кіта, знакамітага яе выпускніка. Рэгулярна праводзіцца свята горада, сярэднявечнай культуры, рыцарскія турніры, ладзяцца розныя выставы, значную культурна-асветніцкую працу ажыццяўляюць два музеі — гістарычна-краязнаўчы і Адама Міцкевіча.

Мы, ураджэнцы Навагрудчыны, патрыёты роднага краю і беларускай краіны, шчыра зацікаўлены ў далейшым усебаковым развіцці росце іміджу роднага горада, цалкам падтрымліваем намер мясцовых уладаў і грамадскасці горада ўзвесці ў Навагрудку помнік вялікаму князю і каралю Міндоўгу, заснавальніку Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

Ён сапраўды быў незвычайнай гістарычнай асобай, мужным воінам, умелым палітыкам, выдатным дзяржаўным дзеячам. У надзвычай цяжкіх гістарычных умовах Міндоўг змог закласці фундамент магутнай еўрапейскай дзяржавы, якая адыграла лёсавызначальную ролю ў гісторыі літоўскага і беларускага народаў. Упэўнена можна сцвярджаць, што без палітычнага аб'яднання раздробленых літоўскіх і беларускіх земель, ажыццёўленага ў XIII—XIV стагоддзях гэтым князем і яго паслядоўнікамі, наўрад ці змаглі б канчаткова сфарміравацца і захавацца ў гісторыі як асобныя этнасы гэтыя народы і наўрад змаглі б ствараць такую багатую і самабытную культурную спадчыну. І вельмі справядліва і слушна будзе ўвекавечыць у помніку імя Міндоўга менавіта ў Навагрудку — горадзе, які стаў першай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага і дзе Міндоўг быў каранаваны ў 1253 годзе.

Думка аб узвядзенні ў Навагрудку помніка Міндоўгу была ўпэўнена выказана, нераканачна абгрунтавана і цалкам падтрымана яшчэ ў 2003 годзе на Міжнароднай навуковай канферэнцыі, якая праводзілася ў Навагрудку і была прысвечана 750-годдзю каранацыі гэтага князя. Увасобіць жа яго вобраз пагадзіўся вядомы беларускі скульптар Г.В. Буралкін, які ўжо зрабіў папярэдні праект конная скульптуры Міндоўга.

Манумент Міндоўгу ўдала спалучыцца з іншымі помнікамі і гістарычнымі славутасцямі Навагрудка, несумненна, упрыгожыць гэты горад, дадаткова ўзніме яго імідж як аднаго з вядучых турыстычных цэнтраў нашай краіны і паспрыяе яшчэ большай турыстычнай прыцягальнасці горада. Нагадаем таксама, што ў 2010 годзе спаўняецца 600 гадоў з дня славутай Грунвальдскай бітвы, у якой важкі ўклад у агульную перамогу над ворагам унеслі і герайчныя рыцары Навагрудскай зямлі.

Намер узвесці манументальны помнік заснавальніку ВКЛ сведчыць, што ў Навагрудку добра ведаюць і паважаюць гістарычнае мінулае нашага народа, справядліва аддаюць належнае выдатным дзеячам беларускай гісторыі і культуры і не на словах, а на справе клапоцяцца аб умацаванні нацыянальна-патрыятычнай свядомасці сваіх грамадзян і захаванні высокага іміджу свайго старажытнага і мілагога горада.

**Міхаіл КАСЦЮК,**
**акадэмік НАН Беларусі, доктар гістарычных навук.**
**Вячаслаў ЧАМЯРЫЦКІ,**
**кандыдат філалагічных навук.**

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НЕ ПАДТРЫМЛІВАЕ ІДЭЮ ШТУЧНАГА ЎЗБУЙНЕННЯ ГАСПАДАРАК



Аляксандр ЛУКАШЭНКА ў час размовы з амерыканскімі бізнэсменамі.

Фота БЕЛТА.

Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў з рабочай паездкай Дзяржынскі раён Мінскай вобласці.

Кіраўнік дзяржавы наведаў ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі», дзе азнаёміўся з ходам уборкі ўраджаю, а таксама з арганізацыяй перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў арганізаваць у Беларусі эфектыўную перапрацоўку рапсу. Адказнасць за вырашэнне праблемы поўнай перапрацоўкі рапсу Прэзідэнт усклаў на прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага.

«Праблему рапсу тэрмінова трэба вырашаць. Размова ідзе аб тым, каб максімальна аптымізаваць перапрацоўку гэтай культуры ў краіне», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Цяпер сітуацыя з рапсам склалася як з цукровымі буракамі: атрымалі 3,5 млн тон і цукровыя заводы «захліпнуліся». Ураду ў гэтым плане трэба трымаць нос па ветры».

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што да ўборкі будучага ўраджаю трэба пабудаваць патрэбную колькасць комплексаў па перапрацоўцы рапсу.

Да пытанняў узбуйнення і аб'яднання гаспадарак у Беларусі неабходна падыходзіць старанна і ўзважана, лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Ён у цэлым пазітыўна ацаніў вопыт ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі», які быў створаны на базе птушкафабрыкі і аб'ядноўвае сёння некалькі гаспадарак. Паводле слоў спецыялістаў, падыходы, выкарыстаныя на прадпрыемстве, дадуць магчымасць дабіцца павелічэння вытворчасці прадукцыі, а таксама росту заработнай платы.

Прэзідэнт даручыў міністру сельскай гаспадаркі і харчавання Сямёну Шапіру дакладна прапрацаваць магчымыя аспекты далейшага развіцця птушкафабрык, іх пашырэння ў выпадку неабходнасці.

«Але ніякага штучнага далучэння або аб'яднання гаспадарак не павінна быць. Калі можна абысціся без аб'яднання — абыходзьцеся, галоўнае рэнтабельнасць. Узбуйняць гаспадаркі трэба выключна прадумана, маючы практычную мэту і толькі пад стабільным, багатым прадпрыемствам. У нас ёсць узоры, і па адпаведных прыкладах трэба прымаць рашэнні», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Гэта датычыцца не толькі птушкафабрык. У нас ёсць розныя жывёлагадоўчыя комплексы, вакол якіх можна было б аб'ядноўваць сельгаспрадпрыемствы, — адзначыў Прэзідэнт. — Там, дзе гэта абгрунтавана, ёсць рынак збыту прадукцыі, — трэба дзейнічаць».

Пры гэтым ён падкрэсліў, што ў Беларусі ўжо ёсць шмат прыкладаў эфектыўнага гаспадарання ў сферы жывёлагадоўлі. Гэты пазітыўны вопыт неабходна імкнуцца ўкараняць усюды.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што такія рашэнні па ўзбуйненні неабходна прымаць не адкладваючы. «Гэты этап неабходна прайсці вельмі хутка. Гэта будуць своеасаблівыя пункты росту. І заўтра нам ужо не трэба будзе ездзіць па палях — мы будзем займацца перспектывай», — сказаў Прэзідэнт.

Да канца дня аўторка ў Беларусі павінна быць намалочана амаль 4 млн тон збожжа. Аб гэтым праінфармаваў кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнку міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Сямён Шапіра.

Паводле папярэдніх прагнозаў, адзначыў міністр, у гэтым годзе будзе сабрана 8 млн тон збожжа. Аляксандр Лукашэнка зноў падкрэсліў, што вырашчаны ўраджай неабходна сабраць як мага хутчэй і без стратаў.

Прэзідэнт наведаў адно са збожжавых палёў прадпрыемства, дзе Аляксандру Лукашэнку былі прадэманстраваны магчымасці камбайна «Палессе-14» вытворчасці «Гомсельмаш». Паводле слоў спецыялістаў, беларуская распрацоўка — прататып амерыканскага збожжаўборачнага камбайна «Джон Дзір».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што да наступнай уборачнай неабходна дапрацаваць беларускую тэхніку, устараніўшы існуючыя недахопы.

Беларускай калійнай кампаніі трэба падумаць аб дыверсіфікацыі экспартнай прадукцыі, сказаў Аляксандр Лукашэнка ў ходзе рабочай паездкі размаўляючы з групай амерыканскіх бізнэсменаў.

Замежныя госці адзначылі высокую запатрабаванасць прадукцыі Беларускай калійнай кампаніі ў ЗША. У маі 2007 года пачаў работу офіс рэгіянальнага прадстаўніцтва БКК у Чыкага.

Рынак ЗША з'яўляецца адным са стратэгічных для БКК. Імкнучыся ўзняць узровень партнёрскіх адносінаў са сваімі кліентамі ў рэгіёне на якасна новы ўзровень, менеджары БКК распрацавалі эфектыўную лагістычную схему пастаўкі ўгнаенняў па рацэ Місісіпі з порта Новы Арлеан да канчатковага пакупніка.

Амерыканскія бізнэсмены, якія наведваюць Беларусь, маюць намер азнаёміцца з працэсам вытворчасці калійных угнаенняў у Салігорску.

У гэты ж дзень Прэзідэнт наведаў птушкафабрыку, якая ўваходзіць у склад агракамбіната. Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з эфектыўнымі планамі развіцця вытворчасці, а таксама з тэхналогіямі паглыбленай перапрацоўкі мяса птушкі.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**




## РАПС СТАВІЦЬ РЭКОРДЫ

**Сёлета на Гродзеншчыне ставіць рэкорды азімы рапс: упершыню сярэдняя ўраджайнасць, самая высокая ў краіне, склала 31 цэнтнер з гектара.**

А ў сельгаскааператывах «Тракельнікі» і «Гудагай» Астравецкага раёна, «Шылавічы» Ваўкавыскага раёна, «Кастрычнік-Гродна» Гродзенскага раёна і шэрагу іншых гаспадарак гектар даў больш за 50 цэнтнераў. У цэлым намалочана каля 123 тысяч тон — гэта больш чым удвая перавышае мінулагодні паказчык.

Першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Васіль Сцяпура адзначае, што гэты поспех дасягнуты дзякуючы выкарыстанню больш дасканалых тэхналогій і новых гатункаў. На сёння Гродзеншчына ўжо перавыканала дзяржаўны заказ па продажы рапсу. Не будзе праблем і з выкарыстаннем астатняй часткі ўраджаю, паколькі ў вобласці наладжана вытворчасць рафінаванага рапсавага алею для харчовых мэтаў, а таксама біядызельнга паліва. Акрамя таго, рапсавы алей выкарыстоўваецца і ў лакафарбавай прамысловасці.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

*5 жніўня адбылося ўрачыстае адкрыццё прамога авіярэйса Мінск—Абу-Дабі—Мінск — у беларускую сталіцу прыбыў першы самалёт з Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. Самалёт будзе выконваць палёты кожныя аўторак і чацвер, у красавіку па суботах дабавіцца яшчэ адзін рэйс.*

Нататкі радавога спажыўца

# БЕРАЖЫСЯ... ГАНДЛЯРА?

Трэба было адрамантаваць старую мяккую мэблю. Грамадзянін купіў мясцовую газету і пачаў тэлефанаваць. Зараз адпаведных прапаноў шмат. У першым выпадку не спадабалася, што прадпрымальнік браўся даць новае жыццё мэблі дома. Растлумачыў, што ў іншым выпадку давядзецца спецыяльна заказваць аўтамабіль. Адпаведна даражэй паслуга абыдзецца: «А так — прыедзем, гадзін за 6 ў вашым пакоі ўсё зробім», — сказаў дзелавы чалавек падчас тэлефоннай размовы. Але не вельмі хочацца спажыўцу, каб амаль увесь рабочы дзень яго кватэра была міні-майстэрняй. А калі яшчэ дома дзеці малыя...

У выніку спажывец звярнуўся да іншых спецыялістаў. Адразу здзівіла, што просьба падпісаць дагавор афармлення заказу засталася незадаволенай. «Мы ж так усё добра зробім, што мо і не трэба вам будзе ніякіх папер», — адзначыў майстар. Вось як! Канешне, прафесійны юрыст, напрыклад, адразу развітаўся б з такімі ўмельцамі. Калі паслуга ажыццяўляецца без афармлення ўсіх неабходных папер, што потым гаварыць пра законнасць такой паслугі? І ў выніку, калі правы спажыўца будуць парушаны (нізкая якасць, несвоечасовае аказанне паслугі) — куды бегчы па дапамогу? Трэба было думаць галавой раней. Апошняя гісторыя скончылася тым, што мэблю прывезлі літаральна праз дзень. І ў прынцыпе зрабілі рамонт нядрэнна. Выдалі спажыўцу толькі так званую «квітанцыю да талона». «А дзе тут напісана, што паслуга аказана менавіта мне?» — пацікавіўся спажывец. Напісалі яго прозвішча на гэтай паперцы, не абышлося без каментарыяў тыпу «Вы ў нас такі першы, мы — прадпрымальнікі, якія дагаворы?» «На пытанне спажыўца, дзе напісана пра тое, што гарантыя даецца на год, як было надрукавана ў газеце, спецыялісты адказалі: «Патэлефануеце — прыедзем, толькі сам механізм, калі зломіце, чыніць не будзем. Нават праз дзень».

Другая «мяккая гісторыя», на жаль, у разы болей сумная. Перацягвалі чытачцы старую канапу. Спінку і сядзенне чамусьці памянялі месцамі. У выніку сядаеш на канапу, а яна перакульваецца. «Мы ж перацягнулі добра!» — уступаюць у спрэчку гандляры. — «Перакульваецца? Ды так яно і будзе! А што мы цяпер ужо зробім?». Чытачка адзначыла, што і з ёй ніякага дагавора не падпісвалі. Проста пасля выканання заказу далі нейкую квітанцыю.

Няўжо тыя, хто рэгіструе прадпрымальнікаў, не тлумачаць ім, што абавязкова трэба афармляць усю неабходную дакументацыю? Існуе цэлы закон, што абараняе правы спажыўцоў. А быць можа такія квітанцыі, выдадзеныя спажыўцам, проста дазваляюць пазбягаць падаткаў? Асабліва пасля перарэгістрацыі прадпрымальнікаў, калі ўмовы іх дзейнасці значна змяніліся. І ці вядзецца нейкі кантроль за дзейнасцю прадпрымальнікаў з боку той жа адміністрацыі раёна, дзе зарэгістравалі? Колькі разоў даводзілася прыходзіць да высновы — не!

І ў крамах не ўсё добра з выдачай папер, неабходных спажыўцам. Паказальны прыклад наступны. У краме, што літаральна насупраць віцебскага карпункта «Звязды», у гандляркі запытаў: ці зможа яна мне даць акрамя чэка і копію, калі куплю батарэйкі для дыктафона. Апошні дакумент быў патрэбны для справаздачы ў бухгалтэрыю. Дзяўчына сказала, што так. У выніку напісала на самім чэку назву тавару. Але ж патрэбна копія? Параіла адшукаць загадчыцу. Тая адправіла назад. Гандлярка зноў накіравала да загадчыцы. Не зразумела кіраўніца «нечаканай просьбы». Потым гандлярка закрыла сваю секцыю і пабегла сама. Беспасяхова. Вярнуў я гэтыя батарэйкі і папрасіў грошы. Уяўляю, што было б, калі б я патрабаваў копію ліцэнзіі (зноў жа для справаздачы ў родную кантору).

Цікава, а як вядуць сябе прадпрымальнікі, якія таксама з'яўляюцца спажыўцамі? Няўжо такія даверлівыя, калі заказваюць паслугі ў «калег па цэху». Купяць нешта на рынку, у краме без сапраўднага чэка ды з гарантыяй. Закажуць без афармлення дагавора рамонт халадзільніка? Прабачце, але не веру!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Паэмны кампазітар Ігар Лучанок

**Людзі, якія шляхетна (!) клапоцяцца пра наш музычны рынак, разумеюць: беларуская песня на гэтым пераважна іншамоўным рынку — госця жаданая. І асабліва жаданыя песні Ігара Лучанка! *Песні Ігара Лучанка* — гэта не проста інфармацыйнае ці энцыклапедычнае, а ўстойліва-псіхалагічнае словазлучэнне, роўнае такім словазлучэнням, як, скажам, *санеты Шэкспіра,* або *законы Ньютана...* Творчасць кампазітара магнетычная па сваёй сутнасці, яна прыцягвае да сябе цудоўнае...**



Фота БЕЛТА.

Старшыню грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз кампазітараў» народнага артыста СССР Ігара Лучанка з 70-годдзем павіншаваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.

*У віншаванні, у прыватнасці, адзначаецца: «З Вашым імем звязаны самыя ўражальныя поспехі і дасягненні айчыннай музычнай культуры, і перш за ўсё песеннага мастацтва. Сплаў дзіўнага таленту і прафесіяналізму, уменне гарманічна спалучаць нацыянальныя традыцыі з сучаснымі творчымі тэндэнцыямі дапамаглі Вам стварыць мноства цудоўных твораў, якія ўвайшлі ў рэпертуар вядомых выканаўцаў і заваявалі любоў мільёнаў слухачоў». Прэзідэнт таксама высока ацаніў плённую работу Ігара Лучанка па пашырэнні і ўзбагачэнні міжнароднага культурнага супрацоўніцтва Беларусі.*

Думаю, перш за ўсё гэтым і тлумачыцца шматгадовае супрацоўніцтва Ігара Лучанка з «Песнярамі», з найдзівоснейшым Уладзімірам Мулявіным. У выніку гэтага супрацоўніцтва свет стаў прыгажэйшы, бо проста, лагодна і адразу ў душы людскія ўвайшлі песні — «Мой родны кут», «Добры вечар, дзяўчыначка», «Алеся», «А ў нядзелечку спараненечку», «Ой, у лесе, у гушчары», «Закасі мае вёсны», «Скажы мне, Ганулька», «Жураўлі на Палессе ляцяць», «Зачарованая мая», «Вераніка», «Пацалунак», «У тым сяле», «Балада аб маці», «Сын зямлі», «Падаюць сняжынкі», «Спадчына»...

У 2003 годзе Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства інтэлектуальнай уласнасці (РУПІУ) выдала гэтыя шэдэўры ў альбоме пад назвай «Творы Ігара Лучанка ў выкананні ансамбля «Песняры».

І што цікава, згаданы альбом не проста слухалі, а выкарыстоўвалі ў якасці дапаможніка ў школах на занятках па роднай літаратуры...

**(Заканчэнне на 5-й стар.)**

## Прэзідэнт Беларусі выказаў спачуванні ў сувязі са смерцю Аляксандра Салжаніцына

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сувязі са смерцю Аляксандра Салжаніцына накіраваў глыбокія спачуванні родным і блізкім выдатнага пісьменніка і грамадскага дзеяча.**

«Аляксандр Ісаевіч увайшоў у гісторыю як выдатны рускі празаік, публіцыст і мысліцель.

Яго творы вызначаюцца смеласцю, гістарычнай дакладнасцю і глыбінёй аналізу самых вострых сацыяльных і маральных праблем, вучаць цаніць свабоду і праўду.

У Беларусі Аляксандра Ісаевіча паважалі за найвышэйшую сілу духу, цвёрдую грамадзянскую пазіцыю, няспынныя маральныя пошукі, вернасць сваім перакананням у самых складаных і трагічных абставінах», — гаворыцца ў спачуванні.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### АБХАЗІЯ ГАТОВАЯ АДКРЫЦЬ ДРУГІ ФРОНТ

У Сухумі не выключаюць магчымасці адкрыцця другога фронту супраць Грузіі ў выпадку пачатку вайны ў Паўднёвай Асеціі — такі вынік пасяджэння Савета бяспекі Абхазіі, на якім абмяркоўваліся меры дапамогі Паўднёвай Асеціі, становішча ў якой абвастрылася напрыканцы мінулага тыдня. Паміж непрызнанымі рэспублікамі заключаны дагавор, які не толькі прадугледжвае ўзаемную ваенную дапамогу, але дазваляе звярнуцца па яе да трэцяга боку, напрыклад, да Расіі.

### ЛУЖКОЎ ПАСТАВІЦЬ У МАСКВЕ ВЯЛІКІ ПОМНІК ЗАГІНУЛЫМ ЖУРНАЛІСТАМ

**У хуткім часе ў Маскве, у парку Арцёма Баравіка ў Мар'іне, з'явіцца помнік загінулым журналістам. Аб гэтым заявіў на пасяджэнні ўрада сталіцы мэр Масквы Юрый Лужкоў.**

Лужкоў нагадаў, што ў парку ўжо стаіць памятная стэла. «Я думаю, што там можна будзе паставіць і вялікі помнік, — дадаў ён. — Імёны Арцёма Баравіка, Ганны Паліткоўскай, Дзмітрыя Холадава і іншых журналістаў павінны быць у памяці людзей».

### БУРА Ў ПОЛЬШЧЫ: ДРЭВАМ ЗАБІЛА ДЗЯЎЧЫНУ



**Адзін чалавек загінуў, чацвёра параненыя, двое зніклі без вестак у выніку буры, якая пранеслася над Польшчай.**

У Легіёнаве на аўтамабіль, у якім знаходзілася 15-гадовая дзяўчына, звалілася дрэва. Пацярпелая была дастаўленая ў шпіталь, аднак урачы выратаваць яе не змаглі. У Варшаве іншае дрэва таксама звалілася на машыну. Параненыя жанчына і дзіця. Яшчэ два чалавекі атрымалі раненні з-за буйства стыхіі ў Сілезіі.

На рацэ Сан бура перакуліла лодку, у якой знаходзіліся двое маладых людзей. На месцы здарэння ўчора праводзілася выратавальна-пошукавая аперацыя. Пакуль маладыя людзі лічацца зніклымі без вестак.

### 10-ГАДОВАМУ МАТАДОРУ НЕ ДАЮЦЬ ВЫСТУПАЦЬ У ФРАНЦЫІ



**Улады горада Арль на поўдні Францыі забаранілі выступаць 10-гадоваму матадору, які стаў зоркай карыды ў Мексіцы. Мішэль Пенічэ, які атрымаў мянушку «Мічэліта», выступае на рынгу з шасці гадоў і за гэты час забіў 60 маладых быкоў.**

У Францыі ён павінен быў прыняць удзел у разнавіднасці карыды, у якой быка не забіваюць у канцы. У якасці афіцыйнай прычыны адмены выступлення былі названыя меркаванні бяспекі. Прадстаўнікі арганізацыі, якая выступае супраць правядзенні карыды, раскрытыкавалі ўдзел дзіцяці ў падобных забавах.

### ЖАНЧЫНЫ-ПАЛІЦЭЙСКІЯ Ў ГЕРМАНІІ АТРЫМАЮЦЬ «СПЕЦБЮСТГАЛЬТАРЫ»



**Усе паліцэйскія Германіі жаночага полу ў дадатак да стандартнай экіпіроўкі атрымаюць бюстгальтары, якія дапамагаюць не пацярпець ад стрэлаў, паведамляе Bild.**

На працягу двух месяцаў у абстаноўцы строгай сакрэтнасці праводзіліся выпрабаванні бюстгальтара, і зараз ён гатовы да масавага выкарыстання. «Яны могуць выратаваць жыццё», — кажа 34-гадовая Кармэн Кібат, афіцэр паліцыі Гамбурга. Менавіта яна арганізавала па ўсёй краіне акцыю «спецбюстгальтар». Гэты адмысловы прадмет туалета атрымае кожная з трох тысяч жанчын-паліцэйскіх, якія ўдзельнічаюць у затрыманнях злачынцаў, суправаджаюць дэманстрацыі, ахоўваюць дзяржаўную мяжу або абараняюць насельніцтва ад тэрактаў.

Увага! «Прамая лінія»

## Пенсійная тэма. Якія праблемы?

Асаблівасці вызначэння стажу, разлік індывідуальнага каэфіцыента, датэрміновы выхад на пенсію, змяненні ў заканадаўстве — аб гэтым і іншым мы прапануем пагутарыць падчас «прамой лініі» з удзелам начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Вікенцьеўны Каралёвай.

Такім чынам, згодна з папярэдняй дамоўленасцю, наша «прамая лінія» пройдзе **19 жніўня з 11 да 12 гадзін** па рэдакцыйных тэлефонах (8-017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна задаваць па нумары 287 17 57.


**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Минском райисполкоме**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже обращенного в доход государства незавершенного строительством блокированного жилого дома (общ. пл. 3 712,56 кв.м) и земельных участков пл. 0,1546 и 0,1656 га в д. Копище Минского р-на. Начальная цена составляет 6 022 121 580 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 20.05.2008 г. **Аукцион состоится 22.08.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 21.08.2008 г. до 17.00 по указанному адресу.

**Контактный телефон (8017) 2246134.**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

белагропромбанк
традиции будущего

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»**

**СООБЩАЕТ, ЧТО 20 АВГУСТА 2008 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ**

*220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.*

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

***1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.***

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 1 августа 2008 года.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения и расчетно-кассовые центры по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 18 августа 2008 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 30 августа 2008 года.

**Телефоны для справок: 8(017) 250 60 02, 228 53 03.**

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136

время работы 8.00-20.00 без выходных и праздничных дней;
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (БеСТ, Velcom, МТС) - по тарифам операторов мобильной связи.

www.belapb.by

*Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 27.10.2006 г. № 2. УНП 100693551.*


*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.08.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 112,00 |
| 1 еўра | 3 274,55 |
| 1 латвійскі лат | 4 643,80 |
| 1 літоўскі літ | 948,38 |
| 1 чэшская крона | 136,21 |
| 1 польскі злоты | 1018,74 |
| 1 расійскі рубель | 90,12 |
| 1 украінская грыўня | 455,30 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 23,4354 |
| 10 UAH | 50,5204 |
| 1000 BYR | 11,0806 |
| EUR | 36,3999 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 5.08.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова


*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*



ISSN 1990 - 763X

## Прэзідэнт Беларусі падпісаў закон аб сродках масавай інфармацыі

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# ЗАКОН ДЛЯ ЧАЦВЁРТАЙ УЛАДЫ

**У Беларусі праз шэсць месяцаў — у лютым 2009 года — уступіць у сілу закон «Аб сродках масавай інфармацыі». Аб асноўных заканадаўчых новаўвядзеннях, якія датычацца чацвёртай улады, расказаў БЕЛТА міністр інфармацыі Уладзімір РУСАКЕВІЧ.**

Першы ў Беларусі закон аб СМІ быў прыняты ў 1990-я гады і фактычна з'яўляўся калькай з расійскага закона. За апошнія 15 гадоў усе сродкі масавай інфармацыі, як друкаваныя, так і радыё, тэлебачанне, перажылі бурнае развіццё, а галоўнае, атрымала масавае распаўсюджанне інтэрнэт-індустрыя, адзначыў Уладзімір Русакевіч. «СМІ кардынальна змяніліся. Час запатрабаваў ад спецыялістаў распрацоўкі новай нарматыўнай базы для інфармацыйнай прасторы», — патлумачыў ён, падкрэсліўшы, што пры падрыхтоўцы новага законапраекта было прааналізавана заканадаўства Расіі, Літвы, Украіны, Германіі, Вялікабрытаніі, Францыі, Нідэрландаў, Швецыі.

Згодна з новым законам парадак дзяржрэгістрацыі СМІ, якія распаўсюджваюцца праз глабальную камп'ютарную сетку інтэрнэт, аднесены да кампетэнцыі Савета Міністраў Беларусі. На падрыхтоўку дакументаў, якія спадарожнічаюць закону, спецыялістам Міністэрства інфармацыі адведзена паўгода. Цяпер у стадыі абмеркавання знаходзіцца пытанне аб падрыхтоўцы праекта пастановы Савета Міністраў, якая рэгулюе дзейнасць інтэрнэт-СМІ. Магчыма, праз месяц Мініфарм падрыхтуе адпаведныя прапановы, паведаміў Уладзімір Русакевіч.

У законе ўпарадкаваная працэдура заснавання і дзяржрэгістрацыі СМІ, дакладна вызначаны пералік дакументаў, якія прыкладаюцца да заявы аб іх рэгістрацыі. Устаноўлена, што ўсе зарэгістраваныя СМІ падлягаюць уключэнню ў дзяржаўны рэестр СМІ, вядзенне якога ўскладзена на Міністэрства інфармацыі. Новы закон ліквідуе існуючы парадак узгаднення размяшчэння СМІ з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. Уводзіцца паняцце «юрыдычная асоба», на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі, што дазволіць размежаваць працэдуру дзяржрэгістрацыі юрасобаў з працэдурнай рэгістрацыяй СМІ.

Ліквідаваны прабелы ў прававым рэгуляванні парадку фінансавання СМІ. У прыватнасці, устаноўлена забарона на атрыманне грашовых сродкаў і іншай маёмасці ад замежных юрасобаў, замежных грамадзян, асобаў без грамадзянства, якія пастаянна не пражываюць на тэрыторыі Беларусі, за выключэннем выпадкаў іх удзелу ў статутным фондзе юрасобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі СМІ. Забараняецца таксама атрыманне грашовых сродкаў ад ананімных крыніц. Прапісаны выпадкі незаконнага абмежавання свабоды СМІ. У іх ліку ажыццяўленне цэнзуры, незаконнае прыпыненне або спыненне выпуску сродкаў масавай інфармацыі, прымушэнне журналіста да распаўсюджання або адмовы ад распаўсюджання інфармацыі.

Закон удакладняе парадак акрэдытацыі журналістаў. Устаноўлена забарона на ажыццяўленне прафесійнай дзейнасці журналістаў замежных СМІ без акрэдытацыі.

Узмоцнена адказнасць заснавальніка СМІ. У прыватнасці, прапісана, што ён нясе адказнасць за выкананне патрабаванняў, заяўленых ім пры дзяржрэгістрацыі СМІ, а таксама за змест інфармацыі, якая распаўсюджваецца заснавальным ім СМІ.

У законе ўстаноўлены катэгорыі інфармацыі, распаўсюджанне якой у СМІ забаронена або абмежавана. Да іх адносяцца звесткі, якія прапагандуюць выкарыстанне наркотыкаў, псіхатропных рэчываў, інфармацыя, накіраваная на прапаганду вайны, экстрэмісцкай дзейнасці, насілля або жорсткасці, а таксама скрытыя ўстаўкі, якія ўздзейнічаюць на падсвядомасць людзей або аказваюць шкодны ўплыў на іх здароўе.

У нарматыўным акце дадзены азначэнні такіх паняццяў, як від СМІ, карэспандэнцкі пункт, недакладная інфармацыя, замежны сродак масавай інфармацыі.

Пасля ўступлення ў сілу гэтага закона ўсе СМІ павінны будуць прайсці перарэгістрацыю. Яна будзе ажыццяўляцца без спагнання платы за ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у статутныя дакументы. Таксама абазначаны тэрмін, на працягу якога за заснавальнікам СМІ захоўваецца права прыступіць да выпуску сродку масавай інфармацыі: на працягу аднаго года — для тэлебачання і радыё, 6 месяцаў — для друкаваных СМІ з дня ўключэння іх у дзяржаўны рэестр.

Перагледжаны таксама патрабаванні перарэгістрацыі СМІ пры змяненні адраса юрасобы, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі СМІ: у дадзенай сферы ўведзены інстытут паведамлення.

У законе таксама вызначаны эфектыўны механізм прымянення мераў адказнасці да суб'ектаў праваадносінаў у сферы масавай інфармацыі. У прыватнасці, удакладнены падставы для вынясення СМІ пісьмовага папярэджання, прыпынення і спынення яго выпуску.

# БЕЛАРУСЬ ЗА ДЭМАКРАТЫЧНЫЯ ВЫБАРЫ

***Наша краіна далучаецца да электаральных стандартаў, прынятых дзяржавамі-ўдзельніцамі СНД***

**Сустрэчу з журналістамі старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына пачала з цікавай і досыць нечаканай навіны. Па даручэнні Міністэрства замежных спраў яна зрабіла афіцыйную заяву — Беларусь далучаецца да Канвенцыі аб стандартах дэмакратычных выбараў, выбарчых правоў і свабод у дзяржавах-удзельніцах СНД.**

Крыху гісторыі: дакумент гэты быў падпісаны Арменіяй, Грузіяй (з агаворкай), Кыргызстанам, Малдовай, Расіяй, Таджыкістанам і Украінай (таксама з агаворкай) 7 кастрычніка 2002 года ў Кішынёве. Мінулым летам напярэдадні парламенцкіх выбараў да канвенцыі далучыўся і Казахстан. Сёлета такі ж ход робіць наша краіна.

— Канвенцыя распрацавана пад эгідай Цэнтральнай выбарчай камісіі Расійскай Федэрацыі, прычым з актыўным нашым удзелам, — падкрэсліла спадарыня Ярмошына. — І ў сапраўднасці Рэспубліка Беларусь даўно выконвае гэтую Канвенцыю. Не далучаліся мы па фармальных падставах: наша Канстытуцыя ў адным пункце не адпавядае Канвенцыі — у нас прадугледжана абмежаванне галасавання для асобаў, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі да прыгавору суда.

Пры гэтым старшыня Цэнтральнай камісіі заўважыла, што ад краін-удзельніц не патрабуецца імгненнага выканання ўсіх палажэнняў Канвенцыі. За выключэннем згаданага моманту, выбарчае заканадаўства Беларусі поўнасцю адпавядае стандартам гэтага дакумента. Лідзія Ярмошына ацаніла далучэнне Беларусі да Канвенцыі як важны палітычны крок, што ў чарговы раз пазіцыянуе Беларусь у якасці дзяржавы, прыхільнай ідэалам дэмакратыі, свабоднага правядзення выбараў і назірання за імі. Саму Канвенцыю старшыня ЦВК назвала «найбольш поўным міжнародным дакументам, які вызначае правілы правядзення свабодных і справядлівых выбараў». Аднак распаўсюджвання Канвенцыі на ўсю Еўропу дагэтуль не адбылося.

**МАНІТОРЫНГ ВЫБАРАЎ**

Паводле інфармацыі ЦВК па ўсёй краіне сёння акрэдытавана 152 назіральнікі. З іх чацвёра нацыянальных (прадстаўнікі палітычных партый і Беларускага Хельсінкскага камітэта) і 30 міжнародных (ад СНД) акрэдытаваныя пры Цэнтральнай камісіі, астатнія ж — у акруговых. Лідзія Ярмошына падкрэсліла, што «Беларусь ніколі не абмяжоўвае місіі назіральнікаў колькасна і не робіць ніякіх агаворак». Яна дадала таксама, што вялікі інтарэс праявіла Парламенцкая асамблея СНД — у плане работы сваіх прадстаўнікоў у якасці доўгачасовых назіральнікаў. Гэта і не дзіўна, калі ўлічваць, што пры Асамблеі ўтвораны Інстытут маніторынгу выбараў.

**УЧАСТКОВЫЯ — ПА СЛЯДАХ АКРУГОВЫХ**

Зараз у краіне пакрысе фарміруюцца ўчастковыя выбаркамы. У патэнцыйных іх супрацоўнікаў ёсць магчымасць вылучыцца да 10 жніўня ўключна. Наступныя тры дні адводзяцца выканаўчай уладзе на тое, каб разгледзець прапанаваныя кандыдатуры і сфарміраваць камісіі. Ужо 14 жніўня яны прыступяць да працы. Лідзія Ярмошына нагадала, што ў складзе ўчастковай камісіі працуе ад 5 да 19 чалавек — у залежнасці ад колькасці выбаршчыкаў. Тых у сваю чаргу можа быць як мінімум 20, як максімум — 3 000. Самыя малыя ўчасткі звычайна ў лячэбных установах, вайсковых часцях або па-за межамі краіны.

Старшыня ЦВК падкрэсліла важнасць бягучага перыяду выбарчай кампаніі і выказала спадзяванне, што ён пройдзе гэтак жа свабодна і адкрыта, як адбылося фарміраванне акруговых выбаркамаў. Цэнтральная выбарчая камісія рэкамендавала арганізаваць дзяжурствы нават у выхадныя дні — «каб усе фігуранты, якія маюць намер вылучыць сваіх прадстаўнікоў у склад участковых камісій, змаглі падаць дакументы».

**ПАРТЫЙЦАМ НЕ ДА РЭВЕРАНСАЎ**

Працягваецца таксама вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты. За аўтографы выбаршчыкаў змагаюцца больш як чатыры сотні ініцыятыўных груп па ўсёй Беларусі. Пры гэтым старшыня Цэнтрвыбаркама адзначыла, што, паводле слоў кандыдатаў, збор подпісаў пакуль ідзе праблемна.

— Больш як 100 ініцыятыўных груп сфарміраваны членамі палітычных партый, пры гэтым 80 працэнтаў — прадстаўнікі апазіцыйных партый, — падкрэсліла Лідзія Ярмошына.

Што да вылучэння ад партый, то ні адна з іх, паводле інфармацыі старшыні ЦВК, з'езд пакуль не правяла. Унутрыпартыйную барацьбу, у тым ліку напярэдадні выбараў, Лідзія Ярмошына лічыць натуральнай:

— У таго, хто знаходзіцца на партыйнай верхавіне, больш шанцаў быць вылучаным кандыдатам, а значыць, і абраным у парламент. І партыя — абсалютна не тое месца, дзе ўсе белыя і пушыстыя, робяць рэверансы і саступаюць адзін аднаму месца — вядома ж, там ідзе барацьба. І метады барацьбы, дзякуй богу, у нас яшчэ парламенцкія — прынамсі, ніхто не б'ецца. Мяркую, што гэта будзе ўсё ўзмацняцца, аднак у гэтым няма нічога экстрэмальнага, усё абсалютна нармальна.

Прыкметная і роля працоўных калектываў — на іх «рахунку» ўжо сямёра вылучэнцаў, якія падалі неабходныя дакументы ў акруговыя камісіі. Сярод патэнцыйных кандыдатаў заўважаны таксама 44 дзеючыя дэпутаты, у тым ліку Алег Вялічка, Уладзімір Здановіч, Сяргей Касцян, Міхаіл Русы, Віктар Гумінскі, Мікалай Чурсін, Вольга Абрамава, Генадзь Давыдзька... Аднак многія з іх «праходзяць» ужо не па сваёй акрузе, таму што адбыліся пэўныя змены ў канфігурацыі выбарчых акруг. А найбольшай папулярнасцю сярод сушукальнікаў, паводле слоў Лідзіі Ярмошынай, карыстаецца звычайна Партызанскі раён сталіцы.

Сёння ЦВК прагназуе конкурс у сярэднім 4,5 кандыдата на адну акругу — крыху ніжэйшы за папярэднія ацэнкі. А значыць, невялікую частку бюджэтных сродкаў удасца зэканоміць. «І акруговая камісія па выніках выбараў, спадзяюся, зможа сябе прэміяваць — я вельмі рада гэтаму», — падзялілася сваімі меркаваннямі Лідзія Ярмошына.

**УСЁ ПАВОДЛЕ ПЛАНА!**

Старшыня ЦВК зазначыла, што работа Цэнтральнай камісіі ідзе паводле плана і даволі спакойна. Скаргі, як выказалася спадарыня Ярмошына, — рабочага характару, і «калі там і згадваюцца факты парушэнняў, то яны не носяць сістэмнага характару».

Цэнтральная выбарчая камісія таксама прымае меры для таго, каб выключыць магчымасць двайнога галасавання грамадзян. Мы пісалі раней, што каля 14 тысяч беларусаў тэарэтычна могуць прагаласаваць па месцы і часовага, і пастаяннага пражывання. І хоць патэнцыйныя парушальнікі на выбарах «надвор'я» не зробяць — іх усяго 0,2 працэнта, — Цэнтральная камісія імкнецца папярэдзіць іх захады. ЦВК звярнулася ў Міністэрства ўнутраных спраў з тым, каб у час выбараў звесткі пра часова зарэгістраваных асобаў накіроўваліся па пастаянным месцы жыхарства для выключэння іх са спісаў выбаршчыкаў ва ўчастковых камісіях.

— Мы працуем на спрыяльнае развіццё падзей, — падкрэсліла старшыня Цэнтрвыбаркама. — Я маю на ўвазе максімальнае набліжэнне працэдур, што будуць праводзіцца ў нашай краіне, да тых ідэальных стандартаў свабодных і справядлівых выбараў, якія фармулюе перш за ўсё Капенгагенскае пагадненне і, вядома ж, Канвенцыя аб стандартах свабодных і справядлівых выбараў.

Лідзія Ярмошына зрабіла акцэнт на тым, што для афіцыйнай улады важная станоўчая ацэнка — «не толькі міжнароднымі назіральнікамі, але і найперш нашымі выбаршчыкамі».

**Ала МАЧАЛАВА.**

### Пенсіі

## Графік прайшоў? Будзе даплата

**У выніку рашэння аб павелічэнні пенсій выдаткі Фонду сацыяльнай абароны на гэтыя мэты ўзрастуць на 96 мільярдаў і складуць 964 мільярды рублёў у месяц. Разам з тым, паведаміла ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціна Каралёва, сама па сабе гэта акалічнасць ніяк не адаб'ецца на графіках выплат — неабходныя сродкі ў Фондзе ёсць.**

Як зазначыла Валянціна Каралёва, выплата працоўных пенсій у новых памерах адбудзецца менавіта ў жніўні. У прыватнасці, асобам, графікі якіх прыйшліся на дні да прыняцця рашэння аб пераразліку, плануецца зрабіць даплаты да канца гэтага месяца.

Дарэчы, варта нагадаць, што з 1 жніўня памер сярэдняй працоўнай пенсіі па ўзросце павялічыўся на 11,2 працэнта — да 408,1 тыс. рублёў. Адначасова памер максімальнай пенсіі па ўзросце непрацуючым пенсіянерам пры стажы 45 гадоў у мужчын або 40 гадоў у жанчын і індывідуальным каэфіцыенце 4,0 і вышэйшым складзе 634,2 тыс., максімальны памер пенсіі працуючым пенсіянерам пры такім жа стажы і каэфіцыенце 1,3 і вышэйшым — 460,4 тыс., а памер мінімальнай пенсіі па ўзросце пры стажы мужчын 25 і жанчын 20 гадоў — 185 тыс. рублёў.

Пры гэтым, заўважыла Валянціна Каралёва, памер павелічэння пенсіі ў кожнага пенсіянера атрымаецца розным і будзе залежаць ад стажу і індывідуальнага каэфіцыента заробку.

**Сяргей ГРЫБ.**

## Зноў шэршні

**Тыдзень таму «Звязда» паведаміла пра трагічны выпадак у Кіраўскім раёне: там 50-гадовы масквіч, які пайшоў у лес у грыбы, памёр ад укусаў шэршняў. Падобнае здарэнне адбылося 2 жніўня ў Быхаўскім раёне.**

Паблізу горада Быхава на беразе Дняпра памёр 40-гадовы рабочы мясцовай ПМК. Паводле расповедаў сведкаў, мужчыну некалькі разоў уджалілі шэршні. Цяпер вядзецца праверка абставінаў смерці чалавека, а мясцовыя сродкі масавай інфармацыі сталі засцерагаць жыхароў Магілёўшчыны ад небяспечных вялікіх дзікіх восаў. Медыкі паведамілі пра павелічэнне колькасці людзей, якія звяртаюцца па дапамогу ў сувязі з укусамі пчолаў, восаў і шэршняў. У ліпені зарэгістравана больш за 80 такіх выпадкаў — а гэта ў 3,5 раза болей чым у ліпені мінулага года.

**Алена КАЗЛОВА.**

## Двое былых высокапастаўленых супрацоўнікаў КДБ Беларусі прыгавораны да 8 і 6 гадоў пазбаўлення волі

**Ваенная калегія Вярхоўнага суда Беларусі прыгаварыла да працяглых тэрмінаў пазбаўлення волі двух былых высокапастаўленых супрацоўнікаў КДБ, паведамілі ў Вярхоўным судзе.**

Былы начальнік упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю КДБ Міхаіл Міхалап прыгавораны да 8 гадоў пазбаўлення волі, а былы начальнік упраўлення кадравай і ідэалагічнай работы КДБ Аляксандр Мяцеліца — да 6 гадоў пазбаўлення волі.

Першы прызнаны вінаватым у махлярстве, атрыманні хабару, падбухторванні да дачы хабараў, а таксама ў злоўжыванні ўладай і службовымі паўнамоцтвамі. Другі прызнаны вінаватым у махлярстве, незаконным набыцці, нашэнні і захоўванні боепрыпасаў, падбухторванні да дачы хабару, у злоўжыванні ўладай і службовымі паўнамоцтвамі, учыненым з асабістай зацікаўленасці. Абодва асуджаныя будуць адбываць пакаранне ў калоніі ўзмоцненага рэжыму, іх маёмасць будзе канфіскаваная, яны пазбаўлены воінскіх званняў «палкоўнік».

**Кар. БЕЛТА.**

# ІНСІНУАЦЫІ «НАВІНАРА»

### Генадзь Нявыглас абверг чуткі аб змове БАТЭ і «Андэрлехта»

**Старшыня Беларускай федэрацыі футбола Генадзь Нявыглас абверг інфармацыю, якая ўчора з'явілася ў інтэрнэце наконт дагаворнага характару матчаў паміж чэмпіёнам Беларусі БАТЭ і бельгійскім «Андэрлехтам» у другім кваліфікацыйным раўндзе Лігі чэмпіёнаў.**

Балгарская газета «Навінар» быццам бы валодае інфармацыяй наконт разбіральніцтва, якое пачала УЕФА па выніках першага паядынку паміж названымі клубамі, а на матч у адказ, які пройдзе сёння ў Барысаве, павінен прыбыць спецыяліст УЕФА і ацаніць сумленнасць гульні. Разбіральніцтва і доказы наконт дагаворнага матчу пагражаюць дыскваліфікацыяй беларускаму і бельгійскаму клубам, што дазволіць балгарскаму «Леўскі» выйсці ў групавы раўнд Лігі чэмпіёнаў без барацьбы — так мяркуюць журналісты балгарскай «Навінар». Як заявіў учора на прэс-канферэнцыі Генадзь Нявыглас, прадстаўнікі УЕФА ўжо прыбылі ў Беларусь, і сярод іх няма ніякага спецыяльнага прадстаўніка па Fair Play. «Да інсінуацый у балгарскай прэсе мы прызвычаіліся. У іх пасля кожнага міжнароднага матчу, які закранае інтарэсы таго ці іншага балгарскага клуба, у газетах з'яўляецца скандал. Запрашаю ўсіх прыхільнікаў футбола на матч падтрымаць нашу каманду, якая, упэўнены, абвергне падчас гульні гэтыя чуткі», — сказаў старшыня федэрацыі футбола.

Запрасіў Генадзь Нявыглас балельшчыкаў і на таварыскі матч нацыянальнай зборнай, які яна правядзе 20 жніўня супраць каманды Аргенціны. Гэта самы тытулаваны сапернік, які быў у нацыянальнай каманды ў суверэннай гісторыі Беларусі (да чэмпіянату Еўропы Аргенціна займала першае месца ў рэйтынгу ФІФА). Рэкордная для нас колькасць тэлекампаній купіла правы на трансляцыю гэтага паядынку — больш за сто краін свету пакажуць матч па сваіх каналах. Як падкрэсліў галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па футболе Бернд Штанге, каманда Аргенціны паведаміла, што прыбудзе ў Мінск у наймацнейшым складзе — усе першыя нумары зборнай выйдуць на поле стадыёна «Дынама».

Самую моцную за час працы з ёй дружыну спадзяецца выставіць на паядынак і Бернд Штанге. Акрамя траўмаваных Цімафея Калачова і Аляксея Скварнюка, у зборную запрошаны 24 лепшыя на гэты момант футбалісты краіны. Гэта Юрый Жаўноў, Антон Амельчанка, Васіль Хамутоўскі, Сяргей Верамко, Уладзімір Карыцька, Андрэй Чухлей, Ягор Філіпенка, Дзмітрый Верхаўцоў, Дзмітрый Лянцэвіч, Мікалай Кашэўскі, Сяргей Амельянчук, Максім Бардачоў, Аляксандр Паўлаў, Антон Пуціла, Павел Сітко, Ігар Стасевіч, Аляксандр Глеб, Алег Страхановіч, Віталь Булыга, Вячаслаў Глеб, Віталь Кутузаў, Віталь Радзівонаў, Сяргей Карніленка. Звяртае ўвагу адсутнасць у спісе Максіма Рамашчанкі, якую растлумачыў Бернд Штанге. «Рамашчанка — адзін з лепшых нашых футбалістаў, але апошнім часам ўзровень яго гульні стаў падаць. Да таго ж Максім быў заменены ў гульні супраць Германіі, пасля гэтага ён проста пакінуў каманду. І як я ні імкнуўся яго запэўніць застацца і дапамагчы нашай маладой камандзе ў гульні з Фінляндыяй — усё ж такі ён другі капітан, — ён сабраў чамаданы і з'ехаў. І да гэтага дня я не атрымаў ад яго ні тэлефанавання, ні прабачэнняў, хаця я першы, хто працягнуў бы яму руку...»

Тым не менш, як паведаміў Генадзь Нявыглас, Максім Рамашчанка застаецца кандыдатам у нацыянальную зборную, як і шэраг іншых ігракоў, а вось усіх футбалістаў, якія правялі за каманду больш за 25 матчаў і завяршылі за яе свае выступленні, 20 жніўня, перад матчам Беларусь — Аргенціна, чакаюць урачыстыя провады з вялікага спорту. Гэта Сяргей Гурэнка, Сяргей Штанюк, Валянцін Бялькевіч, Андрэй Астроўскі, Аляксандр Хацкевіч, Андрэй Лаўрык, Эрык Яхімовіч, Генадзь Туміловіч, Аляксандр Лухвіч, Сяргей Ясковіч, Пётр Качура, Уладзімір Макоўскі, Радзіслаў Арлоўскі, Васіль Баранаў. Футбалісты атрымаюць падарункі ад федэрацыі і памятныя значкі. На прызы могуць разлічваць і балельшчыкі, якія набудуць білеты на матч — сярод іх падчас акцыі «Дадому з футбола — на аўтамабілі» будзе разыграна пяць веласіпедаў, матацыкл «Мінск» і аўтамабіль «Кіа Рыо». Спяшайцеся, білетаў на матч з кожным днём застаецца ўсё менш.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

### Спорт-тайм

**БАТЭ — НАЙЛЕПШЫ КЛУБ ПЛАНЕТЫ Ў ЛІПЕНІ**

Барысаўскі футбольны клуб БАТЭ стаў найлепшай камандай планеты па выніках чэрвеня паводле версіі Міжнароднай федэрацыі футбольнай гісторыі і статыстыкі (IFFHS). Згодна з дадзенымі IFFHS, БАТЭ ў мінулым месяцы набраў больш за ўсіх ачкоў у сусветным клубным рэйтынгу, выйграўшы апошнія дзесяць матчаў у нацыянальным чэмпіянаце і тры сустрэчы ў Лізе чэмпіёнаў, што дазволіла беларускаму клубу перамясціцца ў рэйтынгу са 173-га радка на 93-ці. У топ-350 іншыя беларускія клубы не трапілі. А ўзначальвае рэйтынг англійскі «Манчэстар Юнайтэд».

**БЕЛАРУСКІ АЛЬПІНІСТ ЗАГІНУЎ У ГАРАХ КАБАРДЗІНА-БАЛКАРЫІ**

У гарах Кабардзіна-Балкарыі загінуў альпініст з Беларусі, паведамляюць інфармагенцтвы. 3 жніўня выратавальнікі атрымалі сігнал аб тым, што адзін з удзельнікаў групы атрымаў пералом галёнкі. Падчас транспарціроўкі пацярпелага яшчэ адзін альпініст атрымаў чэрапна-мазгавую траўму і пералом сцягна, трапіўшы пад каменяпад. Каля 5.00 4 жніўня выратавальнікі сустрэліся з пацярпелымі і пачалі іх транспарціроўку на ляднік Улуаузна, дзе маюцца пляцоўкі для пасадкі верталёта. Адзін з пацярпелых ад атрыманых траўмаў памёр. Для эвакуацыі пацярпелых з населенага пункта Тэрскол вылецеў верталёт Мі-8 МНС Расіі, але з-за дрэннага надвор'я не змог правесці пасадку і вярнуўся ў аэрапорт Нальчыка. Транспарціроўка пацярпелых праводзілася выратавальнікамі.

### Абзац

■ Пры кожным раённым аддзеле ДАІ арганізаваны прыём іспытаў на атрыманне права кіравання транспартнымі сродкамі катэгорыі А (матацыклы) для вадзіцеляў, якія падрыхтаваліся самастойна. Прыём іспытаў экстэрнам ажыццяўляецца па папярэднім запісе.

■ **Звання «Наймацнейшы школьнік Вялікабрытаніі» быў удастоены 17-гадовы Кай Томас, які свабодна прыўздымае легкавыя аўтамабілі. Томас трэніруецца, паднімаючы аўтамабілі Peugeot 106 вагой 1,2 т і Nissan Micra вагой 1,4 т, што амаль у 15 разоў больш за яго ўласную вагу, якая складае каля 95 кг. Аб'ём біцэпсаў Кая Томаса — каля 30 см. На спаборніцтвах за званне наймацнейшага школьніка Кай перамог, сем разоў падняўшы «бервяно» вагой 76 кг, падняўшы і перакінуўшы кола ад грузавіка вагой 317 кг і перанёсшы трубы вагой каля 100 кг.**

■ Аўтапаязды з перавышэннем дапушчальнай нормы радыяцыі выведзеныя з агульнага патоку брэсцкімі памежнікамі ў пункце пропуску «Казловічы». Адзін следаваў са Швейцарыі ў Беларусь і меў перавышэнне радыеактыўнага выпраменьвання больш чым у 3 разы. Выпраменьванне ад другога, які рухаўся з Германіі ў Расію, перавышала дапушчальнае ў 1,5 раза.

■ **Брытанскія бацькі будуць афіцыйна інфармаваныя аб тым, што іх дзеці пакутуюць на атлусценне. Бацькі пачнуць атрымліваць лісты аб небяспечным стане дзіцяці. Такія меры Міністэрства аховы здароўя Вялікабрытаніі прадпрымае для барацьбы з атлусценнем сярод падлеткаў, якое дасягнула маштабаў эпідэміі.**

■ Дробнарознічны гандаль сувенірамі будзе спынены на Старым Арбаце ў Маскве да канца тыдня. Паводле меркавання сталічных чыноўнікаў, на Арбаце размешчана вялікая колькасць гандлёвых кропак, якія «парушаюць выгляд старога горада». Прынята рашэнне да 8 жніўня ўсе аб'екты, акрамя кніжнага гандлю, адтуль убраць.

### Поўны абзац

■ Гэтым летам парыжскія аэрапорты Шарля дэ Голля і «Арлі» прапаноўваюць усім ахвотным бясплатныя ўрокі танцаў. Пасажыры, якія вылятаюць на Кубу, могуць навучыцца сальсэ, а ў Нью-Ёрк — хіп-хопу. Пасажырам іншых рэйсаў прапаноўваюць вывучыць асновы ўсходніх танцаў, мамбы або танга. У Aeroports de Paris лічаць, што 15-хвілінныя ўрокі танцаў дапамагаюць парыжанам увайсці ў рытм адпачынку. Ахвотныя парухацца ў чаканні вылету атрымліваюць навушнікі, з дапамогай якіх слухаюць выбраную музыку, а таксама інструкцыі выкладчыкаў.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

### Ва Ўрадзе

## Паступленні ў бюджэт ад продажу дзяржуласнасці на аўкцыёнах у першым паўгоддзі склалі Br18 млрд

**Аб гэтым паведаміў старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Георгій Кузняцоў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага, на якім разглядаліся пытанні ўключэння дзяржмаёмасці, якая не выкарыстоўваецца, у гаспадарчы абарот.**

Георгій Кузняцоў адзначыў, што па выніках шасці месяцаў 2008 года ў Беларусі ўключана ў гаспадарчы абарот 2808 аб'ектаў, у тым ліку 662 аб'екты рэспубліканскай уласнасці (26,3 працэнта ад плана на год) і 2146 — камунальнай (34,7 працэнта).

У студзені—чэрвені арганізавана 198 аўкцыёнаў, на якіх выстаўлена 1330 аб'ектаў. На 93 рэзультатыўных аўкцыёнах прададзена 350 аб'ектаў, у тым ліку 128 — з пачатковай цаной продажу, роўнай адной базавай велічыні. «Ад продажу гэтых 350 аб'ектаў у бюджэт паступіла Br18 млрд», — сказаў Георгій Кузняцоў.

Дзяржаўны камітэт па маёмасці Беларусі прапануе павялічыць падатак на нерухомую маёмасць у два разы ў выпадках неэфектыўнага выкарыстання дзяржаўнай маёмасці.

Падрыхтаваны праект указа «Аб некаторых пытаннях падаткаабкладання маёмасці, якая не выкарыстоўваецца ў гаспадарчай дзейнасці». «Праект прадугледжвае павышэнне падатку на нерухомую маёмасць у два разы ў выпадку неэфектыўнага выкарыстання аб'ектаў. Падатак на зямлю, занятую гэтымі аб'ектамі, таксама прапануецца павялічыць у два разы», — сказаў Георгій Кузняцоў.

Паводле яго слоў, праект указа пакуль што не падтрыманы Мінпрамам, Мінбудархітэктуры, Мінсельгасхарчам і некаторымі іншымі ведамствамі. У прыватнасці, Мінпрамам і Мінбудархітэктуры прадстаўлены фінансавыя разлікі па канкрэтных прадпрыемствах, якія ў выпадку выплаты павышаных падатковых плацяжоў могуць з прыбытковыхператварыцца ў стратныя.

Георгій Кузняцоў прызнаў, што ў праекце прапануюцца «непапулярныя і вельмі жорсткія меры», аднак сітуацыя ў рэспубліцы са значным аб'ёмам маёмасці, якая не выкарыстоўваецца, вельмі сур'ёзная, і неабходна актывізаваць дзеянні для яе вырашэння.

Рэспубліканскімі органамі кіравання Беларусі ў студзені—ліпені 2008 года падрыхтаваны праекты рашэнняў аб продажы 465 аб'ектаў рэспубліканскай уласнасці, якія не выкарыстоўваюцца.

У Беларусі праведзена ацэнка эфектыўнасці выкарыстання маёмасці, перададзенай у статутныя фонды ААТ з доляй дзяржавы. Высветлілася, што не выкарыстоўваецца 930 аб'ектаў нерухомай маёмасці. У сувязі з гэтым распрацаваны меры па іх уключэнні ў абарот.

У 2008 годзе запланаваны продаж 750 такіх аб'ектаў рэспубліканскай уласнасці. Паводле слоў Георгія Кузняцова, пакуль што тэмпы продажу дзяржмаёмасці, якая не выкарыстоўваецца, адстаюць ад намечаных.

**БЕЛТА.**

***Уважаемые акционеры ОАО «Мостоотряд № 88»***

***21 августа 2008 года состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Мостоотряд № 88»***

*Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, д. 16, третий этаж, актовый зал.*

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

*1. О внесении дополнений в Устав ОАО «Мостоотряд № 88».*

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по указанному выше адресу в рабочие дни с 12 по 20 августа 2008 г. с 13 до 17 часов у председателя Наблюдательного совета, а в день собрания — в помещении, где оно будет проводиться — в актовом зале в здании управления на третьем этаже.

**Регистрация участников собрания с 14.55 до 15.25 по месту проведения собрания.**

**Начало работы собрания 21 августа 2008 года в 15.30.**

*Список акционеров для участия в собрании составлен по состоянию на 12 августа 2008 года.*

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.**

УНН 100299744

## Поўная экіпіроўка першакласніка — ад Br275 тыс. да Br635 тыс.

**У Мінску поўная экіпіроўка першакласніка абыдзецца бацькам у суму ад Br275 тыс. да Br635 тыс. Аб гэтым паведамілі ў Галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

Паводле інфармацыі спецыялістаў, крыху даражэй будзе каштаваць бацькам сабраць дзяцей — вучняў малодшых класаў — ад Br347 тыс. да Br725 тыс. А на падрыхтоўку старшакласнікаў да школы неабходна будзе затраціць ад Br388 тыс. да Br858 тыс.

Ва ўпраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама адзначылі, што да 10 верасня вопратку, абутак, вучнёўскую галантарэю, канцылярскія і папярова-чыставыя тавары можна набыць на расшыраным продажы ў 40 магазінах горада.

Пакупнікам прапанавана на выбар больш як 200 мадэляў адзення для дзяўчатак — камплекты і сарафаны (звыш 80 відаў па цане ад Br22 тыс. да Br190 тыс.); блузкі (больш як 50 мадэляў ад Br21 тыс. да Br60 тыс.); штаны і спадніцы (60 мадэляў па цане ад Br19 тыс. да Br60 тыс.), пінжакі і камізэлькі (15 мадэляў ад Br40 тыс. да Br70 тыс.). Шырока прадстаўлены вырабы для хлопчыкаў. Гэта больш як 70 мадэляў касцюмаў і камплектаў (па цане ад Br47 тыс. да Br200 тыс.), да 40 мадэляў штаноў (ад Br18 тыс. да Br60 тыс.), да 60 мадэляў кашуль (ад Br10 тыс. да Br36 тыс.).

«Прадстаўлены асартымент адзення для хлопчыкаў і дзяўчатак, а гэта ў сярэднім па 15 мадэляў у кожным памеры, дазваляе зрабіць выбар зыходзячы з матэрыяльных магчымасцяў бацькоў», — падкрэслілі ва ўпраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.

**Аксана ШЫКУЦЬ, БЕЛТА.**

# ЛЮБІШ ВУЧЫЦЦА — ЛЮБІ І ГРОШЫ ПЛАЦІЦЬ. ДА Br5,7 МЛН.

**Сярэдні кошт за навучанне на першым курсе ў залежнасці ад спецыяльнасці і самой ВНУ ў гэтым годзе складае для студэнта-платніка ад 1 да 5 мільёнаў беларускіх рублёў. Пры гэтым, больш за ўсё — 5 700 000 беларускіх рублёў — давядзецца заплаціць за навучанне будучым стаматолагам, якія падалі дакументы ў Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Залічэнне на ўсе формы атрымання адукацыі на ўмовах аплаты завяршылася 4 жніўня. Прыёмныя камісіі навучальных устаноў падводзяць вынікі чарговага этапа ўступнай кампаніі.

— Белдзяржуніверсітэт поўнасцю выканаў план прыёму студэнтаў-платнікаў, — сказаў **намеснік адказнага сакратара прыёмнай камісіі БДУ Вячаслаў МАЛАФЕЕЎ.** — На дзённае платнае аддзяленне залічана 2419 абітурыентаў, на завочнае платнае — 972 чалавекі. Акрамя таго, 231 абітурыент будзе атрымліваць другую вышэйшую адукацыю, 28 чалавек — паралельную адукацыю. Усяго ў гэтым годзе вядучая ВНУ краіны папоўніла свае шэрагі на 6100 чалавек: з іх 2293 студэнты бюджэтнай формы навучання (37,5 працэнта), астатнія — 3807 (62,5 працэнта) будуць аплачваць навучанне з бацькоўскай кішэні. Самыя высокія конкурсы сярод абітурыентаў, якія падавалі дакументы на платную форму навучання, зафіксаваны на спецыяльнасцях «Тэалогія» — 2,8 чалавека на месца, «Менеджмент (Сацыяльны менеджмент)» гуманітарнага факультэта — 1,9, на біялагічны факультэт і факультэт міжнародных адносінаў — 2 чалавекі на месца. Трэба адзначыць, што на прыродазнаўчанавуковыя факультэты (акрамя біялагічнага) план прыёму студэнтаў-платнікаў не быў выкананы, таму незапатрабаваныя абітурыентамі месцы былі перададзеныя на іншыя факультэты і спецыяльнасці, дзе склаўся адносна вялікі конкурс.

Вялікая колькасць студэнтаў падавала дакументы адразу ж свядома на платную форму навучання. Гэта ў першую чаргу звязана з тым, што інфармацыя аб размеркаванні балаў абнаўлялася на сайце ўніверсітэта праз кожныя 10—15 хвілін. Таму патэнцыяльны студэнт меў магчымасць прагназаваць свае шанцы на паступленне на той ці іншы факультэт. Напрыклад, на спецыяльнасць «Прыкладная матэматыка і інфарматыка» (факультэт прыкладной матэматыкі) амаль з першых дзён работы прыёмнай камісіі сфарміраваўся высокі конкурс (прахадны бал быў большы за 300). Вось і атрымлівалася, што той абітурыент, які не дацягваў да пастаўленай планкі, але хацеў вучыцца толькі на выбранай спецыяльнасці, адразу ж пісаў заяву на платную форму навучання.

Лічбы лічбамі — іх, як ні круці, ужо не памяняеш. А вось кошт аплаты за пяць гадоў навучання, паверце, некаторыя студэнты ўмудраюцца не толькі знізіць, але і поўнасцю перавесціся на бюджэтную форму навучання... Аб тым (і не толькі), якім чынам можна палегчыць місію бацькоў, якія штогод вымушаны аддаваць на навучанне свайго дзіцяці немалую частку прыбыткаў, расказала **адказны сакратар прыёмнай камісіі БДУ Людміла ХУХЛЫНДЗІНА.**

***— Якім чынам усталёўваецца памер платы за навучанне?***

— У кожнай навучальнай установе фарміруецца свой кошт за навучанне. Плата за вучобу ў БДУ прыведзена ў адпаведнасць з рэальнымі выдаткамі на яе, а памер аплаты зацверджаны Міністэрствам адукацыі. Разам з тым, дзяржава істотна падтрымлівае студэнтаў-платнікаў — яны далёка не поўнасцю аплачваюць сваю адукацыю (студэнт-платнік пакрывае толькі 51 працэнт усіх затрачаных дзяржавай сродкаў на сваё навучанне). Рэальны ж яго кошт адпавядае той суме, якую плацяць за навучанне ў БДУ замежныя студэнты. Беларускія ж студэнты-платнікі толькі пакрываюць выдаткі на заработную плату выкладчыкам, накладныя выдаткі і невялікі працэнт рэнтабельнасці. Максімальны кошт, усталяваны ў гэтым годзе БДУ, складае 4,2 млн беларускіх рублёў на спецыяльнасць «Бізнэс-адміністрыраванне» (Інстытут бізнэсу і менеджменту тэхналогій).

***— У якім выпадку кошт за навучанне можа павышацца на працягу навучальнага года?***

— Кожны студэнт, які мае жаданне прадоўжыць навучанне ў БДУ на платнай форме, заключае дадатковае пагадненне да дагавору. У адпаведнасці з ім, у тым выпадку, калі памяняецца тарыфная стаўка першага разраду для работнікаў бюджэтнай сферы, у кошт навучання могуць на працягу тэрміну навучання ўносіцца карэктывы.

***— А студэнт-платнік, які добра вучыўся, можа знізіць аплату за навучанне ці быць пераведзены на бюджэт. Што для гэтага патрэбна?***

— Студэнты-платнікі, пачынаючы з другога курса, могуць атрымаць скідку ад 20 да 60 працэнтаў. Для гэтага патрэбна дасягнуць «высокіх паказчыкаў у вучэбна-пазнавальнай, навукова-даследчай дзейнасці і грамадскай рабоце». Каб адпавядаць гэтым патрабаванням, студэнт павінен мець па выніках вучэбнага года палову «дзесятак» і «дзевятак», астатнія ж адзнакі павінны быць не меншымі за 6 балаў. Студэнты-выдатнікі, 75 працэнтаў усіх адзнак якіх складаюць «10» і «9», а астатнія — не ніжэйшыя за 7 балаў, могуць быць пераведзены на бюджэтнае аддзяленне пры наяўнасці вольных месцаў.

***— Як ні круці, але ў свядомасці студэнтаў платнай формы навучання існуюць два стэрэатыпы: «да студэнтаў—платнікаў прадузята ставяцца выкладчыкі» і «студэнтаў-платнікаў не адлічваюць з універсітэта».***

— Гэта памылковыя думкі. Пры навучанні студэнтаў у нас няма дзялення на групы «платнікаў» і «бюджэтнікаў». Вучацца ўсе разам, па адных і тых жа праграмах, да ўсіх маецца аднолькавы падыход, прад'яўляюцца аднолькавыя патрабаванні як у вучэбным працэсе, так і пры стварэнні ўмоў побыту. І дыпломы яны таксама атрымліваюць аднолькавыя. Акрамя таго, выкладчык не заўсёды ведае, на якой форме вучыцца студэнт — ні ў залікоўках, ні ў студэнцкіх білетах, ні ў ведамасцях гэта інфармацыя не значыцца. Што ж тычыцца другога міфа, то на платныя месцы праходзяць тыя абітурыенты, якія набралі меншую колькасць балаў, чым студэнты-бюджэтнікі. Але, з другога боку, іспыт — гэта ў нейкай ступені латарэя (як паказвае практыка, часта студэнт, які навучаецца за кошт бацькоў, дэманструе больш высокі ўзровень ведаў, чым яго калегі-бюджэтнікі). Тым не менш студэнт студэнту розніца, і штогод за акадэмічную непасяховасць мы адлічваем ці пераводзім на завочную форму навучання немалую колькасць студэнтаў-платнікаў.

**Надзея ДРЫЛА.**

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

6 жніўня 2008 г.
№ 29 (132)


# У АДПАЧЫНАК — ПА «ПАШПАРЦЕ ЗДАРОЎЯ»?

**Віцебскія дэпутаты ўпэўненыя, што паляпшэнне медыцынскага абслугоўвання патрабуе комплекснага падыходу.**

У Віцебску плануюць пабудаваць аквапарк і дзіцячы парк. У новых мікрараёнах адкрыюць урачэбныя амбулаторыі, а для мікрараёнаў, вядомых пад назвай «Поўдзень», якія назваць новымі ўжо даўно нельга, пабудуюць сучасную паліклініку. Апошнюю мясцовыя жыхары даўно чакаюць, бо «прыпісаны» да медыцынскіх устаноў, да якіх далёка дабірацца. Словам, шмат яшчэ трэба зрабіць для таго, каб зрабіць медыцыну даступнай для ўсіх.

Старшыня Віцебскага гарвыканкама Пётр Драздоў трымае пытанні пад асабістым кантролем. Гэта тэма знаходзілася ў цэнтры ўвагі апошняй сесіі гарадскога Савета дэпутатаў. Асабліва былі заклапочаны народныя выбраннікі цяжкай дэмаграфічнай сітуацыяй. Зараз у абласным цэнтры жывуць прыблізна 352 тысячы чалавек. Для параўнання: 15 гадоў таму — 375 тысяч. Паводле сумнага прагнозу, ужо праз год колькасць віцябчан паменшыцца да 345 тысяч.

Каб палепшыць медыцынскае абслугоўванне юных гараджан, рашэннем гарвыканкама выдзелена больш за 275 мільёнаў беларускіх рублёў на рэканструкцыю дзіцячай паліклінікі № 2, што на вуліцы Чкалава. За кошт упраўлення аховы здароўя аблвыканкама і адпаведнага міністэрства плануецца забяспечыць абсталяваннем клініку, дзе абслугоўваюцца каля 30 тысяч дзяцей і падлеткаў.

Не сакрэт, што часта людзі не ідуць да ўрачоў таму, што апошнія, мякка кажучы, раўнадушна адносяцца да сваёй работы. Чэргі ў паліклініках сталі нормай. Вось над тым, як выправіць гэтую праблему, трэба сур'ёзна падумаць і дэпутатам, і чыноўнікам. Дарэчы, за апошнія некалькі гадоў у абласным цэнтры адбылося шмат кадравых змен сярод кіраўнікоў ад медыцыны. Гэта пайшло на карысць — меней сталі скардзіцца хворыя на медыкаў.

Новы падыход да медыцынскага абслугоўвання ў паліклініках вельмі актуальны зараз, калі аб'яўлена пра неабходнасць агульнай дыспансерызацыі. Дарэчы, сярод неардынарных падыходаў у гэтым накірунку — прапанова не адпускаць у працоўны водпуск тых, хто не пакажа начальству «пашпарт здароўя». Хоць, безумоўна, можна паспрачацца, наколькі законным і дэмакратычным будзе такое «ноу-хау». Сярод іншых думак — магчымасць медыцынскага абслугоўвання работнікаў не па месцы жыхарства, а па месцы працы. Іншая размова, што не ўсе прадпрыемствы маюць паўнацэнныя клінікі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# АДНОВІЦЦА «ВЕРТЫКАЛЬНЫ ТРАНСПАРТ»

**У Мінску будзе распрацавана праграма замены старых ліфтаў у жыллёвым фондзе**

Такую задачу паставіў перад камунальнымі службамі старшыня Мінгарвыканкама Міхаіл Паўлаў. Сёлета ў жылфондзе сталіцы плануецца замяніць 243 ліфты. Аднак гэтага недастаткова. У Мінску неабходна штогод абнаўляць парк вертыкальнага транспарту на 700 адзінак.

На 1 лютага ў шматпавярховых дамах налічвалася 10 677 ліфтаў, 3308 з іх адпрацавалі нарматыўны тэрмін, гэта значыць звыш 25 гадоў.

**Святлана ФРАЛЯНКОВА,**
**«Мінск—Навіны».**

НА ДЗЯРЖАЎНЫМ КАНТРОЛІ

# З ЛЮДЗЬМІ — БЕЗ ФАРМАЛІЗМУ І АБЫЯКАВАСЦІ



**Такую задачу перад органамі ўлады паставіла калегія Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, якая днямі на выязным пасяджэнні ў Магілёве разгледзела работу са зваротамі грамадзян у Магілёўскай вобласці.**

Кіраўнік КДК Зянон Ломаць нагадаў прысутным, што 2008 год названы вырашальным у працы з насельніцтвам. У тым ліку і ў сувязі з парламенцкімі выбарамі, якія маюць адбыцца. Праца дзяржаўных органаў са зваротамі грамадзян наўпрост адбіваецца на іміджы ўлады, яе аўтарытэце.

Выязному пасяджэнню калегіі папярэднічала маштабная праверка работы выканаўчых і распарадчых органаў Магілёўшчыны па вырашэнні сацыяльна значных пытанняў насельніцтва, павелічэнні адказнасці службовых асобаў пры разглядзе зваротаў грамадзян.

Кіраўніцтва Камітэта дзяржкантролю вылучае Магілёўшчыну як рэгіён, які дынамічна развіваецца, дзе шмат робіцца для павелічэння ўзроўню жыцця людзей. Створана сістэма працы са зваротамі грамадзян. Сёлета за паўгода колькасць зваротаў, накіраваных у Магілёўскі аблвыканкам, скарацілася на 19 %.

Аднак і праблем хапае. Як адзначылі кантралёры, яшчэ не паўсюдна ўсвядомілі, што выкараненне бюракратызму і фармалізму — галоўная задача. З трыбуны калегіі прагучалі і красамоўныя прыклады. Жыхар адной з вёсак Цішоўскага сельсавета Магілёўскага раёна паўтара года таму, прачытаўшы аб'яву на краме, аплаціў сельскай гаспадарцы дастаўку гною на свой прысядзібны ўчастак. Угнаенне не прывезлі, але і грошы не вярнулі. З чалавекам расплаціліся толькі пасля ўмяшальніцтва КДК.

У Дрыбінскім раёне Першамайскі сельвыканкам паставіў на ўлік грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, толькі праз 11 месяцаў пасля падачы заяў. У аддзеле адукацыі Магілёўскага райвыканкама аналагічную працэдуру выканалі праз 5 месяцаў. А дадзены законам тэрмін — 1 месяц.

Паводле прэс-рэліза калегіі, амаль год не магла атрымаць пенсію жыхарка горада Клімавічы. Яна нават мела на руках рашэнне суда, але пенсію ёй упарта не прызначалі. За валакіту і халатнасць у гэтым выпадку 6 службовых асобаў прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці, у тым ліку 2 — вызвалены ад пасадаў.

У пасёлку Туголіца Бабруйскага раёна адбыўся прарыў водаправода ў доме. Будынак аказаўся «нічыйным» — нідзе не стаіць на балансе. Таму давялося жыхарам дома цягаць пітную ваду з калодзежаў, а для гаспадарчых патрэбаў збіраць дажджавую ваду і тапіць снег. І гэта ў наш час!

Ёсць і амаль што кур'ёзныя выпадкі. У Чавусах УКП «Жылкамгас» лічыла, што выканала просьбу жыхароў пад'езда № 2 дома № 11 на вуліцы Гагарына. Аднак пры праверцы было выяўлена, што рамонт зрабілі не ў тым пад'ездзе, адкуль паступіў калектыўны зварот, а ў... суседнім. Кіраўніцтва «Жылкамгаса» растлумачыла, што тут здарылася памылка, і прыступіла да рамонту ў «правільным» пад'ездзе.

Ёсць і іншыя бакі ў працы са зваротамі грамадзян. Паводле сацыялагічнага даследавання, больш за 65 працэнтаў заяўнікоў не лічаць за належнае ўздымаць свае праблемы па месцы жыхарства. Людзі хочуць звяртацца да высокага начальства, і многія — адразу ў Адміністрацыю Прэзідэнта. Хаця менавіта на месцы шэраг пытанняў можна вырашыць прасцей і хутчэй.

Даступнасць і адкрытасць створанай сістэмы працы са зваротамі грамадзян прыцягвае і «хранічных» скаржнікаў, якія незадаволеныя ўсімі і ўсім. Часам для вырашэння некаторых праблем прыцягваюцца сілы, неадпаведныя маштабу пытання. Напрыклад, у Бабруйску дзве жанчыны канфліктуюць з-за сабакі. За няпоўны год гаспадыня сабакі і яе апанентка паднялі на ногі сваімі скаргамі з дзесятак розных інстанцый і арганізацый. Была нават створана камісія па назіранні за сабакам! Але спрэчка так дасюль і не вырашана.

Усе недахопы, знойдзеныя ў працы з насельніцтвам падчас праверак супрацоўнікаў КДК, выкаранены. Пра гэта адрапартавалі прадстаўнікі райвыканкамаў і старшыні сельскіх Саветаў.

Дарэчы, упершыню на калегію КДК запрасілі старшынь сельскіх Саветаў рэгіёна ў поўным складзе.

— Вы на пярэднім краі, і фармалізму ў вашай працы быць не павінна, — звярнуўся да прадстаўнікоў мясцовых органаў улады старшыня Камітэта дзяржкантролю Зянон Ломаць. — Вы ўсё абавязаны бачыць і ведаць. Трэба аб'ектыўна ацэньваць звароты і скаргі людзей і прымаць рашэнні. Можна выканаць просьбу сёння — зрабіце гэта, калі няма магчымасці — папрасіце пачакаць, калі выканаць увогуле немагчыма — дакладна растлумачце прычыны. Там, дзе людзі нармальна і рэгулярна кантактуюць з уладай, праблемных пытанняў не ўзнікае. Трэба думаць пра людзей і служыць народу.

**Ілона ІВАНОВА.**

ТОЛЬКІ ФАКТЫ

# ЧАЛАВЕЧЫ ФАКТАР... СУПРАЦЬ ПАЖАРНАЙ БЯСПЕКІ

**Паведамленне аб пажары на тэрыторыі Жыровіцкага Свята-Успенскага манастыра, які здарыўся, хутчэй за ўсё, з-за кароткага замыкання электраправодкі, паступіла ў Слонімскі раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях у 4 гадзіны 55 хвілін. Распаўсюджанне агню пачалося з даху складскога памяшкання, дзе захоўваліся мяшкі з крупамі і мукой. Аварыйна-выратавальнае падраздзяленне выканала сваю работу бездакорна: для лакалізацыі пажару (працавалі чатыры аўтацыстэрны) спатрэбілася крыху больш за дваццаць хвілін. Будынак удалося захаваць, але ён, зразумела, патрабуе рамонту.**

Жыхары Жыровічаў, якія сабраліся ў мясцовым Доме культуры, аб гэтым нядаўнім здарэнні, безумоўна, ведалі. Але дзякуючы арганізаванай Гродзенскім абласным упраўленнем МНС акцыі «Талакой за бяспеку» ў іх з'явілася магчымасць даведацца і аб сітуацыі з пажарамі ў рэспубліцы, вобласці, раёне. Прычым, як кажуць, з першых вуснаў, ад спецыялістаў МНС. І гэта была не проста «голая статыстыка», а факты, якія прымушалі суперажываць, думаць і, галоўнае, вучыцца на чужых памылках. Для таго, каб не пусціць бяду ў свой дом, выратаваць сябе і сваіх блізкіх. Асабліва востра адчуваеш гэта пасля прагляду фільма аб вогненных трагедыях, якія здарыліся на Гродзеншчыне. Гродна, Карэліцкі, Астравецкі, Мастоўскі, Ваўкавыскі, Воранаўскі раёны... Абгарэлыя целы, знішчаныя агнём пабудовы, ледзь жывыя ад гора сваякі... Убачыць, як маці галасіць над трунамі трох сваіх дзяцей, і пасля гэтага ігнараваць элементарныя правілы проціпажарнай бяспекі?!

**Ільвіная колькасць трагедый здарылася па банальнай прычыне неасцярожнага курэння ў п'яным стане, што паўтараецца з году ў год.**

З пачатку года падраздзяленнямі Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС у жылым сектары ліквідавана каля 700 пажараў, выратаваны дзесяткі жыццяў, аднак 76 чалавек, у тым ліку трое дзяцей, загінулі. Прычым ільвіная колькасць трагедый здарылася па банальнай прычыне неасцярожнага курэння ў п'яным стане, што паўтараецца з году ў год. Здавалася б, прафілактыкі хапае. Адных лістовак, памятак і папераджальных надпісаў, накіраваных на прадухіленне пажараў па прычыне курэння ў стане алкагольнага ап'янення, сёлета Гродзенскім абласным упраўленнем МНС выпушчана ажно 155 відаў агульным тыражом каля паўмільёна экзэмпляраў. Але... Вось толькі адзін прыклад. Трое мужчын у інтэрнаце ў Ашмянах адпачывалі за чаркай, а затым непатушаная цыгарэта нарабіла непапраўнай бяды. Аднаму з загінулых было 50, другому — 35, трэцяму — 30 гадоў.

А ў вёсцы Плаўскія Слонімскага раёна агонь паставіў кропку адразу на чатырох жыццях. І зноў жа ўсе ахвяры (гаспадар дома, яго жонка, сын гаспадыні і яго сужыцелька) — працаздольнага ўзросту. Апошнюю ў мінулым годзе пазбавілі бацькоўскіх правоў, апеку над яе трыма дзецьмі ўзяла дзяржава, і таму малых не было ў хаце ў той ракавы момант. Дарослыя паставілі на ўключаную газавую канфорку каструлю з ежай і забылі пра гэта...

Дарэчы, летась на Гродзеншчыне двое дзяцей загінулі з-за злачыннай звычкі дарослых курыць у ложку пасля выпіўкі. У Мастоўскім раёне першакласнік з сябрам схаваліся з запалкамі ў адрыну і падпалілі сена. Сябар паспеў выскачыць на вуліцу, а другому хлопчыку выхад быў адрэзаны агнём і ён загінуў. А ў Іўеўскім раёне бацькі пайшлі капаць бульбу, пакінуўшы ў хаце двухгадовага сына. Малы знайшоў запалкі і так надыхаўся дымам, што, калі бацькі вярнуліся, выратаваць яго было ўжо немагчыма. Па гэтай жа прычыне загінулі двое дзяцей у вёсцы Сурканты Воранаўскага раёна.

— Мы выкарыстоўваем усе магчымыя метады прафілактыкі, аднак толькі аб'яднаўшы намаганні ўсіх зацікаўленых мясцовых органаў і, вядома, самога насельніцтва, можна дабіцца перамен да лепшага, — адзначае начальнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Анатоль Бабій. — Менавіта ў гэтым і сэнс акцыі «Талакой за бяспеку», якая сёлета стартавала ў вобласці і пройдзе ва ўсіх раёнах. Мяркую, што наш вопыт выкарыстаюць і ў іншых рэгіёнах рэспублікі.

І сапраўды, калі нашы продкі талакой будавалі дом, збіралі ўраджай, то чаму б сёння не аб'яднацца дзеля таго, каб спыніць «чырвонага пеўня», зберагчы жыцці, дамы, маёмасць?

Пачатак акцыі быў пакладзены ў вёсцы Турэц Карэліцкага раёна. З жыхарамі гэтай і іншых навакольных населеных пунктаў сустрэліся супрацоўнікі МНС, прадстаўнікі мясцовай улады, кіраўнікі сельгаспрадпрыемства. Вяскоўцы не толькі атрымалі парады па пажарнай бяспецы, але і маглі набыць аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі, застрахаваць жыллё. Тады ж нарадзілася і традыцыя ўдзелу ў акцыях «Талакой за бяспеку» эстраднадухавога аркестра Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС. Кажуць, што нават некаторыя аматары моцных напояў у гэты дзень аддаюць перавагу менавіта канцэрту, а разам з ім, хочацца верыць, і тым проціпажарным пытанням, што абмяркоўваюцца. І тое добра.

Слонімшчына стала ўжо сёмым адрасатам абласной акцыі. Паводле слоў намесніка старшыні Слонімскага райвыканкама Вячаслава Апановіча, у раёне многае робіцца ў накірунку прадухілення пажараў. Праводзіцца абследаванне домаўладанняў, у першую чаргу тых, дзе пражываюць адзінокія пенсіянеры, мнагадзетныя сем'і і людзі з так званай групы рызыкі. У дамах малазабяспечаных грамадзян мяняецца альбо прыводзіцца ў парадак электраправодка, рамантуюцца печы, чым у раёне спецыяльна займаюцца два печнікі. Ужо выканана гадавое заданне па забеспячэнні гэтай катэгорыі насельніцтва аўтаномнымі пажарнымі апавяшчальнікамі. Але так званы чалавечы фактар яшчэ ніхто не адмяняў, і таму арганізаваная Гродзенскім абласным упраўленнем МНС акцыя, на думку Вячаслава Апановіча, вельмі патрэбная.

У Жыровіцкім сельскім Савеце, паводле інфармацыі яго кіраўніка Васіля Бекрэня, пытанне проціпажарнай бяспекі пастаянна разглядаецца на пасяджэннях сесій, выканкама. На кожнае домаўладанне згодна з актам яго абследавання заводзіцца картка, дзе пазначаюцца выяўленыя праблемы, якія затым ставяцца на кантроль і вырашаюцца адпаведнымі службамі. У дамах практычна ўсіх ветэранаў вайны, мнагадзетных сем'яў, адзінокіх людзей устаноўлены аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі. А вось за ўласныя сродкі яны набываюцца, на жаль, не вельмі ахвотна. Хаця ёсць ужо шмат прыкладаў, калі гэтыя не надта ўжо і дарагія прыборы папярэджвалі людзей аб бядзе і тым самым выратоўвалі ім жыццё і маёмасць.

Мажліва, пасля акцыі «Талакой за бяспеку» такога разумення будзе больш. Было б толькі жаданне зрабіць для сябе адпаведныя высновы, паколькі наша бяспека ў нашых жа руках.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*Слонімскі раён.*

# «АШЧАДКНІЖКА» НА БЕРАЗЕ ВОЗЕРА

**Школа, армія, работа вадзіцелем у аўтапарку, служба ў міліцыі і выхад на пенсію. Здавалася б, далей можна было спакойна адпачываць. Аднак Аляксандр Шакель вырашыў, што адпачываць павінны іншыя, і стаў думаць аб стварэнні... уласнай аграсядзібы. Прычым сёння ён не хавае, што грошай на новы занятак практычна не было. Былі толькі жаданне і адчуванне — калі-небудзь гэта абавязкова спатрэбіцца.**



## Галоўны аргумент — выгоды

Усё пачыналася чатыры гады таму, калі Аляксандр Шакель узяў пад будаўніцтва ўчастак за 8 кіламетраў ад райцэнтра. Участак быў пустым. А што да «грашовага пытання», то выйсце аказалася даволі нечаканым — продаж... уласнай дачы.

— Наважыцца аказалася няпроста, у рэшце рэшт, на дачы раслі тая ж бульба, ягады, таму многія шчыра здзіўляліся, казалі: «Што ты робіш?» — узгадвае гаспадар. — Але разам з тым існаваў і іншы аргумент. Браслаўшчына здаўна ўспрымалася як месца для адпачынку, сюды заўсёды ехалі людзі. А для турыстаў новае месца на беразе возера было лепшым.

Разлічваць на тое, што тут з'явіцца «ўсё і адразу» не выпадала, участак абжываўся паступова. Амаль два гады спатрэбілася для будаўніцтва дома, год — на лазню. Паралельна капалася студня, рабіліся водаправод і каналізацыя, пракладвалася дарога. Зразумела, што «першапачатковага капіталу» зноў-такі не хапіла, таму Аляксандр Шакель узяў два камерцыйныя крэдыты на спажывецкія патрэбы. Па-іншаму было нельга. Магчыма, тут нікому не патрэбны еўрарамонт, але нават самы адданы аматар экстрэмальных падарожжаў ніколі не адмовіцца ні ад гарачай вады, ні ад прыбіральні, ні ад новых шпалераў.

— Увогуле, перш-наперш трэба зразумець галоўнае: хочаш, каб паехалі людзі, — зрабі так, каб было прыемна асабіста табе, — працягвае Аляксандр Шакель. — Вядома, дзеля гэтага даводзілася ўвесь час шукаць грошы, у нечым рызыкаваць. Праўда, не скажу, што гэта рызыка была авантурнай. Я заўсёды разумеў, што калі штосьці не атрымаецца, то тут дом і ўчастак можна проста прадаць, што ўсе ўкладанні акупяцца — сядзіба акажацца лепшай за любую ашчадную кніжку.

## Месца хопіць усім

Зрэшты, продаж — варыянт па-сапраўднаму крайні. І вялікай патрэбы ў ім зараз няма. Адзін красамоўны момант: на працягу гадзіны знаходжання ў аграсядзібе размову з гаспадаром перапыняе амаль дзесятак званкоў на мабільнік. Тэлефануюць і з Беларусі, і з Расіі. Прычым кожны чуе... адмову. Запаўняльнасць сёння пад завязку. «Высокі» сезон на Браслаўшчыне кароткі, і каб патрапіць сюды ў ліпені—жніўні, трэба рабіць заказы яшчэ ў красавіку-маі. Да таго ж прынцыпова «за бортам» застаюцца ўсе тыя, хто хоча зладзіць карпаратыўныя мерапрыемствы. Як кажуць, ёсць сумны вопыт прыёму.

— Я прымаю гасцей другі год і, зразумела, у кагосьці тут паспелі пабываць знаёмыя, сябры ці сваякі, якія міжволі робяць «рэкламу», — кажа Аляксандр Шакель. — І ўсё ж абсалютная большасць даведваецца аб сядзібе праз інтэрнэт — яго магчымасці аказаліся насамрэч бязмежнымі.

Інтарэс да ціхага адпачынку працягвае ўзрастаць. Збольшага гэтым цікавяцца мінчане, піцерцы і масквічы, якія штогод задыхаюцца ад смогу. Перспектывы тут відавочныя, і да таго ж для ўсяго не надта спрыяльнага для сельскай гаспадаркі раёна. Тутэйшыя азёры сталіся такім жа «раскручаным» брэндам, як на пачатку мінулага стагоддзя знакамітыя браслаўскія сады. Таму, перакананы гаспадар, баяцца канкурэнцыі не трэба, пакуль попыт значна перавышае прапанову, і месца ў гэтай сферы хопіць усім. Адно — нельга забывацца на камфорт, прымальныя цэны і... элементарныя правілы адносінаў да гасцей.

— На мой погляд, на 30 працэнтаў поспех любой аграсядзібы вызначае месца яе знаходжання, недзе на 20 працэнтаў — тое, як сядзіба зроблена, аднак на 50 працэнтаў усё залежыць менавіта ад гаспадара, — лічыць Аляксандр Шакель. — Гасцей трэба паважаць, трэба ўмець з імі размаўляць і ні ў якім разе нікога ніколі не «апякаць», не кантраляваць, не перашкаджаць адпачынку. Толькі тады можна спадзявацца, што турыст захоча вярнуцца сюды зноў.

## Паперы мінус, крэдыт плюс

Двухпавярховы дом з падабранага адно да аднаго бярвення, лазня, альтанка, кветкі, прагулачныя лодкі, шахматы, шашкі і спадарожнікавае тэлебачанне на выпадак дрэннага надвор'я, возера і багатыя на дзічыну лясы. Усё гэта ёсць і зараз. Аднак, заўважае гаспадар, ставіць тут кропку яшчэ вельмі рана. Адмыслова на сядзібе ўжо з'явіўся ставок з карасямі, пасаджаны сад — яблыкі, грушы, слівы, алыча, парэчкі, клубніцы, бульба прадастаўленыя ў поўнае распараджэнне гасцей. Надалей жа Аляксандр Шакель плануе таксама стварыць невялікія футбольную і валейбольную пляцоўкі, хоча арганізоўваць прагулкі на катары, невялікія паходы з начоўкай у палатках на навакольныя астравы. Бо проста «адаспацца, паплаваць і падыхаць свежым паветрам» — таксама не варыянт. Трэба развівацца далей. І для гэтага ёсць усе падставы.

Нельга спрачацца, што праблемы ў агратурызме былі і застаюцца. Скажам, ніхто дакладна не ведае, ці можна зараз змайстраваць кладку да возера або насыпаць на беразе невялікі пляж. Незразумелай застаецца і сітуацыя з рэгістрацыяй іншаземцаў. Мала хто сумняваецца, што гэта патрэбна. Вось толькі дзе яе рабіць — пытанне іншае. Многія краіны рэгіструюць турыстаў непасрэдна на мяжы. У нас неабходна завітаць да пашпартыста, інакш кажучы, у «пікавыя» месяцы ёсць верагоднасць страціць ці не дзень адпачынку... Праўда, гэта можна ўсё ж лічыць дробязямі. Больш важна іншае.

— Зараз аграэкатурызм не лічыцца прадпрымальніцкай дзейнасцю, тут не патрабуецца спецыяльная рэгістрацыя, дастаткова паведаміць аб сваіх намерах у сельсавет і плаціць па адной базавай велічыні ў год, — зазначае Аляксандр Шакель. — Да таго ж з'явілася магчымасць узяць на развіццё трэці і нашмат больш выгадны крэдыт — тэрмінам на 7 гадоў пад 5 працэнтаў гадавых з адтэрміноўкай па выплаце асноўнага доўгу на 12 месяцаў. Словам, уявіць больш спрыяльныя ўмовы цяжка, са свайго боку дзяржава зрабіла ўсё. Таму галоўнае, каб цяперашнія правілы гульні прынамсі гадоў дзесяць не змяняліся. А астатняе будзе залежаць выключна ад цябе.

**Сяргей ГРЫБ.**
*Браслаўскі раён.*

**Фота аўтара.**

# Закон Рэспублікі Беларусь

# АБ САВЕЦЕ МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 2 і 5 жніўня).*

**Артыкул 13. Паўнамоцтвы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне навукі, адукацыі**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне навукі, адукацыі:

забяспечвае правядзенне адзінай дзяржаўнай палітыкі;

удзельнічае ў фарміраванні і забяспечвае рэалізацыю дзяржаўнай навукова-тэхнічнай і інавацыйнай палітыкі;

прымае меры па развіцці навуковага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь, павышэнні эфектыўнасці яго выкарыстання, больш шырокім прымяненні на практыцы вынікаў навуковых даследаванняў, вынаходніцтва і рацыяналізатарства;

ажыццяўляе меры па развіцці навуковых арганізацый, падрыхтоўцы навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі;

ажыццяўляе агульнае кіраванне сістэмай адукацыі;

прымае меры па развіцці і ўмацаванні сеткі дзяржаўных устаноў адукацыі;

забяспечвае рэалізацыю дзяржаўных праграм развіцця адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь;

прымае меры па ўдасканаленні сістэмы прафесійнай арыентацыі, стварае ўмовы для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі, навучання новым спецыяльнасцям, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі з улікам грамадскіх і вытворчых патрэбнасцяў;

ажыццяўляе меры па фарміраванні і рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі;

забяспечвае меры па дзяржаўнай сацыяльнай падтрымцы навучэнцаў.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне навукі, адукацыі акрамя паўнамоцтваў, вызначаных гэтым артыкулам, ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 14. Паўнамоцтвы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне культуры, у сферы архіўнай справы**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне культуры, у сферы архіўнай справы:

забяспечвае правядзенне адзінай дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры;

праводзіць дзяржаўную палітыку, накіраваную на захаванне і развіццё беларускай і рускай моў, стварэнне належных умоў для развіцця моў іншых нацыянальных супольнасцяў, якія пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

ажыццяўляе меры па развіцці і паляпшэнні работы арганізацый культуры, дзяржаўных архіўных органаў і ўстаноў, забяспечвае рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны, памнажэнне і шырокае выкарыстанне культурных каштоўнасцяў, у тым ліку народнай творчасці, для духоўнага і эстэтычнага выхавання грамадзян, павышэння іх культурнага ўзроўню, а таксама садзейнічае развіццю прафесійнага мастацтва, літаратуры, нацыянальнага кнігавыдання і перыядычнага друку;

стварае ўмовы для свабоднага развіцця культуры ўсіх нацыянальных супольнасцяў, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь;

прымае меры па забеспячэнні правоў грамадзян Рэспублікі Беларусь на свабоду веравызнання.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне культуры, у сферы архіўнай справы акрамя паўнамоцтваў, вызначаных гэтым артыкулам, ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 15. Паўнамоцтвы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне аховы здароўя**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне аховы здароўя:

забяспечвае правядзенне адзінай дзяржаўнай палітыкі;

забяспечвае распрацоўку і рэалізацыю дзяржаўных праграм.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне аховы здароўя акрамя паўнамоцтваў, вызначаных гэтым артыкулам, ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 16. Паўнамоцтвы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне сацыяльнага забеспячэння, аховы і аплаты працы**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне сацыяльнага забеспячэння, аховы і аплаты працы:

забяспечвае правядзенне адзінай дзяржаўнай палітыкі;

вызначае дзяржаўную палітыку ў галіне забеспячэння дэмаграфічнай бяспекі і забяспечвае яе правядзенне;

зацвярджае пражытковы мінімум, бюджэт пражытковага мінімуму па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах і ў сярэднім на душу насельніцтва;

стварае ўмовы для падтрымання ўстаноўленага заканадаўствам Рэспублікі Беларусь узроўню сацыяльнага забеспячэння, прымае меры па забеспячэнні сацыяльнай абароны грамадзян, удасканальвае сістэму сацыяльнай абароны;

вызначае і рэалізуе найбольш эфектыўныя шляхі павышэння даходаў сям'і, стыпендый, пенсій, дапамог, іншых сацыяльных выплат;

распрацоўвае і ажыццяўляе сацыяльна-эканамічныя меры па паляпшэнні становішча жанчын, дзяцей, умацаванні і падтрымцы сям'і, забяспечвае кантроль за выкананнем прадастаўленых жанчынам правоў і гарантый;

прымае меры па папярэджанні інваліднасці і арганізацыі рэабілітацыі інвалідаў;

прымае меры па рэалізацыі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь права на працу;

арганізуе распрацоўку і рэалізацыю рэспубліканскіх мэтавых праграм паляпшэння ўмоў і аховы працы;

распрацоўвае і ажыццяўляе меры па рацыянальным размяшчэнні вытворчых сіл, правядзенні ў жыццё адпаведнай палітыкі народанасельніцтва;

устанаўлівае памеры мінімальнай заработнай платы і базавай велічыні, а таксама памеры аплаты працы работнікаў арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту і карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне сацыяльнага забеспячэння, аховы і аплаты працы акрамя паўнамоцтваў, вызначаных гэтым артыкулам, ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 17. Паўнамоцтвы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне аховы навакольнага асяроддзя**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне аховы навакольнага асяроддзя:

забяспечвае правядзенне адзінай дзяржаўнай палітыкі;

забяспечвае распрацоўку і выкананне дзяржаўных праграм рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя;

устанаўлівае парадак распрацоўкі і зацвярджэння тэрытарыяльных комплексных схем рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і парадак іх фінансавання;

устанаўлівае ліміты на прыродакарыстанне;

устанаўлівае парадак вядзення дзяржаўных кадастраў прыродных рэсурсаў, а таксама парадак дзяржаўнага ўліку ў галіне аховы навакольнага асяроддзя;

устанаўлівае парадак вядзення Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя ў Рэспубліцы Беларусь, вызначае парадак правядзення маніторынгу і выкарыстання яго даных;

аб'яўляе асобныя ўчасткі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь зонамі экалагічнай рызыкі і зонамі экалагічнага крызісу;

забяспечвае фарміраванне экалагічнай культуры, а таксама падрыхтоўку і перападрыхтоўку спецыялістаў для ажыццяўлення дзейнасці ў галіне аховы навакольнага асяроддзя.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне аховы навакольнага асяроддзя акрамя паўнамоцтваў, вызначаных гэтым артыкулам, ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 18. Паўнамоцтвы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне гідраметэаралагічнай дзейнасці**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне гідраметэаралагічнай дзейнасці:

забяспечвае правядзенне адзінай дзяржаўнай палітыкі;

зацвярджае Схему дзяржаўнай сеткі гідраметэаралагічных назіранняў;

прымае рашэнні аб пераносе дзеючых гідраметэаралагічных аб'ектаў дзяржаўнай гідраметэаралагічнай службы;

вызначае парадак вядзення Дзяржаўнага рэестра вытворцаў гідраметэаралагічнай інфармацыі і выдачы пасведчанняў аб рэгістрацыі ў ім вытворцаў гідраметэаралагічнай інфармацыі;

вызначае парадак ажыццяўлення дзяржаўнага кантролю ў галіне гідраметэаралагічнай дзейнасці і пералік службовых асобаў, якія ажыццяўляюць гэты кантроль;

вызначае парадак вядзення дзяржаўнага кліматычнага кадастру, а таксама склад даных дзяржаўнага кліматычнага кадастру і парадак прадастаўлення дзяржаўным органам, іншым арганізацыям і фізічным асобам яго даных;

вызначае склад дзяржаўнага гідраметэаралагічнага фонду, а таксама парадак яго вядзення і выкарыстання.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне гідраметэаралагічнай дзейнасці акрамя паўнамоцтваў, вызначаных гэтым артыкулам, ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 19. Паўнамоцтвы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне забеспячэння законнасці і правапарадку**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне забеспячэння законнасці і правапарадку:

прымае меры па забеспячэнні правоў і свабод грамадзян, абароне інтарэсаў дзяржавы, ахове ўласнасці і грамадскага парадку, барацьбе са злачыннасцю;

забяспечвае абарону асобы ад любых проціпраўных дзеянняў, замахаў на жыццё, здароўе, маёмасць, гонар і годнасць, а таксама абарону грамадзяніна Рэспублікі Беларусь як на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, так і за яе межамі;

вызначае асноўныя накірункі прававой работы ў падпарадкаваных яму рэспубліканскіх органах дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацыях;

кіруе дзейнасцю падпарадкаваных яму рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый у галіне прававой адукацыі грамадзян;

кіруе дзейнасцю падпарадкаваных яму рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый па забеспячэнні законнасці і правапарадку, рэалізацыі дзяржаўных праграм па барацьбе са злачыннасцю;

уносіць прапановы ў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне забеспячэння законнасці і правапарадку акрамя паўнамоцтваў, вызначаных гэтым артыкулам, ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 20. Паўнамоцтвы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне забеспячэння нацыянальнай бяспекі і абараназдольнасці дзяржавы**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне забеспячэння нацыянальнай бяспекі і абараназдольнасці дзяржавы:

прымае меры па забеспячэнні нацыянальнай бяспекі і абараназдольнасці, абароне незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь;

ажыццяўляе кантроль за выкананнем дзяржаўнай праграмы ўзбраення;

арганізуе распрацоўку і фарміраванне дзяржаўнага абароннага заказу, аснашчэнне Узброеных Сілаў, іншых войскаў, воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый Рэспублікі Беларусь узбраеннем, ваеннай тэхнікай і іншымі матэрыяльнымі каштоўнасцямі і рэсурсамі па іх заказах, а таксама вырашае пытанні будаўніцтва і размяшчэння на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь абарончых аб'ектаў;

вызначае аб'ёмы матэрыяльных каштоўнасцяў і бюджэтных асігнаванняў на патрэбы абароны, у тым ліку на рэалізацыю дзяржаўнай праграмы ўзбраення, правядзенне навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх работ у галіне абароны, забяспечвае стварэнне і захаванасць дзяржаўнага і мабілізацыйнага матэрыяльных рэзерваў, кіруе мабілізацыйнай падрыхтоўкай;

ажыццяўляе кіраванне падрыхтоўкай грамадзян Рэспублікі Беларусь да ваеннай службы, іх прызывам на ваенную службу, службу ў рэзерве і забяспечвае стварэнне ваеннанавучанага рэзерву;

уносіць на зацвярджэнне Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь план назапашвання матэрыяльных каштоўнасцяў у дзяржаўным матэрыяльным рэзерве і план назапашвання матэрыяльных каштоўнасцяў у мабілізацыйным матэрыяльным рэзерве;

ажыццяўляе кіраванне грамадзянскай абаронай Рэспублікі Беларусь;

арганізуе распрацоўку і забяспечвае выкананне дзяржаўных праграм у галіне абароны насельніцтва і тэрыторый ад надзвычайных сітуацый;

устанаўлівае парадак ажыццяўлення дзяржаўнага кантролю за аховай і выкарыстаннем тэрыторый радыеактыўнага забруджвання;

забяспечвае правядзенне адзінай дзяржаўнай палітыкі ў галіне прадухілення і ліквідацыі надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару і грамадзянскай абароны;

вызначае дзяржаўную палітыку ў галіне забеспячэння пажарнай, прамысловай, ядзернай і радыяцыйнай бяспекі, ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС;

ажыццяўляе агульнае кіраванне дзейнасцю падпарадкаваных яму рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, а таксама мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў па процідзеянні экстрэмізму, кантроль за гэтай дзейнасцю.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне забеспячэння нацыянальнай бяспекі і абараназдольнасці дзяржавы акрамя паўнамоцтваў, вызначаных гэтым артыкулам, ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 21. Паўнамоцтвы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне ўнутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне ўнутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь:

распрацоўвае асноўныя накірункі ўнутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь і прымае меры па іх рэалізацыі;

ажыццяўляе каардынацыю дзейнасці ў галіне адносінаў Рэспублікі Беларусь з іншаземнымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі;

прымае практычныя меры па рэалізацыі і абароне знешнепалітычных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь;

заключае міжнародныя дагаворы па пытаннях, якія адносяцца да яго кампетэнцыі;

прымае меры па забеспячэнні выканання міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне ўнутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь акрамя паўнамоцтваў, вызначаных гэтым артыкулам, ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 22. Паўнамоцтвы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне кадравай палітыкі**

У межах Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, законаў Рэспублікі Беларусь, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне кадравай палітыкі:

распрацоўвае і ўносіць на разгляд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прапановы па ажыццяўленні кадравай палітыкі, накіраванай на стварэнне неабходнага рэзерву высокакваліфікаваных кіруючых работнікаў сістэмы падпарадкаваных яму рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, а таксама мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, садзейнічае забеспячэнню іх падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі;

каардынуе і кантралюе дзейнасць падпарадкаваных яму рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, а таксама мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў па ажыццяўленні кадравай палітыкі;

удзельнічае ў фарміраванні кадравага рэестра Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь;

зацвярджае кадравы рэестр Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у галіне кадравай палітыкі Рэспублікі Беларусь акрамя паўнамоцтваў, вызначаных гэтым артыкулам, ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 23. Іншыя паўнамоцтвы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь акрамя паўнамоцтваў, вызначаных гэтым Законам, ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, ускладзеныя на яго Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**ГЛАВА 4**
**КІРАВАННЕ САВЕТАМ МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ДЗЕЙНАСЦЮ РЭСПУБЛІКАНСКІХ ОРГАНАЎ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ І ІНШЫХ ДЗЯРЖАЎНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, ПАДПАРАДКАВАНЫХ САВЕТУ МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, УПАЎНАВАЖАНАГА ПА СПРАВАХ РЭЛІГІЙ І НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЯЎ, А ТАКСАМА ДЗЕЙНАСЦЮ МЯСЦОВЫХ ВЫКАНАЎЧЫХ І РАСПАРАДЧЫХ ОРГАНАЎ**

**Артыкул 24. Сістэма рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь**

Сістэму падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый вызначае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

У сістэму рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, уваходзяць:

міністэрствы, дзяржаўныя камітэты, якія з'яўляюцца рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання (функцыянальнымі або галіновымі), якія праводзяць дзяржаўную палітыку, ажыццяўляюць рэгуляванне і кіраванне ў пэўнай галіне (сферы дзейнасці) і каардынуюць дзейнасць у дадзенай галіне (сферы дзейнасці) іншых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання;

аб'яднанні юрыдычных асобаў, іншыя дзяржаўныя арганізацыі, падпарадкаваныя Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваныя Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, па асобных пытаннях дзейнасці, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, могуць падпарадкоўвацца выключна Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь.

У мэтах рэалізацыі паўнамоцтваў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, у адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках Рэспублікі Беларусь могуць ствараацца тэрытарыяльныя органы гэтых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання.

**Артыкул 25. Кіраванне Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь падпарадкаванымі яму рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь:

прымае меры па забеспячэнні рэалізацыі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, падпарадкаванымі Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, прадастаўленых ім паўнамоцтваў у мэтах выканання ўскладзеных на іх задач і ажыццяўлення імі сваіх функцый, самастойнага вырашэння аднесеных да іх кампетэнцыі пытанняў;

зацвярджае ва ўстаноўленым парадку палажэнні аб рэспубліканскіх органах дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

вызначае структуру рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, колькасць іх тэрытарыяльных органаў і пералік падпарадкаваных ім (якія ўваходзяць у іх сістэму, склад) дзяржаўных арганізацый, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

зацвярджае палажэнні аб дэпартаментах рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

зацвярджае ва ўстаноўленым парадку склад калегій рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

передае пры неабходнасці вырашэнне асобных пытанняў дзяржаўнага кіравання, якія ўваходзяць у яго кампетэнцыю, рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваным Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, за выключэннем пытанняў, вырашэнне якіх адносіцца да выключнай кампетэнцыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, або прымае да вырашэння пытанні, якія ўваходзяць у кампетэнцыю рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, за выключэннем выпадкаў, калі кампетэнцыя ўказаных органаў вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

адмяняе прававыя акты рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, калі яны супярэчаць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, законам Рэспублікі Беларусь, актам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастановам Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, распараджэнням Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, за выключэннем рашэнняў, якія могуць быць адменены толькі Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

накладае ва ўстаноўленым парадку на кіраўнікоў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, і іх намеснікаў, а таксама кіраўнікоў дэпартаментаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, дысцыплінарныя спагнанні, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 26. Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў**

Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь па прапанове Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў ажыццяўляе функцыі органа дзяржаўнага кіравання і падпарадкоўваецца Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь распрацоўвае і па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь зацвярджае Палажэнне аб Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў і яго апараце.

**Артыкул 27. Кіраванне Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь падпарадкаванымі яму дзяржаўнымі арганізацыямі**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь:

прымае меры па забеспячэнні рэалізацыі ў поўным аб'ёме дзяржаўнымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, прадастаўленых ім паўнамоцтваў у мэтах выканання ўскладзеных на іх задач і ажыццяўлення імі сваіх функцый, самастойнага вырашэння аднесеных да іх кампетэнцыі пытанняў;

зацвярджае ва ўстаноўленым парадку статуты дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

накладае ва ўстаноўленым парадку на кіраўнікоў дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, а таксама на іх намеснікаў дысцыплінарныя спагнанні, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 28. Кіраванне Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі**

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь:

кіруе дзейнасцю мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь;

арганізуе кантроль за выкананнем мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, законаў Рэспублікі Беларусь, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, распараджэнняў Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, атрымлівае інфармацыю і заслухоўвае па гэтых пытаннях іх справаздачы, прымае адпаведныя рашэнні;

стварае ўмовы для падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў;

садзейнічае мясцовым выканаўчым і распарадчым органам у арганізацыі іх дзейнасці;

рэгулюе пытанні ўзаемадзеяння паміж мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі і падпарадкаванымі Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі, вызначае парадак і ступень іх удзелу ў выкананні дзяржаўных і рэгіянальных праграм, мерапрыемстваў па ліквідацыі наступстваў надзвычайных сітуацый, рэгулюе пытанні выдзялення ім фінансавых і матэрыяльных сродкаў;

перадае пры неабходнасці свае асобныя паўнамоцтвы мясцовым выканаўчым і распарадчым органам;

рэалізуе паўнамоцтвы, якія ва ўстаноўленым парадку могуць перадаваць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы.

**ГЛАВА 5**
**АДНОСІНЫ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ З НАЦЫЯНАЛЬНЫМ СХОДАМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, НАЦЫЯНАЛЬНЫМ БАНКАМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І МЯСЦОВЫМІ САВЕТАМІ ДЭПУТАТАЎ**

**Артыкул 29. Адносіны Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь з Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь валодае правам заканадаўчай ініцыятывы. Па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па ўласнай ініцыятыве, а таксама ў выпадках, прадугледжаных законамі Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь арганізуе распрацоўку праектаў законаў Рэспублікі Беларусь.

Па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь мае права ўносіць прапановы ў Палату прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь аб аб'яўленні разгляду праекта закона Рэспублікі Беларусь тэрміновым.

Са згоды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь мае права патрабаваць ад Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь прыняцця на сваіх пасяджэннях рашэння шляхам галасавання ў цэлым за ўвесь унесены Саветам Міністраў праект закона Рэспублікі Беларусь або яго частку з захаваннем толькі тых паправак, якія прапанаваны або прыняты Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь або Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь можа патрабаваць прыняцця Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь канчатковага рашэння, калі пагаджальнай камісіяй, створанай у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь з прычыны адхілення Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь праекта закона Рэспублікі Беларусь, не прыняты яго ўзгоднены тэкст.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у парадку, вызначаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, прадстаўляе ў палаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і іх органы па іх патрабаванні, а таксама па ўласнай ініцыятыве дакументы і іншыя матэрыялы, звязаныя з дзейнасцю Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь у двухмесячны тэрмін пасля прызначэння яго на пасаду прадстаўляе Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь праграму дзейнасці Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, а ў выпадку яе адхілення прадстаўляе паўторную праграму дзейнасці Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь на працягу двух месяцаў.

Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь можа паставіць перад Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пытанне аб даверы Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь па прадстаўленай праграме або па канкрэтнай прычыне. Калі Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у такім даверы адмаўляе, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь мае права ў дзесяцідзённы тэрмін прыняць рашэнне аб адстаўцы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь або аб роспуску Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і прызначэнні новых выбараў. Пры адхіленні адстаўкі Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь працягвае ажыццяўляць свае паўнамоцтвы.

У час пасяджэнняў палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, у тым ліку закрытых, Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь і члены Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь могуць выступаць па-за чаргой тых, хто запісаўся для выступлення, столькі разоў, колькі яны таго запатрабуюць.

**Артыкул 30. Узаемадзеянне Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь з Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь**

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь сумесна з Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь забяспечвае правядзенне адзінай грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь і прадстаўляе Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь для штогадовага зацвярджэння Асноўныя накірункі грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь інфармуюць адзін аднаго аб мяркуемых дзеяннях, якія маюць агульнадзяржаўнае значэнне, каардынуюць сваю дзейнасць, праводзяць рэгулярныя ўзаемныя кансультацыі.

**Артыкул 31. Адносіны Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь з мясцовымі Саветамі дэпутатаў**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у мэтах уліку інтарэсаў Рэспублікі Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь вызначае разам з мясцовымі Саветамі дэпутатаў парадак і ступень іх удзелу ў выкананні дзяржаўных праграм, сумесных праектаў, разглядае прапановы мясцовых Саветаў дэпутатаў.

**ГЛАВА 6**
**АРГАНІЗАЦЫЯ І ПАРАДАК ДЗЕЙНАСЦІ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Артыкул 32. Пасяджэнні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і парадак прыняцця на іх рашэнняў**

Пасяджэнні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей чым адзін раз у тры месяцы. Пасяджэнне Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь лічыцца правамоцным, калі ў ім прымае ўдзел не менш за палову членаў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Пасяджэнні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь праходзяць пад старшынствам Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь. Пры адсутнасці Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь пасяджэнні праводзіць Першы намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, а пры адсутнасці Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь і Першага намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь — Намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, у распараджэнні якога знаходзяцца пытанні эканомікі.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь мае права старшынстваваць на пасяджэннях Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Рашэнні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь прымаюцца большасцю галасоў членаў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, якія прысутнічаюць на пасяджэнні. У выпадку роўнасці галасоў прынятым лічыцца рашэнне, за якое прагаласаваў старшынствуючы.

**Артыкул 33. Пытанні, якія разглядаюцца на пасяджэннях Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь**

На пасяджэннях Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь вырашаюцца найбольш важныя пытанні, якія адносяцца да кампетэнцыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Выключна на пасяджэннях Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь разглядаюцца:

пытанні падрыхтоўкі праекта бюджэту Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год, выканання бюджэту, фарміравання выкарыстання дзяржаўных пазабюджэтных фондаў;

праекты праграм эканамічнага і сацыяльнага развіцця Рэспублікі Беларусь;

асноўныя накірункі ўнутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь;

пытанні падрыхтоўкі справаздачы аб дзейнасці Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь перад Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 34. Прэзідыум Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь**

Для аператыўнага вырашэння пытанняў, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, у якасці яго пастаяннага органа дзейнічае Прэзідыум Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у складзе Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, яго намеснікаў, Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, Старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, Міністра эканомікі Рэспублікі Беларусь, Міністра фінансаў Рэспублікі Беларусь, Міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

Пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей чым адзін раз у месяц пад старшынствам Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, а пры яго адсутнасці — пад старшынствам Першага намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь. У выпадку адсутнасці Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь і Першага намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь правядзенне пасяджэнняў ажыццяўляецца Намеснікам Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, у распараджэнні якога знаходзяцца пытанні эканомікі.

Пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь лічыцца правамоцным, калі на ім прысутнічае больш за палову членаў Прэзідыума. Рашэнні Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь прымаюцца большасцю галасоў ад агульнай колькасці яго членаў, афармляюцца, як правіла, у выглядзе пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і павінны адпавядаць актам, прынятым на пасяджэннях Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. У выпадку роўнасці галасоў прынятым лічыцца рашэнне, за якое прагаласаваў старшынствуючы.

Па асобных неадкладных пытаннях або пытаннях, якія не патрабуюць абмеркавання, пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь могуць прымацца шляхам апытання членаў Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (без разгляду на пасяджэннях).

**Артыкул 35. Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, распараджэнні Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, іншыя рашэнні Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, а таксама намеснікаў Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь на аснове і ў мэтах выканання Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, законаў Рэспублікі Беларусь, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прымае пастановы і кантралюе іх выкананне.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь забяспечвае кантроль за выкананнем сваіх пастаноў непасрэдна або праз падпарадкаваныя яму рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання і іншыя дзяржаўныя арганізацыі, а таксама мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы і Апарат Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь могуць быць адменены актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Распараджэнні Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь выдаюцца па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, а таксама пры наяўнасці даручэння Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю, але не адносяцца да канстытуцыйных паўнамоцтваў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, калі рэгуляванне іх не патрабуе прыняцця рашэнняў, што носяць нарматыўны характар.

Рашэнні па асобных пытаннях могуць афармляцца ў выглядзе пратаколаў пасяджэнняў (нарад) у Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь і яго намеснікаў, а таксама іх указанняў і даручэнняў, якія з'яўляюцца абавязковымі для выканання службовымі асобамі Апарата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, а таксама мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. Пры гэтым дадзеныя даручэнні і ўказанні не могуць насіць нарматыўны характар.

Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і распараджэнні Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь уступаюць у сілу і публікуюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 36. Камісіі і іншыя фарміраванні, якія ствараюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь для падрыхтоўкі прапаноў па асобных пытаннях дзяржаўнага кіравання, распрацоўкі праектаў пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, а таксама для выканання асобных даручэнняў можа ствараць пастаянныя або часовыя камісіі і іншыя фарміраванні.

**Артыкул 37. Ганаровая грамата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь**

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь засноўвае Ганаровую грамату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь узнагароджваюцца грамадзяне і арганізацыі Рэспублікі Беларусь і замежных дзяржаў за заслугі ў дзяржаўнай, вытворчай, сацыяльна-культурнай дзейнасці, умацаванні абараназдольнасці Рэспублікі Беларусь.

Парадак узнагароджання Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь вызначаецца гэтым Законам і Палажэннем аб Ганаровай грамаце Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, якое зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Рашэнне аб узнагароджанні Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь афармляецца пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 38. Іншыя пытанні арганізацыі і парадку дзейнасці Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь**

Пытанні арганізацыі і парадку дзейнасці Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, не ўрэгуляваныя гэтым Законам, іншымі законамі і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, рэгулююцца Рэгламентам, які зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 39. Апарат Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь**

Для арганізацыі і кантролю выканання прымаемых Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь рашэнняў ствараецца Апарат Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, які дзейнічае на аснове палажэння, што зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Кіраўнік Апарата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь паводле статусу з'яўляецца міністрам, прызначаецца на пасаду і вызваляецца з пасады Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь па прадстаўленні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Апарат Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь з'яўляецца юрыдычнай асобай, мае самастойны баланс, рахункі ў банках, у тым ліку валютны.

Структура і штатны расклад Апарата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, памер аплаты працы і ўмовы матэрыяльна-бытавога, медыцынскага забеспячэння яго работнікаў вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Работнікі Апарата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у сваёй дзейнасці падсправаздачныя Прэм'ер-міністру Рэспублікі Беларусь, яго намеснікам і Кіраўніку Апарата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**ГЛАВА 7**
**ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

**Артыкул 40. Прызнанне страціўшымі сілу некаторых законаў Рэспублікі Беларусь і іх асобных палажэнняў**

Прызнаць, што страцілі сілу:

Закон Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 1998 года «Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1998 г., № 29—30, ст. 466);

артыкул 3 Закона Рэспублікі Беларусь ад 16 чэрвеня 2000 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2000 г., № 59, 2/176);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 31 студзеня 2003 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь і падпарадкаваных яму дзяржаўных органах» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 17, 2/935);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 чэрвеня 2003 года «Аб унясенні дапаўнення ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь і падпарадкаваных яму дзяржаўных органах» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 74, 2/959);

артыкул 19 Закона Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2006 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях тэхнічнага нармавання, стандартызацыі і ацэнкі адпаведнасці патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нармавання і стандартызацыі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 122, 2/1259);

артыкул 11 Закона Рэспублікі Беларусь ад 7 мая 2007 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь і прызнанні страціўшымі сілу Пастановы Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб рэарганізацыі справы аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 118, 2/1309).

**Артыкул 41. Прывядзенне актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам**

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у шасцімесячны тэрмін:

прывесці рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам;

забяспечыць прывядзенне рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, іх нарматыўных прававых актаў у адпаведнасць з гэтым Законам;

прыняць іншыя меры, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

**Артыкул 42. Уступленне ў сілу гэтага Закона**

Гэты Закон уступае ў сілу праз дзесяць дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА**

*23 ліпеня 2008 года, г. Мінск.*
*№ 424-З*

## Закупачныя цэны на алейнае семя рапсу ў лік дзяржзаказу павялічаны ў сярэднім на 20 працэнтаў

Рашэнне аб гэтым змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў № 1097. Як паведаміла карэспандэнту **БЕЛТА** начальнік галоўнага ўпраўлення эканомікі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Ганна Андрыевіч, каментуючы дакумент, закупачныя цэны на алейнае семя рапсу павялічаны з 1 ліпеня. Новыя цэны дадуць магчымасць павысіць матэрыяльную зацікаўленасць сельскіх гаспадарак у безумоўным выкананні дзяржзаказу, які ў гэтым годзе складае 249,5 тыс. тон, і выгадна прадаць лішкі сыравіны дзяржаве. Калі раней алейнае семя рапсу на харчовыя мэты прымалі па Br581 тыс. за тону, а на тэхнічныя па Br513 тыс., то цяпер адпаведна па Br700 тыс. і Br650 тыс.

## «МАЦЯРЫНСКІ КАПІТАЛ СТЫМУЛЮЕ НАРАДЖАЛЬНАСЦЬ ЛЕПШ, ЧЫМ ПАВЕЛІЧЭННЕ ДЗІЦЯЧЫХ ДАПАМОГ»

**Такую думку ў гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА выказаў старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Алег Вялічка.**

«Я прыхільнік такіх метадаў падтрымкі маладых сем'яў, як мацярынскі капітал. Натуральна, што мы павінны павялічваць і дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Але ёсць у гэтым і негатыўны момант. Павелічэнне дапамог можа падштурхнуць да нараджэння дзяцей у асобаў асацыяльных, якія будуць нараджаць дзяцей не для таго, каб іх пасля дастойна выхаваць, а з мэтай патраціць грошы, напрыклад, на выпіўку, — сказаў суразмоўца. — Дапамога павінна забяспечваць пражытковы мінімум, але ісці толькі па шляху яго павелічэння няправільна. Намнога лепш прадастаўляць пры нараджэнні другога і наступнага дзіцяці мацярынскі капітал. Гэты метад будзе больш стымуляваць сем'і заводзіць дзяцей, надасць упэўненасці ў заўтрашнім дні».

Грошы мацярынскага капіталу можна будзе патраціць, напрыклад, толькі на набыццё жылля, адукацыю дзяцей, удакладніў старшыня парламенцкай камісіі. Алег Вялічка таксама прапаноўвае дазволіць маладым сем'ям без кватэры выкарыстаць грошы мацярынскага капіталу для найму жылля. На думку парламентарыя, на першым этапе Br10 млн будзе аптымальнай сумай мацярынскага капіталу ў Беларусі. «Гэта не вельмі вялікія грошы, але нейкія праблемы за кошт іх могуць быць вырашаны, напрыклад, навучанне, першы ўзнос за жыллё, якое будуецца. Натуральна, трэба будзе думаць аб павелічэнні сумы мацярынскага капіталу і цягнуцца за Расіяй, дзе пры нараджэнні другога ці наступнага дзіцяці мацярынскі капітал складае каля $10 тыс.», — дадаў парламентарый.

Наш культурны асяродак

# Жырандоля

Выпуск № 9 (31)

# Паэмны кампазітар Ігар Лучанок

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як вядома, творы І. Лучанка выконваюць самыя розныя музыкі і спевакі; у гэтым сэнсе і ансамблю «Сябры» таксама належыць эстэтычнае першынство.

Як і «Песняры», «Сябры» — невыпадковыя госці ў песенным доме гаспадара Ігара.

І вось да 70-гадовага юбілею вялікага майстра кампанія «Вігмапласт» падрыхтавала альбом, які выходзіць пад характэрнай, можна сказаць, ужо серыйнай назвай «Творы Ігара Лучанка ў выкананні ансамбля «Сябры».

Гэта зноў жа інтэлігентнае, шляхетнае выданне і таксама ж — выхаваўчае.

Я ўпэўнены, што і яго нашы слаўныя настаўнікі будуць удзячна выкарыстоўваць на ўроках беларускай літаратуры...

Любіць беларускую літаратуру — значыць узбагачаць сябе роднай паэзіяй.

Кампазітар Ігар Лучанок валодае гэтай дзівоснай якасцю — ён любіць нашу літаратуру, нашу паэзію так, як можна любіць толькі зоркі і кветкі.

Робячы такую выснову, я не перабольшваю, проста адзначаю гэту прывабную рысу лучанкоўскага характару.

Часта бываючы ў гасцях у маэстра, я неаднойчы заўважаў, як ён гартае тую ці іншую кнігу — ён гэта робіць з той далікатнасцю, з якой звычайна чулыя людзі дакранаюцца да кветак.

Мяркую, гэта яшчэ і далікатнасць астранома, які глядзіць на зоркі.

Ёсць і яшчэ адна асаблівасць, пра якую хочацца згадаць, — у голасе спадара Ігара імгненна з'яўляецца замілаванасць, калі ён пачынае расказваць пра сваю бібліятэку:

— ...Гэта раман Алеся Адамовіча! Бачыш, які мілы аўтограф ён мне пакінуў! А гэта зборнікі вершаў Максіма Танка, Петруся Броўкі, Генадзя Бураўкіна... А вось аповесці Васіля Быкава! А гэта «Людзі на балоце» Івана Мележа... Ведаеш, Мележ быў маім суседам, жыў у нашым доме... Калі я напісаў песню «Спадчына» на верш Янкі Купалы, Мележ сказаў: «У беларускай паэзіі беларускія музыканты могуць знайсці сваё найбольшае творчае шчасце!»

Дарэчы, гэта выказванне аўтара знакамітай «Палескай хронікі» сталася своеасаблівым урокам, карысной падказкай, якую Ігар Лучанок бліскуча скарыстаў.

Ён заняўся паглыбленым вывучэннем беларускай класічнай паэзіі і стварыў незвычайныя меладыйныя малюнкі, здолеў надаць песеннаму жанру маштаб паэмы.

Так, ён *паэмны* кампазітар, і не толькі таму, што зачараваў слухачоў сваім запамінальным «Гусляром», напісаным паводле паэмы Янкі Купалы «Курган», а перш за ўсё таму, што ён умее па-песеннаму чытаць эпічныя творы.

Вялікія тэксты ён успрымае інтанацыйна, выбарачна, па неабходным для сябе гукапісе; знаходзіць у іх менавіта тыя радкі, тыя страфы, якія ўжо самі па сабе багатыя вакальным гучаннем.

Не забываючыся на правіла, паводле якога ўсё з'яўляецца літаратурай, але не ўсё з'яўляецца песняй, аўтар «Гусляра» ашчадліва адасабляе знойдзенае ім слоўнае гучанне, нібыта падымае яго па-над літаратурным існаваннем.

Так з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» ўзнікла гімнічная споведзь «Мой родны кут...», з паэмы Максіма Багдановіча «Вераніка» з'явілася неверагоднае па сваёй мілагучнасці прызнанне «Ізноў пабачыў я сялібы...», з паэмы Паўлюка Труса «Дзесяты падмурак» нарадзілася празрыстая акварэльнасць «Падаюць сняжынкі...», а з паэмы Цёткі (Алаізы Пашкевіч) «Лета» выйшла ў вялікі свет красуня «Кася»...

Дарэчы, гэты яркі твор у сонечным выкананні ансамбля «Сябры» дае найбольшае ўяўленне аб той гукавой чысціні і глыбіні, аб тым світальным рытме, якімі беларуская рапсодыя паўплывала на творчасць Ігара Лучанка — стваральніка самай прыгожай нашай песеннай прасторы.

Мне асабіста заўсёды прыемна чуць і ад моладзі, і ад людзей сталага веку, што ім вельмі падабаюцца песні Лучанка ў выкананні «Сяброў».

Кампазітара і гэтых артыстаў аб'ядноўвае разуменне песні як з'явы эстэтычнай, але не схаванай у сваёй форме, а даступнай усім.

І кампазітар, і артысты ансамбля спавядаюць прынцыпы выразнай меладычнасці, узбагачанай тонкай аранжыроўкай В. Бадзьярава і М. Сацуры.

У полі іхняй супольнай працы квітнеюць кветкі, колер і водар якіх напоены лёсам, а не гульнёй.

Трэба сказаць, што не заўсёды поспех імгненна ўсміхаўся творцам, былі даволі пакутлівыя пошукі, але ў сумеснай рабоце ніколі не было абыякавасці.

Словам, Ігар Лучанок і ансамбль «Сябры» — гэта вельмі змястоўная тэма і для спецыялістаў, і для слухачоў; яна цікавая перш за ўсё тым суладдзем, якое існуе паміж акропальскім артыстызмам Анатоля Ярмоленкі і музыкай нашага самага славутага кампазітара.

Анатоль Ярмоленка ведае, што народная журба, рамантызм, весялосць, складнасць, надзённасць, урэшце — беларускасць лучанкоўскіх песень знаходзіцца ў памяркоўным харастве, у паэтычнай яснасці, у самой мове Якуба Коласа, Пімена Панчанкі, Алеся Ставера, Рыгора Барадуліна, Уладзіміра Някляева; моц гэтых песень жыве ў трывожнай, але не безнадзейнай мудрасці: «Знае толькі Бог адзіны...»

Не аспрэчваючы эстраднасць пачуццяў, Анатоль Ярмоленка настройвае сваіх музыкаў на драматургічны лад, у выніку чаго вакальныя вобразы не толькі чуюцца, але і «бачацца».

І таму, слухаючы «Сяброў», мы бачым нястомных жураўлёў, якія ляцяць на Палессе; бачым дом, у якім трэба бываць часцей; бачым жытнёвы звон і світанак, які ўзняўся над лесам...

Бачым спеўную паэзію Ігара Лучанка.

**Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК.**

## БРАВА, МАЭСТРА!

**6 жніўня вядомы беларускі кампазітар Ігар ЛУЧАНОК святкуе 70-гадовы юбілей**

Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1973), народны артыст Беларусі (1982), народны артыст СССР (1987) Ігар Міхайлавіч Лучанок нарадзіўся ў г. Мар'іна Горка. Скончыў Беларускую кансерваторыю (клас А. Багатырова). З 1980 года — Старшыня праўлення Беларускага саюза кампазітараў.

Ён працуе ў самых розных жанрах: вакальна-сімфанічным, камерна-інструментальным, камерна-вакальным, песенным. Як слушна адзначаюць спецыялісты, музыцы Лучанка ўласцівы яркі меладызм і нацыянальная самабытнасць.

Песні Лучанка пазнавальныя ўжо з першых нот. Іх добра ведаюць і любяць не толькі ў Беларусі: «Памяць сэрца», «Мой родны кут», «Жураўлі на Палессе ляцяць», «Спадчына», «Алеся», «Вераніка», «Верасы», «Хатынь», «Пісьмо з 45-га», «Зачарованая мая», «Майскі вальс», «Світанак», «Белы бусел», «Я хаджу закаханы», «Мар'іна Горка»...

«Ігар Лучанок — чарадзей, які дае крылы нашай паэзіі», — невыпадкова сказаў пра яго Максім Танк.

Музыка Ігара Лучанка дорыць усім нам святло і радасць, абуджае добрыя пачуцці.

Музыка Ігара Лучанка — гэта любоў да роднай Беларусі і вера ў яркую будучыню нашай Бацькаўшчыны.

Шчыра віншуем з юбілеем! Зычым здароўя, натхнення, новых чароўна-віртуозных твораў!

**Звяздоўцы.**

### «РАМАН+ЮЛІЯ»



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

*У Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі прайшла прэм'ера спектакля «Раман+Юлія» паводле п'есы Дзіяны Балыка. Пастаноўшчыкі і рэжысёры Валерый Анісенка і Кацярына Тарасава.*

У карпункт прыйшло пісьмо...

# ЛЮДЗІ — «РОБАТЫ»?

**«Прывітанне, Аляксандр Якаўлевіч! Мяне завуць (далей указаны жаночае імя і прозвішча)... Я займаюся дыанетыкай і саенталогіяй. Мне вядома, што ў 1994 годзе вы прайшлі курс «Дыянетычны семінар Л. Рона Хабарда...» Напрыканцы тэксту прапаноўваецца азнаёміцца з рэкламнымі паперамі, дзе расказваецца пра новыя кнігі па дыянетыцы — навуцы аб чалавечым розуме, а таксама саенталогіі — практычнай духоўнай філасофіі. Вядома ж, з яўнай прапановай іх купіць.**

Такое пісьмо я атрымаў нядаўна. Не скажу, што яно было вельмі для мяне нечаканае. Штогод на мой адрас, на жаль, прыходзяць аналагічныя лісты ад прыхільнікаў гэтага так званага вучэння. Сапраўды, калісьці ўдзельнічаў у семінары. Дарэчы, бясплатна, бо рыхтаваў па тэме артыкул. А астатнія, уявіце сабе, — за грошы.

Пасля распаду СССР было модна знаёміцца з раней невядомымі вучэннямі. У адсутнасці сур'ёзнай дзяржаўнай ідэалогіі і яшчэ даволі слабых пазіцый у грамадстве самых распаўсюджаных рэлігійных накірункаў людзі пачалі рабіцца прыхільнікамі розных «навук».

Напэўна, аўтар пісьма газет не чытае. Адкуль узяць на гэта часу, калі трэба перапісвацца з людзьмі, якіх ніколі не бачыла і толькі таму, што аднойчы яны мелі неасцярожнасць пакінуць у спецыяльнай анкеце свае каардынаты?

Пра вельмі развітую структуру «хабардыстаў» неаднаразова расказвалі вядучыя расійскія каналы. Сектай назваць гэтую плынь нельга. Не, гэта не секта, а цэлае міжнароднае супольніцтва, якое мае свае прадстаўніцтвы ў многіх краінах свету. Існуе нават царква саенталогіі, цэнтры рэлігійных тэхналогій, міжнародная арганізацыя, якая змагаецца з... наркаманіяй. Ды яшчэ, акрамя ўсяго іншага, рэкламуецца рух «Моладзь — за правы чалавека» (безумоўна, у «падтрымку» вядомай усім Сусветнай дэкларацыі).

І на шэраговым прыкладзе пісьма, што я атрымаў, няцяжка прыйсці да высновы — галоўная мэта ўсіх гэтых «дыянетыкаў» — зарабіць грошы. Хочаш добра зарабіць — прыдумай рэлігію? Насамрэч!

Памятаю некаторых саентолагаў — праз некалькі месяцаў станавіліся яны быццам робаты. Мала таго, што самі штодня «духоўна раслі», ды пачыналі вельмі моцна «ціснуць» на сваякоў і знаёмых, каб яны таксама пачалі вывучаць саенталогію. І, безумоўна, трэба апошнім таксама купляць кнігі адпаведныя. Пра самога амерыканца Хабарда вядома, што жыў ён у 1911—1986—м гадах. Аўтар каля 600 розных работ. Пісаў фантастычныя кнігі, аўтар сцэнарыяў, раманаў... Сайтаў адпаведных у віртуальным павуцінні шмат. На адным з іх, дарэчы, адзначаецца, што ён не мае ніякага дачынення да структур хабардыстаў. Думаю, што гэта вельмі прадуманая «страхоўка», каб у выпадку чаго ад розных юрыдычных праблем «выкруціцца». Самае цікавае, што напрыканцы старонкі сайта ёсць спасылка «Карта для робатаў». Проста не хацелася туды лезці, а назва гаворыць сама за сябе.



**Мая таямнічая незнаёмка пакінула кантактны тэлефон у Мінску. Вядома ж, мне яе прапанова не спадабалася. А мо хто з вас можа трапіць на гэтую вудачку? Не раю! Асабліва, на мой погляд, трэба сачыць, каб дзеці не былі ўцягнутыя ў гэта. Парознаму можна ставіцца да, напрыклад, праваслаўнага вучэння. Але да такой «методыкі» распаўсюджвання «ведаў» святары ніколі не дойдуць. Веравучэнні з вялікай літары навязаць па перапісцы немагчыма... Вельмі хацелася б, каб чытачы расказалі гісторыі пра дзейнасць сектаў. Асабіста ведаю сумныя прыклады, калі людзі літаральна станавіліся як зомбі. І чаму нічога не чуем пра дзейнасць нашых праваахоўных органаў па расследаванні дзейнасці розных незаконных «духоўных фарміраванняў»?**

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

«Круглы стол «Звязды»

# ТВАРАМ ДА ЦЭНТРА

## Рушыць краіна пры вяртанні сталіцы гістарычнага аблічча

*(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 2, 5 жніўня.)*

***— Але чаму ўсё-такі знікаюць будынкі, якія знаходзяцца пад аховай дзяржавы?***

**Астаповіч:** Лёс тых помнікаў, якія засталіся, вырашае і экспертыза і навукова-метадычны савет. Яшчэ гады чатыры таму ў яго склад уваходзіў прадстаўнік Таварыства Тамара Габрусь, вядомы беларускі навуковец у галіне гісторыі архітэктуры і мастацтвазнаўства. Яна працавала вельмі прынцыпова, напэўна, таму больш у склад савета не ўваходзіць. Але ўсе беларускія законы, якія закранаюць галіну аховы спадчыны, прадугледжваюць абавязковы ўдзел грамадскасці ў вырашэнні лёсу гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

**Жых:** Калі Вы маеце на ўвазе будынак па Гандлёвай, 27, то ён павінен быў быць рэканструяваны ў 80-ыя гады XX стагоддзя з правядзеннем усіх рамонтна-будаўнічых прац. У багне, якая стаяла да цяперашняга часу на вуліцы Гандлёвай, узровень пранікнення капілярнай вільгаці па ўсім масіве цаглянай кладкі дома дасягаў карнізнай пліты. Таму што будынак стаяў без гаспадара. І калі ўзнікла сітуацыя комплекснага аднаўлення цэнтра, гэты аб'ект стаў першым, які ўвайшоў у комплекс будынкаў духоўна-адукацыйнага праваслаўнага цэнтра. Але тэхнічнае заключэнне было адназначнае: аднавіць немагчыма. Я лічу, што было прынята правільнае рашэнне па разборы былых канструкцый. На сёння мы маем будынак у тым жа выглядзе — ён ужо не з'яўляецца аўтэнтычным помнікам, але адноўленыя яго першапачатковыя аб'ёмы прыстасаваныя да патрэбаў сённяшняга часу.

**Папруга:** Кансалідацыя гэтага помніка каштавала меней, чым яго нае знішчэнне. Калі я чую, што капілярная вада падымаецца да трэцяга паверха, то вельмі дзіўлюся — яна ў Венецыі туды не падымаецца. А той будынак прастаяў як мінімум два стагоддзі і не разваліўся... Але і тут мы маем тое самае: замест спадчыны будуецца «новае і лепшае».

## 3. Горад суцяшэння

***— Магчыма, праблемы ўзнікаюць з-за таго, што ў цэнтры самая дарагая і прыцягальная для інвестараў зямля?***

**Бубноўскі:** Для горада Мінска гэта пакуль што так. Але, напрыклад, у Германіі, як і ў іншых індустрыяльна развітых краінах сёння ўжо назіраецца адток капіталаў ад гістарычных цэнтраў гарадоў. Раней было вельмі практычна і прэстыжна размясціць офіс ці гандаль у цэнтры — тут пастаянна збіраліся людзі — патэнцыяльныя пакупнікі, або наведвальнікі. Гэта, нягледзячы на цэлы шэраг абмежаванняў у плошчах, планіроўцы, магчымасцях выкарыстання сучасных тэхналогій, на неабходнасць дадатковых значных затрат, забяспечвала гарантыю вяртання сродкаў, укладзеных у аб'екты гістарычных цэнтраў гарадоў і атрымання прыбытку. Але сёння, з павышэннем узроўню матарызацыі, сітуацыя рэзка змянілася. Зараз ужо не існуе праблем даступнасці, — у любую кропку не толькі горада, але і прыгарадаў можна беспрашкодна камфортна дабрацца. Да таго ж у гістарычных цэнтрах у поўнай меры праявіла сябе транспартная праблема, узнікла праблема паркоўак. Сукупнасць гэтых і іншых прычын прывяла да тэндэнцыі перамяшчэння бізнэсу на ўскраіны. Пакуль што мы ў Мінску гэтага ў поўнай меры не адчуваем, таму павінны скарыстаць прадстаўлены нам, магчыма, апошні станоўчы расклад палітычнай волі і эканамічнай зацікаўленасці.

**Астаповіч:** Чыноўнікі ўзгадваюць Указ Прэзідэнта № 330 і спасылаюцца на яго, калі пачынаюць узнікаць нейкія пытанні. Але ўказ лаканічны, і ставіць вельмі канкрэтныя задачы па тэрмінах, па заказчыку, ды і ўсё. Але парушаюцца пункты самога дакумента, бо ён прадугледжвае заказчыкам па ўсіх відах работ Мінгарвыканкам, а насамарэч сярод заказчыкаў СТАА «Імпэкссэрвіс», ЗП «Рубіроз-Інтэрнэшнл» ТАА, ТАА «Сулона», ТАА «ТаПаС»... І гэта далёка не поўны пералік арганізацый-заказчыкаў, што працуюць у гістарычным цэнтры.

**Артур КЛІНАЎ, мастак, пісьменнік:** Хацеў бы ўзняць праблему, якая будзе больш і больш актуальнай з кожным годам. Вядома, што акрамя гістарычнай часткі цэнтр Мінска мае яшчэ адну, якая па значнасці для сусветнай культуры, можа, пераважае першую.



Фота Валерыя КУДРАКОВА.

Гэта забудова галоўнага праспекта, якая часткова была створана ў 30-ыя гады ў стылі канструктывізму і працягвалася пасля вайны. Праспект і прылеглыя да яго вуліцы — абсалютна ўнікальны горадабудаўнічы ансамбль, які метафарычна можна назваць Горад Сонца. Тое, да чаго праявіла цікавасць ЮНЕСКА. Але мы можам яго вельмі хутка страціць. Вядома, ён не будзе зносіцца, але ёсць спробы ўваходу ў гэтую зону новага сучаснага будаўніцтва, якое папросту знішчыць усю ўнікальнасць Горада Сонца. Я маю на ўвазе планы будаўніцтва 30-павярховага гатэля «Кемпінскі». А калі ўлічыць, што ён будзе бачны з любога пункта цэнтра горада, то знішчыцца не толькі ансамбль праспекта, але і Старога горада. «Першая ластаўка» праяўляецца ў двары каля так званага «дома пад шпілем». Панарама ўжо абсалютна іншая. Трэба паставіць пытанне наконт будаўніцтва на тэрыторыі былога тралейбуснага дэпо. Прыходзяць інвестары, якія могуць збудаваць там хмарачосы. У Горадзе Сонца ёсць дваровыя тэрыторыі, якія будуць з'яўляцца смачным кавалачкам для інвестараў. Але ўсё, што будуецца, мусіць быць падпарадкавана ўсяму ансамблю, а не супярэчыць яму. Таму трэба прызнаць унікальнасць Горада Сонца, распрацаваць канцэпцыю яго развіцця. Ужо ў бліжэйшай перспектыве ён можа стаць выключным турыстычным брэндам. Да прыкладу, у Прагу прыязджае каля мільёна турыстаў у месяц!!! Уявіце, якія грошы мае ад гэтага дзяржава. А ў Мінск наведваецца ўсяго 60—80 тысяч у год. Калі мы распрацуем канцэпцыю развіцця Горада Сонца як турыстычнага брэнда, гэта будуць зусім іншыя патокі і рэальныя штогадовыя інвестыцыі ў перспектыве. Сёння мы маем шанц зрабіць з Мінска адзін з самых унікальных гарадоў Еўропы, але хутка можам назаўсёды страціць гэты шанц, калі пойдзем на повадзе ў разавых забудоўшчыкаў.

**Бубноўскі:** Сапраўды, самае каштоўнае, што можа ўнесці Мінск у сусветную скарбонку архітэктурнай спадчыны, — гэта пласт архітэктуры савецкага перыяду, асабліва пасляваеннага. Даваенная савецкая архітэктура зрабіла Мінск сталіцай. Усе асноўныя атрыбуты сталічнага горада: Дом Урада, абсерваторыя, Акадэмія навук, стары будынак Нацыянальнай бібліятэкі і так далей — выкананы ў стылі савецкага канструктывізму. Такога больш не было нідзе. Але пасляваенная забудова бадай што больш каштоўная. Яна надзвычай прафесіянальная, і пагрозы страты яе вытанчаных мастацкіх якасцяў і сацыяльнай значнасці вызначаны вельмі правільна.

**Андрончык:** Цікавы аб'ект для турызму, калі яго разрэкламаваць. Умяшальніцтва ў гэтае асяроддзе недапушчальнае. Наконт будынка на месцы былога тралейбуснага дэпо — добра што мы знайшлі інвестара. Некалькі гадоў таму я ўдзельнічаў пры разглядзе аб'ёмнага рашэння на гэтым месцы. Поўнасцю была зроблена візуалізацыя ўспрыняцця будынка з праспекта, былі зробленыя разлікі, якія вызначалі вышыню. Што датычыцца гатэля на плошчы Кастрычніцкай, там ёсць кавалак пустой зямлі на мяжы з гістарычным цэнтрам. Ідзе працэс прапрацоўкі аб'ёмнага рашэння, яно яшчэ не вызначана.

**Папруга:** Калі выконваюцца закон, метадалогія і працэдура, то гарантаваная ад знішчэння ўся спадчына: гістарычны цэнтр, і Горад Сонца, і тое, што будзе пасля. Але калі ўжо больш за дзесяцігоддзе наверх ідзе інфармацыя, што знесці помнік і замяніць яго муляжом не ўяўляе праблемы, то зусім лагічным выглядае пратакол № 18 па зносе будынка былой Нацыянальнай бібліятэкі. Адказныя за гэта тыя людзі, якія «навукова абгрунтоўваюць» падобныя дзеянні, а не тыя, якія падпісваюць рашэнні.

## 4. Школа разумення

***— Старыя аб'екты, калі іх захаваць, могуць у перспектыве прынесці вялікія даходы ад турызму, якія могуць перасягнуць разавыя інвестыцыі. Людзі, якія едуць падарожнічаць у іншыя краіны, умеюць цаніць аўтэнтыку. Што аўтэнтычнага застанецца ў Мінску пасля рэканструкцыі?***

**Папруга:** Пасля выканання таго, што запланавана, застанецца ўсяго некалькі аўтэнтычных будынкаў: Бернардынскі жаночы і мужчынскі кляштары, былы комплекс Святадухаўскага кляштара, рэканструяваны ў XIX стагоддзі. Кафедральны касцёл, тое-сёе яшчэ. Але мы рызыкуем згубіць гістарычны цэнтр як з'яву. Тое, што робіцца зараз, — у пяці працэнтах з'яўляецца імітацыяй, а ў 95 працэнтах уяўляе сабой новае будаўніцтва, якога паводле закона тут не можа быць. Ацалелая ва ўсе войны і акупацыі шэраговая высакашчыльная гарадская забудова ў выніку сённяшніх супрацьпраўных дзеянняў беззваротна страчаная. Адзінае, што застанецца нашчадкам, — гэта пазней аднаўленне гістарычнай планіровачнай структуры.

**Бубноўскі:** Аўтэнтыка — складанае метадычнае паняцце. Я ў свой час дэталёва вывучыў матэрыялы канферэнцыі ЮНЕСКА, дзе разглядаліся праблемы аўтэнтыкі. Зараз амаль усе прамоўцы, якія вывучылі гэтае слова, у асноўным ведаюць толькі адзін аспект — аўтэнтыка матэрыялу, яго прасцей за ўсё зразумець і кантраляваць. Насамрэч аспектаў значна больш. Ёсць аўтэнтычнасць задумы, аўтэнтычнасць матэрыялу, аўтэнтычнасць майстэрства, тэхналогіі, аўтэнтычнасць асяроддзя і аўтэнтычнасць выкарыстання. У Спіс сусветнай спадчыны можа быць унесены аб'ект не аўтэнтычны паводле матэрыялу, але адноўлены дакладна па даследаваннях. Прыкладам можа стаць старое месца ў Варшаве, хаця яно ўключана ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА як помнік гісторыі. Калі б польскія спецыялісты ў свой час прымалі да ўвагі аргументацыю, якая гучыць у нашай сённяшняй дыскусіі, то гэтага «ганебнага навабуду» наогул не было б. Матэрыялы памянёнай мною канферэнцыі яскрава сведчаць, што многія народы і краіны разглядаюць аспекты аўтэнтычнасці ў рэчышчы вырашэння праблем, якія прыродай, гісторыяй, нацыянальным менталітэтам і нават рэлігійнымі светапоглядамі звязаны з захаваннем менавіта іх спадчыны. На мой погляд, гэта самы правільны падыход, падыход гаспадара.

**Жых:** У гістарычным цэнтры Мінска мы імкнёмся захаваць аўтэнтыку і асобных помнікаў, і планіровачных структур забудоў. Цяжка казаць, наколькі ў працэнтных адносінах захаваўся Верхні горад. Але яго планіровачная структура ў радыяльным і дыяганальным накірунках будзе захаваная і адноўленая за кошт новых аднаўляемых аб'ектаў. Тое ж самае можна сказаць пра прылеглыя тэрыторыі (вуліцы Гарадскі Вал, Інтэрнацыянальная, плошча Свабоды і часткова Няміга). Ёсць мэта аднавіць тое, што страчана на Ракаўскім прадмесці. Працуем над вызначэннем старажытнага горадаўтваральнага аб'екта — Мінскага гарадскога замчышча. Мы не толькі захоўваем лакальныя аб'екты, але дапамагаем удыхнуць у іх жыццё метадам рэстаўрацыі. Колькі адкрыццяў было за апошнія чатыры гады: у Езуіцкім касцёле, у Петрапаўлаўскім саборы, пры распрацоўцы царквы Святога Духа. Паглядзіце на цэлы вугал вуліц Камсамольскай, Інтэрнацыянальнай — вядома цяпер, які ён быў у слаўныя гады працвітання, калі там былі даходныя дамы, колькі там было цудоўных архітэктурных элементаў, дэкору, прыгажосці. Вось дзе аўтэнтыка. Яна не ў тым разуменні, якое ўкладваем сёння, а ў лепшым існаванні свайго часу. Асноўная каштоўнасць у тым, што горад атрымае аднаўленне спадчыны і гісторыі.

**Папруга:** На мой погляд, ніводная сённяшняя «новабудоўля» на тэрыторыі гістарычнага цэнтра ніводным сваім фрагментам не аднаўляе «гістарычнай планіровачнай структуры». Як вядуцца працы, калі дагэтуль не зацверджаныя ахоўныя зоны і няма гісторыка-архітэктурнага апорнага плана?

**Жых:** Ёсць гістарычны зрэз на XVI стагоддзе, на сярэдзіну XVII, на XVIII, XIX. Ёсць нават, нарэшце, здымкі горада 1941 года, якія рабіў Фрыц Кок з аэраплана. Што вы маеце на ўвазе пад паняццем гісторыка-архітэктурнага плана?

**Папруга:** Гісторыка-архітэктурны апорны план — гэта ў першую чаргу вынік комплексных навуковых даследаванняў, гэта матрыца, на падставе якой можна нешта планаваць, без яго не можа распрацоўвацца і праект дэталёвага плана. Вы казалі пра конкурс, праведзены ў 2004 годзе. Але ніводзін з аўтарскіх калектываў падчас правядзення конкурсу не атрымаў ні гістарычнай даведкі, ні архітэктурна-гістарычнага апорнага плана нават у выглядзе «ілюстрацыі». Як у такіх умовах можна было праектаваць будучыню гісторыка-культурнай каштоўнасці першай найвышэйшай нацыянальнай катэгорыі? А падаткаплацельшчыкам гэтая імітацыя «рэканструкцыі з рэстаўрацыяй» каштавала 150 мільёнаў рублёў.

**Жых:** Уся праца, якая вядзецца, не закрытая, інфармацыя пра распрацаваныя праекты таксама абсалютна даступная. Як быў даступны і конкурс для ўсіх. Той, хто зацікаўлены, дае свае прапановы. Зараз, напрыклад, абвешчаны конкурс на лепшае функцыянальнае прызначэнне кляштара касцёла святога Юзафа і Бернардынскіх манастыроў, на праектаванне пешых мастоў праз Свіслач. І прыйшлі да нас сотні лістоў ад звычайных людзей. А дзе Таварыства аховы помнікаў?

**Папруга:** Таварыства па ахове помнікаў падрыхтавала праект па рэгенерацыі гістарычнага цэнтра Мінска разам з апорным планам, з прапановамі вырашэння транспартных праблем у межах усяго планіровачнага ядра сталіцы і без усялякіх «праколаў», якія б толькі нанеслі шкоду, параўнальную са знішчэннем гістарычнай Нямігі. Шэсць гадоў працы пайшло на гэта...

**Астаповіч:** Тое, што зараз робіцца з помнікамі ў горадзе, якраз не прыцягвае турыстаў, а адштурхоўвае. Не дапамогуць тут ні «Еўропа» з «Кемпінскі». Няхай планы і жаданне дзяржавы заслугоўваюць увагі, але планы — гэта адно, і зусім іншае тое, як яны рэалізоўваюцца. І калі так пойдзе далей, то праз пару гадоў гістарычны цэнтр можа стаць аўтэнтычна стэрыльным.

**Бубноўскі:** Я лічу, што ўсё-такі шмат што ўдасканальваецца. Мінск вярнуў архітэктурную дамінанту цэнтра горада — вежы Марыінскага касцёла (былога езуіцкага). Адноўлена гарадская ратуша. Рэстаўраваны і рэканструяваны будынак былога гасціннага двара (так званы «Дом Шменкеля»). Тое, што яго ацалелыя канструкцыі захаваны, — гэта вынік тытанічнай працы праекціроўшчыкаў і будаўнікоў. Тэхнічны стан названага аб'екта да рэстаўрацыі быў больш чым жахлівы. Але што звычайна атрымліваюць архітэктары, канструктары, інжынеры, будаўнікі і рэстаўратары па выніках сваіх намаганняў? У матэрыяльным плане бясспрэчныя страты, — сённяшняя сістэма цэнаўтварэння ў будаўнічай сферы нават на палову не ўлічвае дадатковых затрат працы ў рэстаўрацыі ў параўнанні з новым будаўніцтвам. У плане ўласнай бяспекі і псіхалагічнага камфорту — цяжар адказнасці за прынятыя і рэалізаваныя нестандартныя канструкцыйныя і тэхнічныя рашэнні. Нягледзячы на гэта, яшчэ ў савецкі час знаходзіліся людзі, якія ўсё ж выконвалі свой маральны абавязак перад памяццю продкаў і нацыянальнай спадчынай. Больш за тое, у Беларусі пачала складвацца свая вельмі неблагая рэстаўрацыйная школа. Крыж на гэтым працэсе быў пастаўлены ў постперабудовачны перыяд, калі моднае агульнае абвінавачванне ўсіх, хто нейкім чынам займаўся практычнай аховай і рэстаўрацыяй спадчыны, ва ўсіх смяротных грахах і злачынствах перапоўніла чашу цярпення. Баюся, што нацыянальнай рэстаўрацыйнай школы ўжо не існуе. Зараз у «Мінскпраекце» паводле заказу «Мінскай спадчыны» распрацоўваецца дакументацыя па цэлым шэрагу аб'ектаў гістарычнай забудовы. Большасць спецыялістаў, якія гэтым займаюцца, не маюць або маюць недастаткова вопыту ў пытаннях рэстаўрацыі і вымушаныя асвойваць яе спецыфіку на працоўных месцах. Непазбежныя пры гэтым хібы і недасканаласці тут жа раздуваюцца ў чарговыя скандалы. Заганнае кола замкнулася.

**Папруга:** Людзі разбягаюцца з рэстаўрацыі, таму што сучасная практыка нічога агульнага з рэстаўрацыяй не мае. Якія аб'екты на тэрыторыі гістарычнага цэнтра робяцца рэстаўратарамі? Такім чынам кампраметуецца паняцце рэстаўрацыі, нягледзячы на тое, што самі рэстаўратары, як правіла, не маюць да гэтага ніякага дачынення. У рэстаўрацыі сёння шмат хібаў. Да таго ж наш закон прадугледжвае адказнасць за парушэнне рэстаўрацыйных нормаў.

**Жых:** У галіне працы на гістарычных аб'ектах спадчыны заканадаўства дзейнічае ў розных напрамках. Сапраўды, мы не маем дастатковых інтэлектуальных і працоўных рэсурсаў на сёння для больш хуткага правядзення работы, вымушаны іх выхоўваць. Дзеля гэтага мы падрыхтавалі шэраг прапаноў у органы кіраўніцтва і ў Адміністрацыю Прэзідэнта. Патрабуе ўдакладнення з улікам часу нарматыўная база, шмат што прыйдзецца перагледзець у заканадаўстве. На помніках спадчыны мы працуем у рамках фарміравання кантрактных цэнаў, што на мой погляд абсурдна. Канструктыўны пачатак дзейнасці накіраваны на ўдасканаленне ўсёй справы і стварэнне ўмоў, каб у гэтую галіну прыйшлі людзі з вачамі, якія гараць, і шчыра хацелі б ствараць, нешта адрэстаўраваць і захаваць для нашчадкаў.

**Андрончык:** Кожны з нас хоча бачыць Мінск прыгожай сталіцай. Акрамя нашых жаданняў ёсць заканадаўства, ёсць органы, якія кантралююць гэтыя працэсы. Добра, што ёсць і такія нераўнадушныя людзі, якія прымушаюць уладу сачыць за тым, каб выконвалася заканадаўства.

**«Круглы стол» правяла Ларыса ЦІМОШЫК.**





# ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ

### СТРАЛЬЦОЎ І СЕНА

Міхась Стральцоў прыдумаў вобраз чалавека шасцідзесятых гадоў мінулага стагоддзя, укладаўся той вобраз у словы «сена на асфальце». Здавалася, ніякай загадкі ў тым вобразе няма. Вясковыя хлопцы і дзяўчаты прыехалі з вёсак у гарады і жывуць на тым асфальце з сентыментальнымі ўспамінамі пра бацькоўскія вёскі. Толькі трэба ведаць Стральцова, каб расчытаць вобраз. Трэба ведаць пра ягонае заўсёднае захапленне французскай літаратурай і жывапісам імпрэсіяністаў. «Стог сена» Клода Монэ згадваецца адразу. А вось назва рэчкі, што цячэ праз Парыж, схавана ў стральцоўскім вобразе значна глыбей. Але і Сена, і «Стог» у вобразе, створаным Міхасём Стральцовым, безумоўна, ёсць. Адкрыў я тое зусім выпадкова. Ішоў па вуліцы, з якой рабочыя здымалі асфальт і закладалі ходнікі пліткаю. Побач стракаталі сваімі апаратамі газонакасільшчыкі. Згадаўся Стральцоў, згадалася нашая размова пра непатрэбнасць юбілейных банкетаў і штучнасць вялікіх помнікаў. Згадваючы Стральцова, я прайшоў з пляца Перамогі да маста праз Свіслач. Менавіта на мосце я і здагадаўся пра Сену. Падумалася: тут Свіслач зроблена такой шырокаю, не раўнуючы яна Сена. Загадка Стральцова разгадалася. Вобраз «сена на асфальце» раскрыўся. Цяпер я зразумеў, як спрацоўвала спружына падтэкстаў, закладзеная ў вобразе. Горад у стральцоўскіх словах быў не толькі асфальтам, не толькі горадам, дзякуючы слову «сена» ён рабіўся вялікай сталіцаю, рабіўся сталіцаю ўсяго свету.

### ЯБЛЫЧНІЦА І ГАРЭЛКА

Нельга мне хадзіць на кірмаш. Усім можна і трэба, а мне забаронена. Ведаю! Але ж усе туды ідуць, свята заўтра, усім нешта нейкае трэба да святочнага стала, і мяне цікаўнасць зацягнула ў гандлёвыя рады на Камароўскі кірмаш. Стаю, рукі ў кішэнях, і разглядаю прадавачку яблыкаў. Якіх толькі яблыкаў у яе няма!? Смачна-чырвоныя, салодка-жоўтыя, гладка-зялёныя... Выбірай, купляй, частуйся... Не! Яблыкі мяне не зацікавілі, а сама яблычніца зацікавіла моцна. Гладкатварая, галаплечая, васількававокая, ружавагубая... Варта яе выбраць, і варта ёю пачаставацца. Ды без гарэлкі яе не спакусіш, без гарэлкі яе не возьмеш. Тутака мне і захацелася гарэлкі, ды так, што свет пацямнеў, счарнеў свет, і пяты мае зазудзелі. Ледзь не самлеў я, гледзячы на велікацелую яблычніцу. Сцяўся ўвесь, рукі з кішэняў дастаў і сышоў з Камароўкі, так нічога і не купіўшы. Ну, нельга мне туды хадзіць, нельга, і ўсё тут.

### НАСТА І СОРАМ

Закахаліся ў цябе, дык парадуйся. Не атрымлівалася радавацца, бо сорамна мне было за яе і за сябе, чамусьці. Як толькі ўбачу Насту, так і чырванею. Яна мне вершы пісала, выдатныя вершы, цалкам прыстойныя, а мне ўсё адно было сорамна, асабліва за пазначанае прысвячэнне. Наста мне зусім не падабалася. Іншым яна падабалася, а мне дык не. Я ў ёй бачыў толькі адмоўнае: нямытая галава, акуляры на ўвесь твар, кароценькія ручкі, тоўстыя лыткі, шырокі крыж. Хто што ў ёй знаходзіў? Не пытаўся, бо саромеўся прызнавацца пра нашыя скасабочаныя ўзаемаадносіны. Пра какетлівасць Насты можна складаць кепскія песні. Яна пачынала гаварыць дзіцячым галаском, памахваць ручкамі і прысядаць. Ад такога інфантыльнага какецтва каго заўгодна сорам возьме. Як Наста раскахалася, я не ведаю, але падыходзіць да мяне яна перастала, і вершы яна кінула. Вершаў шкада, але сябе шкада значна больш.

### СІТНІК І КРАСОЎКІ

Выдатны чалавек Валодзька Сітнік, залаты чалавек. Дапамагаў ён мне шмат разоў, ды я яму ўдзячнасцю сплочваў. Так мы і жылі і дапамогі свае не рахункавалі. Яму нешта нейкае спатрэбіцца — ён тэлефануе; у мяне надарыцца нявыкрутка — я да яго бягу па параду і падтрымку. Аднойчы мы выпадкова сустрэліся на праспекце, узрадаваліся, пайшлі ў бар, гарэлкі замовілі. Сядзім, гаворка ідзе. Адчуваю, штосьці ў Сітніку змянілася, нешта нейкае перакулілася-перавярнулася. Агледзеў я Валодзьку з ног да галавы. Новыя красоўкі на Сітніку з'явіліся. Белыя, чыстыя, толькі што купленыя; паглядзеў я на тыя красоўкі ўважліва і зразумеў: больш мы не сябры. Можаш мне сказаць, што прычына зусім і не ў белых красоўках. Спрачацца не стану. Нашто? Мы даўно не сябруем і не бачымся, нават выпадкова не сустракаемся, і не тэлефануе ён мне. Я мог бы патэлефанаваць яму, але нешта нейкае стрымлівае. Я нават ведаю, што мяне трымае: мяне стрымлівае ўспамін пра тыя белыя красоўкі на Сітніку.

### ЯНА І КАРЦІНА

«Ты куды?» — «У студыю!» — «Зноў да сваіх голадупых дзевак, да сваіх інтэлектуальных мышэй? Добра, я цябе адпускаю. Ідзі, глядзі і пішы шэдэўр! Калі ты не напішаш шэдэўр, больш я цябе не адпушчу! Ты мяне чуеш?» — «Безумоўна...» Пайшоў я ў студыю і пачаў новую карціну. Захапіўся так, што на наступны дзень не пайшоў на працу. Карціна ў мяне атрымалася. Так бывае, што здольнасці супадаюць з жаданнямі, а майстэрства хапае роўна на столькі, каб не сапсаваць палатно і своечасова спыніцца. Сам сабе я даўно не веру, сам сябе я навучыўся падманваць, таму запрасіў у студыю Сцяпана, каб ён сказаў колькі слоў пра палатно. «Больш не чапай! Добра? У мінулы раз ты сапсаваў палатно. У цябе атрымалася, а ты пачаў дапрацоўваць і знішчыў усё найлепшае. Цяпер спыніся, замоў дарагую раму. Не металёвую акантовачку, а шырокую багетавую музейную раму трэба зрабіць...» Каб замацаваць поспех, пачаў новае палатно. Цяпер я ведаю, як трэба! Цяпер... Нічога ў мяне не выйшла. Быццам і не я маляваў добрую карціну, нібыта нехта іншы яе намаляваў. Ну чаму так? Цяперака давядзецца зрабіць дзесяць пасрэдных палотнаў. Нідзе не дзецца. Сябе я падмануць змагу, але гледача не падманеш. Адно ў гэтай гісторыі добра: калі яна спытае: «Ты куды?» — скажу: «У студыю! Пайду пісаць кепскія карціны з выдатных натуршчыц!» Я ж маю поўнае права на дзесяць пасрэдных карцін.



### ЖОНКА І ДУШ

Стаю пад душам, а жонка нешта расказвае. Яна накладае белую маску на твар і гаворыць-гаворыць. Слоў я разабраць не магу. Стаю пад прахалоднымі струменямі, а жонка, стоячы перад вялікім люстэркам, мне пра нешта распавядае, а я не магу разабраць, пра што. Калі што важнае, дык яна абавязкова паўторыць расповед за сняданкам. Праз тры гадзіны жонка паляціць здымаць прыгажуню Вікторыю ў Версалі. Праз шапаценне вады я чую слова «Версаль». Я праз паўгадзіны пайду ў студыю дапісваць чарговую грызайль. Апошнім часам мяне захапляе сціпласць грызайлі. Сваю апошнюю працу я так і назваў — «Мадам Грызайль». Шуміць, шуміць, шуміць вада.

**Адам ГЛОБУС.**

# «Беларусь спартыўная»

**Фотавыстаўка «Беларусь спартыўная» адкрылася сёння ў Мінску ў Міністэрстве інфармацыі Беларусі. На ёй прадстаўлена амаль 100 здымкаў, зробленых фотакарэспандэнтамі Беларускага тэлеграфнага агенцтва на буйнейшых спартыўных форумах, уключаючы Алімпійскія гульні, чэмпіянаты свету і Еўропы, а таксама на розных аматарскіх спаборніцтвах — «Мінская лыжня», «Залатая шайба», «Скураны мяч»...**

Міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч, які адкрыў фотавыстаўку, адзначыў яе актуальнасць у сувязі з Годам здароўя ў Беларусі і Алімпіядай у Пекіне. Ён заклікаў наведвальнікаў экспазіцыі перажываць за беларускіх атлетаў. «Мы, зразумела, прытрымліваемся прынцыпу «Няхай пераможа мацнейшы!», але, думаю, тут усе мяне падтрымаюць, калі я пажадаю, каб у 26 відах спорту, дзе выступяць нашы суайчыннікі, мацнейшымі аказаліся беларусы. Глядзіце, атрымлівайце асалоду, пераймайце. Няхай гэта выстаўка працуе на здароўе нашага грамадства», — сказаў міністр.

«Галоўным прынцыпам, па якому адбіраліся фатаграфіі для выстаўкі, было адлюстраванне эмоцый: станоўчых, адмоўных. Гэтыя эмоцыі — самае дарагое, што ёсць у спорце для балельшчыкаў і гледачоў. Дзеля іх мы запаўняем трыбуны стадыёнаў, ідзём у спартыўныя залы. Эмоцый мы чакаем і ад выступлення нашых спартсменаў на Алімпіядзе ў Пекіне. Спадзяюся, што наша выстаўка таксама зможа выклікаць у гледачоў толькі станоўчыя эмоцыі», — адзначыў генеральны дырэктар БЕЛТА Дзмітрый Жук.

**БЕЛТА.**

# ПОСПЕХІ ЗАЛЕЖАЦЬ АД ЛЮДЗЕЙ...

## Калектыў стаўбцоўскага філіяла УП «Мінскі маторны завод» адзначае 15-годдзе з дня заснавання прадпрыемства

**Раней Стаўбцоўскі раён лічыўся сельскагаспадарчым. Аднак як толькі ў 1993 годзе на яго зямлі пачаў сваю дзейнасць філіял «Мінскага маторнага завода», жыццё рэгіёна пачало змяняцца. У лепшы бок. Час тады быў не вельмі лёгкім для ўсёй эканомікі краіны, таму развівацца прадпрыемству спачатку было цяжкавата. Зараз аб гэтым узгадваюць як аб нечым незвычайным, бо ўжо даўно завод толькі нарошчвае свае магутнасці. 31 ліпеня споўнілася пятнаццаць гадоў, як на філіяле пачаўся выраб прадукцыі. За гэты час прадпрыемства паспела ператварыцца ў горадаўтваральнае, якое забяспечвае надзейнай, прэстыжнай, добра аплатнай працай мясцовых жыхароў. Аднак, як вядома, проста так поспехі не прыходзяць. Як падкрэсліваюць тут, заслуга развіцця цалкам належыць дружнаму калектыву. А для таго, каб людзі маглі і, галоўнае, жадалі вынікова працаваць, кіраўніцтва працягвае ўдасканальваць сацыяльную сферу на прадпрыемстве. Звычайна перад юбілеямі прынята падводзіць вынікі: што адбываецца на філіяле зараз, чым можна ганарыцца? Гэта мы і высвятлялі...**



Дырэктар філіяла УП «ММЗ» у Стоўбцах Анатоль МОЛЧАН.

Дырэктар філіяла УП «Мінскі маторны завод» у г. Стоўбцы Анатоль Молчан аб сакрэтах, якія дапамагаюць рухацца прадпрыемству наперад, кажа наступным чынам: «Галоўнае — гэта мікраклімат у калектыве. Калі ён станоўчы, работнікі дружныя паміж сабой і задаволены ўсімі ўмовамі, то і будуць працаваць паспяхова. Тады і вытворчасць будзе развівацца без праблем».

**— Анатоль Васільевіч, у чым галоўная задача завода зараз?**

— На забеспячэнне галаўнога прадпрыемства «Мінскі маторны завод» прыходзіцца практычна 82 працэнты ўсяго аб'ёму вытворчасці нашага філіяла. І гэта невыпадкова, бо ў сувязі з пашырэннем выпуску рухавікоў на ММЗ магутнасцяў не хапала, таму і было прынята рашэнне аб стварэнні філіяла ў Стоўбцах. Адзначу, што планы былі ў 1985 годзе, калі пачалося ўзвядзенне памяшканняў, вялікія... Адразу ж, як пачалі працаваць, сутыкнуліся са шматлікімі праблемамі. Сёння іх няма, мы канвеер забяспечваем. Тым больш, зараз галаўное мінскае прадпрыемства вызваляе свае магутнасці і плошчы пад выраб рухавікоў класа Еўра-3. Таму не выключана, што і яшчэ адна частка яго вытворчасці будзе пераведзена да нас. Гэта выгадна, бо ад нашага філіяла да Мінска кароткі транспартны шлях.

**— Аднак, напэўна, вы працягваеце пашыраць выраб і ўласнай прадукцыі, а не толькі камплектацыі для рухавікоў?**

— Так, ужо прыкладна сем гадоў, як мы робім акцэнт на развіццё кампрэсарнай вытворчасці. У прыватнасці, у рэспубліцы мы адзінае прадпрыемства, якое вырабляе перасоўныя кампрэсарныя станцыі. Спачатку было цяжкавата, але з цягам часу клопаты абярнуліся добрымі вынікамі. Зараз патрэбы ў Беларусі намі запоўнены, і самае галоўнае цяпер — выйсці з гэтай уласнай вытворчасцю на знешні рынак.

**— Раскажыце пра вынікі работы прадпрыемства...**

— Усе леташнія прагнозныя паказчыкі выкананы. За першае паўгоддзе павялічылі вытворчасць яшчэ на 15 працэнтаў, і працягваем выконваць планы. Спраўляемся і з павелічэннем вырабу капрэсарных станцый. Вытворчасць неабходных людзям тавараў народнага спажывання павялічылася на 11 працэнтаў. Акрамя таго, яшчэ мы забяспечваем цяплом увесь горад. Увогуле, я не бачу праблем для выканання акрэсленых задач. І рэзервы для развіцця яшчэ ёсць. Па заработнай плаце ідзём на высокім узроўні, у сярэднім за чэрвень яна склала 1 млн 123 тыс. рублёў. Падкрэслю, што сёння і кадры дазваляюць рэалізоўваць усе ідэі. Прадпрыемства маладое, і ўзростам уласным, і узростам рабочых — у сярэднім ім па 37 гадоў. Зараз з усяго калектыву 80 працэнтаў спецыялісты. Акрамя таго, вучым моладзь па заключаных дагаворах. Мы даём ім напрамак у жыццё — гарантуем працаўладкаванне. Наш інтэрнат дазваляе забяспечыць месцамі ўсіх. У планах — павінны пабудаваць два домікі па 40 кватэр толькі для сваіх работнікаў.



Многія працаўнікі завода атрымалі магчымасць пражываць непадалёку ад вытворчасці ў інтэрнатах прадпрыемства. Да іх сучасных карпусоў мы пад'ехалі сярод працоўнага дня, таму тут сустрэлі толькі тэхнічны персанал ды дзятву. Загадчык інтэрната Зінаіда САВІЦКАЯ правяла нас па ўсіх паверхах, паказала залу для дзіцячых гульняў і заняткаў спортам, дазволіла завітаць у адзін з жылых пакояў.

Размовы аб гэтым ідуць дастаткова даўно і мясцовая ўлада абяцала пачаць будаўніцтва ЖБК «Завадчанка» ў гэтым годзе і здаць у 2009 годзе. І праблемы з жыллём у бліжэйшыя гады не стане.

**— Што скажаце ў якасці віншавання?**

— Я ўдзячны калектыву. Ведаеце, можна мець на заводзе імпартнае, суперсучаснае абсталяванне, але калі няма людзей, то і карысці вялікай з яго не будзе. Людзі тут цудоўныя, таму і ўзровень нашага філіяла ўзрастае. Кожны цягнецца да парадку на прадпрыемстве. Таму я думаю, што сёння самае галоўнае, што мы зрабілі — памянялі псіхалогію калектыву. І гэта не толькі маё меркаванне. Таму што раней ён не быў сфарміраваны. Сёння ўсе ведаюць сваю задачу і імкнуцца яе выканаць. Але для гэтага трэба, каб работнікі былі зацікаўлены ў сваёй дзейнасці. І вось таму неабходна ствараць належныя сацыяльныя ўмовы. Чым мы і займаемся вельмі актыўна...

Якія ж умовы створаны за апошнія гады для працоўных на заводзе? Першнаперш мы пачалі высвятляць з інтэрната. Ён складаецца з двух корпусаў, агульная колькасць месцаў у іх каля васьмісот. Зараз тут занятыя крыху больш за 760. Інтэрнат сустракае рамонтнымі работамі, а яшчэ... вялікай колькасцю дзіцячых калясак у холе. Яны яркія — розных памераў, усіх колераў вясёлкі. Налічылі мы іх каля дваццаці. «І гэта яшчэ мала, вы б паглядзелі, што тут раніцай адбываецца, — пасміхаецца загадчыца **Зінаіда Савіцкая**. — У нас жывуць каля 250 дзяцей узростам да сямнаццаці гадоў. Толькі за першае паўгоддзе сем дзетак нарадзілася, і зараз яшчэ двое. Інтэрнат малады і вясёлы».

Бягучы рамонт таксама не спыняецца — як толькі ўзнікае патрэба, праводзяць яго ў пакоях для халасцякоў, у грамадскіх памяшканнях. Кухні аднаўляюць, плітку, дзверы, вокны мяняюць. Клеюць новыя шпалеры, санітарныя вузлы прыводзяць у парадак. «Праблем асаблівых няма, але хочацца, як заўсёды, больш», — гаворыць Зінаіда Сафронаўна.



Што такое гэтае «больш» у інтэрнаце, адразу ж відаць. Калі ў актавай зале збіраюцца, каб не толькі агульны сход праводзіць, але і цікавыя мерапрыемствы кшталту «Мама, тата, я — спартыўная сям'я», выставы-конкурсы на самыя прыгожыя пакаёвыя кветкі. «Больш» — гэта яшчэ і ўласная спартыўная зала, дзе ўсе трэнажоры зроблены рукамі жыльцоў. Штангі, выраблены работнікамі завода, ад тых, што набываюць у спартыўных крамах, нічым не адрозніваюцца. Адразу ж відаць, што майстры працуюць. Гэта і дзіцячы пакой, у якім па чарзе дзяжураць маладыя бацькі — прыглядваюць за ўсімі інтэрнацкімі дзецьмі. А ў час школьнай вучобы для ўсіх цікаўных працуе яшчэ і кружок дзіцячай творчасці. Лепка, аплікацыя, самадзейнасць... Настаўнікі прыходзяць з дзіцячага дома творчасці і займаюцца ў дзве змены. І яшчэ, што, напэўна, самае галоўнае — на які б паверх ні зайшлі, кожны, хто праходзіць міма, абавязкова скажа, нават незнаёмцу: «Добры дзень».

— У інтэрнаце гэтая культура паводзінаў прынятая як дарослымі, так і дзецьмі. Можна па дзесяць разоў на дзень пачуць «прывітанне» і «да пабачэння». І кожнаму трэба адказаць. Усе бацькі такім чынам сваіх дзяцей выхоўваюць. І гэта вельмі прыемна, — кажа Зінаіда Савіцкая.

І калі, як бачым, за здароўе душэўнае можна не хвалявацца, то вось фізічны стан працоўнага чалавека — клопат не менш сур'ёзны. Па статыстыцы, на першае месца сярод прафесійных захворванняў людзей, якія працуюць па рабочых спецыяльнасцях, у свеце выходзяць праблемы з пазваночнікам. Гэта добра ўсведамляюць на заводзе, таму і набылі не так даўно для патрэб сваіх людзей імпартны ложак-масажор.

— Паталогія пазваночніка — асноўная прычына непрацаздольнасці. Астэахандрозы, радыкуліты шыйнага, груднога, паяснічнага аддзелаў — з гэтым дапамагае змагацца наша навінка, — распавядае загадчык здраўпункта **Анатоль Яхнавец**. — Зараз людзям не прыходзіцца ўжо ездзіць у паліклініку для праходжання спецыяльных працэдур, бо іх можна атрымаць на заводзе. Гэта ўжо і эканомія працоўнага часу. Акрамя таго, некаторыя нават могуць абыходзіцца без бальнічных лістоў, бо ім дапаможа масаж.

На медыцынскі пункт завода ў год прыходзіцца прыблізна 5—6 тысяч зваротаў. Працуе тут урач, чатыры фельчары, санітарка. Зараз уся апрацоўка дакументаў камп'ютарызаваная, што, згадзіцеся, спадручна. А яшчэ для таго, каб прайсці некаторыя абследаванні, рабочым не трэба ўжо ехаць у паліклініку. Бо тут з'явіўся апарат ультрагукавога даследавання ўнутраных органаў, а таксама электракардыёграф. І, каб канчаткова завяршыць абсталяванне здраўпункта, хочуць на заводзе ў бліжэйшы час яшчэ і ўласны стаматалагічны кабінет набыць.



Слесар Надзея ФІЛАТАВА нядаўна была ўзнагароджана медалём «За працоўныя заслугі».

Увогуле, дзейнасць прадпрыемства наладжана такім чынам, каб акрамя непасрэдна работы чалавек мог яшчэ і адпачыць і ўвогуле цалкам задаволіць уласныя патрэбы. На заводзе працуе бібліятэка, якая налічвае тысячы чатыры экзэмпляраў. Акрамя мастацкай літаратуры, ёсць тут і тэхнічная, у асобнае месца скрупулёзна збіраецца ўся гісторыя завода. Ёсць тут і ўнікальны дакумент, які з'яўляецца сапраўднай каштоўнасцю для гісторыі прадпрыемства — паведамленне аб выпуску і адгрузцы першых дэталяў, якія сышлі з канвеера філіяла. Паводле слоў памочніка дырэктара па выхаваўчай рабоце і сацыяльным развіцці **Віталя Шалькевіча**, у свет хутка выйдзе брашура, у якой паэтапна будзе расказана аб усіх значных падзеях з жыцця філіяла.

І, як паважаючае сябе і сваіх людзей прадпрыемства, працуе тут і ўласная крама, і сталовая. У апошнюю ездзіць харчавацца ўвесь горад, а святкаваць вяселлі і іншыя святы лічыцца вельмі прэстыжным. Бо сапраўды, і якасць, і кошт страў тут вельмі «смачныя».

Таму і невыпадкова, што людзі намагаюцца працаваць сумленна.

— У нашым цэху працуе каля двухсот пяцідзесяці чалавек. Наменклатура вырабаў вельмі вялікая, больш за 1000 найменняў. Некалькі сотняў з іх трэба без спынення пастаўляць на галоўны канвеер у Мінск, без затрымак, за якія зараз караюць вельмі строга. Памылак быць не павінна. Вось, за мінулы год намі не было дапушчана ніводнага з'ёму рухавікоў. Той жа ўзровень мы падтрымліваем і ў першым паўгоддзі сёлета, — прыводзіць прыклад намеснік начальніка цэха па вытворчасці **Ігар Луфер**. — Апошнія шэсць-сем гадоў на высокі ўзровень выйшла працоўная дысцыпліна. Выключана такая праблема, як з'яўленне на рабоце ў нецвярозым стане. Дысцыпліна працы і вельмі дакладная работа па забеспячэнні канвеера ММЗ наладжана, пачынаючы з 2000-х гадоў. І мы ўдзячныя, што і рамонт памяшканняў робіцца тэрмінова, і сталовая ёсць, і крама, і дастойныя ўмовы для працы. Я думаю, што чалавек, які мае добрае працоўнае месца, дастойныя ўмовы працы, пачуццё абароненасці — будзе працаваць з усім жаданнем.

Нездарма цэх па вытворчасці столькі гадоў падтрымлівае высокую марку. Яго работніца, слесар, якая працуе на прэса-гальванічным абсталяванні, **Надзея Міхайлаўна Філатава** сёлета атрымала з рук кіраўніка дзяржавы вельмі значную ўзнагароду — медаль «За працоўныя заслугі». Гэта вельмі высокая адзнака за працу і адносіны да справы. Працуе Надзея Міхайлаўна на «Мінскім маторным заводзе» пачынаючы з 1975 года. Давераны ёй зараз адзін з самых адказных участкаў, якасць працы на якім павінна быць найвышэйшай. Займаецца яна зборкай трубак нізкага ціску, фільтраў грубай ачысткі, трубак ціску. Аб'ём вытворчасці вялікі, непрафесіяналізм ці няўважлівасць тут недапушчальныя. Бо, калі, напрыклад, у дэталі створыцца працяканне, наступствы могуць быць сур'ёзныя. Таму і ставяць на гэтую работу самых вопытных і адказных — як Надзея Філатава:

— Мне, шчыра кажучы, вельмі прыемна, што кіраўніцтва завода адзначыла мяне, але не трэба забываць, што я самы звычайны чалавек. Калі мне далі медаль, усе людзі на прадпрыемстве, а таксама мае родныя, дачка і нават унучка радаваліся. Я дзякую калектыву за падтрымку, — распавядае гераіня. — На заводзе мяне ўсё задавальняе: і людзі, з якімі працую разам, і ўмовы. У апошнія гады яны і ў працы палепшыліся, і ўвогуле для нас ствараецца вельмі шмат. Безумоўна, работнікі адчуваюць клопат пра сябе і вельмі ўдзячныя за гэта. Усё ідзе да лепшага.

Дарэчы, да юбілею была абноўлена Дошка гонару філіяла, куды занесена ў тым ліку і Надзея Філатава.

Галаўное прадпрыемства (ММЗ г. Мінск) — адзінае ў Беларусі, якое стварае дызельныя рухавікі не толькі для трактароў, але і аўтамабільнай тэхнікі, у большасці для ГАЗа, ПАЗа, ЗІЛа. Таму яно цесна супрацоўнічае з расійскімі аўтабудаўнікамі. Вядома ж, што такія дзелавыя кантакты патрабуюць дадатковага ўдасканальвання тэхналогіі і абсталявання, таму што ўтрымлівацца на рынку зараз даволі складана, галоўны крытэрый на ім — разумная ўраўнаважанасць якасці і цаны. На гэта зараз і робіць стаўку стаўбцоўскі філіял. «Выбіраем абсталяванне з высокім тэхналагічным складнікам, сучаснае... Прыходзіцца лавіраваць на рынку. Напрыклад, плануем на наступны год набыць механізмы для лазернай рэзкі, а таксама станкі для рэзкі металу. Зараз у цэхах стаіць абсталяванне як беларускіх, так і замежных вытворцаў», — акрэслівае задачы галоўны інжынер **Уладзімір Дзіскант.**

І, як вядома, нізкага кошту прадукцыі немагчыма дасягнуць без вырашэння такога пытання, як наладжванне сістэмы энергазберажэння. Чым менш энергіі затрачваецца на выраб, тым менш будзе каштаваць і прадукцыя. Таму напрыканцы гэтага года на філіяле павінна быць запушчана ў работу міні-ЦЭЦ. Яе магутнасць у 4 МВт будзе забяспечваць энергіяй усю першую змену завода і часткова — другую і трэцюю. Рухавік міні-ЦЭЦ будзе працаваць на газе і рухаць генератар, які і вырабляе электрычнасць. А ў летні перыяд пры дапамозе так званай «вадзяной рубашкі» будзе атрымлівацца цяпло, якое пойдзе на гарачае водазабеспячэнне ўсяго горада. Кошт будаўніцтва — каля чатырох мільёнаў долараў. Але... Стаўбцоўскаму філіялу амаль не прыйдзецца выдаткоўваць на яго грошы. Тлумачыць Уладзімір Дзіскант:

— Мы ўпершыню ў рэспубліцы ажыццяўляем падобны сумесны праект — кацельную будзе будаваць прадпрыемства «Юніспектр», якое і выдаткоўвае асноўную частку сродкаў. Мы выдзелілі сваю плошчу, на якой яно пабудуе кацельню і будзе эксплуатаваць яе. Нашаму ж заводу яна будзе прадаваць энергію па кошце, ніжэйшым за тарыф прыблізна на 10 працэнтаў.

Уласна кажучы, праблема забеспячэння энергіяй выспела яшчэ даўно. Усё ў тым, што калі яшчэ пры Савецкім Саюзе было запланавана ўзвядзенне прадпрыемства, то адразу ж распачалося будаўніцтва і энергетычных аб'ектаў. Аднак, натуральна, па тагачасных планах завод быў разлічаны на магутнасці, якія ў некалькі разоў перавышаюць сённяшнія. Таму і ўсталявалі тады катлы, магутнасцю да 50 Гкал/гадз. З-за гэтага зараз, напрыклад, у летні час іх магутнасці выкарыстоўваюцца толькі на 30 працэнтаў. «Вялікі кацёл, такім чынам, зрабілі, а ўжывання для яго няма. Працуе ў неэканамічным рэжыме. Таму і прынята рашэнне — запусціць кацёл меншай магутнасці, зрабіць міні-ЦЭЦ. Такім чынам мы зэканомім і газ, і свае паказчыкі палепшым», — паведаміў галоўны інжынер.

І акрамя праграмы энергазберажэння, прадпрыемства не адстае ад часу і па іншых напрамках. Вядома, што асноўны партнёр — Расія, ужо перайшла на стандарт рухавікоў Еўра-3, таму і маторны завод таксама перастройваецца пад павевы часу. Першая партыя рухавікоў, згодна з гэтымі новымі патрабаваннямі на выкід шкодных элементаў у атмасферу, ужо пастаўлена на трактарны завод. Плануецца таксама зборка для МАЗа.

— Пад Еўра-3 была зменена тэхналогія, адбылося ўдасканальванне вытворчасці, таму што і дэталі некаторыя робяцца з большай дакладнасцю, і строга выконваюцца высокатэхналагічныя патрабаванні. Пераход на новы стандарт мы пачалі прыблізна год таму. Нашы далейшыя напрацоўкі — у будучым будзем вырабляць камплектуючыя для рухавікоў пад Еўра-4, — падкрэслівае галоўны тэхнолаг **Мікалай Гардзіевіч.** — Але на гэтым не спыняемся, у бліжэйшыя гады ўжо будзем рыхтавацца да пераходу на Еўра-4. Вядома, што Расійская Федэрацыя з 2010 г. пераходзіць на гэты стандарт. Будзем асвойваць тэхналогію вытворчасці чацвёртага пакалення класа «Еўра», таму на канец 2009 года ўжо можна чакаць такія рухавікі. Дарэчы, на Мінскім маторным заводзе ўжо адбылася прэзентацыя рухавікоў, якія адпавядаюць параметрам Еўра-4.

І калі новы стандарт будзе ўведзены толькі праз некалькі гадоў, то вось тое, што стаўбцоўскаму філіялу ММЗ перасоўныя кампрэсарныя станцыі могуць прыносіць добры прыбытак ужо сёння — факт несумненны. Як расказаў намеснік галоўнага дырэктара па эканоміцы і фінансавай рабоце **Віталь Суднік**, за паўгоддзе ўжо былі пастаўлены восемдзесят дзве кампрэсарныя станцыі магутнасцю перапрацоўкі паветра ў 6 м за хвіліну. І да сярэдзіны наступнага года з'явіцца новая мадэль магутнасцю ў 10 м . Прычым, калі камплектацыя для станцый раней пастаўлялася з Расіі, то зараз яе набываюць у Германіі, на вытворчасці адной з вядучых фірмаў. Акрамя ўнутранага рынку, вырабы ўжо трапляюць у Расію і ва Узбекістан. Сённяшняя задача — знайсці і заняць устойлівую нішу для імпарту. Зараз праца ідзе — вытворчасць павялічваецца, колькасць заказаў расце. І прадпрыемства валодае ўсімі магчымасцямі, каб падвоіць ці нават патроіць вытворчасць.

**Дзмітрый АЛЬФЕР, Алена ДАЎЖАНОК, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**



Галоўны тэхнолаг Мікалай ГАРДЗІЕВІЧ і галоўны інжынер Уладзімір ДЗІСКАНТ на пляцоўцы, дзе будуецца міні-ТЭЦ.



Гэты здымак зроблены ў аддзеле галоўнага тэхнолага. Кіраўнік гэтага падраздзялення Мікалай ГАРДЗІЕВІЧ сфатаграфаваўся разам са сваімі калегамі Аляксандрам САКОВІЧАМ, Паўлам КАЗЛОЎСКІМ, Мікалаем ЦЮШКЕВІЧАМ, Дзмітрыем ДАЛІДОВІЧАМ, Сяргеем ШЧЭЦЬКА, Аленай БАНДАРЭВІЧ, Дзмітрыем СЕМЕНЯКАМ, Анатолем ШАЎЧУКОМ.



У летнія дні тэрыторыю завода ўпрыгожваюць стракатыя кветнікі. Самым дасведчаным азеляняльнікам і дызайнерам вытворчага ландшафту лічаць Вольгу ПІСАРЧЫК.



Брыгадзір слесараў-сантэхнікаў Аляксандр ГРУЦА шмат зрабіў, каб на тэрыторыі завода з'явіліся вось такія прыемныя воку куточкі.



Фельчар Мая МАСТОЎСКАЯ ўмела спраўляецца з унікальным абсталяваннем для масажу, тэрапеўт Анатоль ЯХНАВЕЦ праводзіць сеанс ультрагукавой дыягностыкі, загадчык аптэкі Анастасія ПТАШНІК сустракае наведвальнікаў — гэта толькі некалькі штрыхоў да партрэта заводскай медыцыны.


МИНСКИЙ МОТОРНЫЙ ЗАВОД ФИЛИАЛ в г. СТОЛБЦЫ

Производит:

ДИЗЕЛЬНЫЕ ВИНТОВЫЕ КОМПРЕССОРНЫЕ СТАНЦИИ МАРКИ ММЗ

- Ресурс винтового блока, не менее 40000 моточасов.
- Привод от проверенного дизеля Д243 производства ПРУП «ММЗ».
- Плавное соединение дизельного двигателя с компрессором через корзину сцепления.
- Возможность эксплуатации в любых климатических условиях.



Технические характеристики дизельной винтовой компрессорной станции ММЗ

| Марка | ММЗ-03-ПВ6/0,7-А |
|---|---|
| Производительность, м³/мин | до 6,0 |
| Рабочее давление, атм | 7,0 |
| Привод | Дизель жидкостного охлаждения, Д-243 |
| Расход топлива, кг/ч | до 9,2 |
| Габариты (длина, ширина, высота), мм | 3350х1725х1985 |
| Масса, кг | 1450 |

Используется как автономный источник сжатого воздуха при производстве строительных и дорожных работ.

ПРУП «Минский моторный завод» филиал г. Столбцы
222660 Республика Беларусь, Минская обл.
г. Столбцы, ул. Машиностроителей, 1
Тел.: (+375 01717) 5 61 02, 5 74 22
www.filial-mmz.belhost.by e-mail: filial-mmz@tut.by


УНН 600827822

Закон Рэспублікі Беларусь

# АБ ВЫКАРЫСТАННІ АТАМНАЙ ЭНЕРГІІ

*(Заканчэнне.
Пачатак у нумарах за 2 і 5 жніўня).*

**Артыкул 8. Паўнамоцтвы органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў галіне выкарыстання атамнай энергіі**

Органы мясцовага кіравання і самакіравання ў галіне выкарыстання атамнай энергіі ў межах сваёй кампетэнцыі:

арганізуюць і прымаюць удзел у абмеркаванні пытанняў у гэтай галіне з удзелам грамадскіх аб'яднанняў, іншых арганізацый і грамадзян;

прымаюць удзел у мерапрыемствах па забеспячэнні абароны грамадзян і аховы навакольнага асяроддзя ад уздзеяння іанізуючага выпраменьвання, якое перавышае межы, устаноўленыя тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі ў галіне выкарыстання атамнай энергіі;

ажыццяўляюць кантроль у межах адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі за гатоўнасцю арганізацый і грамадзян да дзеянняў у выпадку ўзнікнення радыяцыйнай аварыі пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі;

прымаюць удзел у ліквідацыі, абмежаванні або зніжэнні наступстваў радыяцыйнай аварыі, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі;

інфармуюць грамадзян праз мясцовыя сродкі масавай інфармацыі аб радыяцыйным становішчы ў межах адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі;

ажыццяўляюць іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

**Артыкул 9. Асаблівасці тэхнічнага нармавання, стандартызацыі і пацвярджэння адпаведнасці ў галіне выкарыстання атамнай энергіі**

Тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты ў галіне выкарыстання атамнай энергіі зацвярджаюцца па ўзгадненні з дзяржаўнымі органамі па рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі.

Абсталяванне, вырабы і тэхналогіі для аб'ектаў выкарыстання атамнай энергіі падлягаюць пацвярджэнню адпаведнасці згодна з заканадаўствам.

**Артыкул 10. Ліцэнзаванне ў галіне выкарыстання атамнай энергіі**

Ліцэнзаванне ў галіне выкарыстання атамнай энергіі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства аб ліцэнзаванні.

**Артыкул 11. Дазволы на права вядзення работ пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі і патрабаванні, што прад'яўляюцца да работнікаў (персаналу)**

Выкананне пэўных відаў работ ажыццяўляецца работнікамі (персаналам) эксплуатуючых арганізацый і арганізацый, якія выконваюць работы і (або) аказваюць паслугі пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, пры наяўнасці ў гэтых работнікаў (персаналу) дазволаў на права вядзення работ пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, якія выдаюцца ўпаўнаважаным дзяржаўным органам па рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі.

Пералік відаў работ, на ажыццяўленне якіх работнікам (персаналу) арганізацый, указаных у частцы першай гэтага артыкула, неабходна атрыманне дазволаў на права вядзення работ пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, патрабаванні, якія прад'яўляюцца да гэтых работнікаў (персаналу), у тым ліку аб кваліфікацыі, узроўні адукацыі, падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы, а таксама парадак атрымання ўказаных дазволаў вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Пералік медыцынскіх проціпаказанняў і пералік работ, на якія распаўсюджваюцца дадзеныя проціпаказанні, а таксама патрабаванні да правядзення медыцынскіх аглядаў і псіхафізічных абследаванняў вызначаюцца заканадаўствам.

## ГЛАВА 3
## АБЫХОДЖАННЕ З ЯДЗЕРНЫМІ МАТЭРЫЯЛАМІ, АДПРАЦАВАЎШЫМІ ЯДЗЕРНЫМІ МАТЭРЫЯЛАМІ І (АБО) ЭКСПЛУАТАЦЫЙНЫМІ РАДЫЕАКТЫЎНЫМІ АДХОДАМІ

**Артыкул 12. Дзяржаўны ўлік і кантроль ядзерных матэрыялаў, адпрацаваўшых ядзерных матэрыялаў і эксплуатацыйных радыеактыўных адходаў**

Ядзерныя матэрыялы, адпрацаваўшыя ядзерныя матэрыялы падлягаюць дзяржаўнаму ўліку і кантролю ў дзяржаўнай сістэме ўліку і кантролю ядзерных матэрыялаў Рэспублікі Беларусь.

Эксплуатацыйныя радыеактыўныя адходы падлягаюць дзяржаўнаму ўліку і кантролю ў адзінай дзяржаўнай сістэме ўліку і кантролю крыніц іанізуючага выпраменьвання.

Парадак вядзення дзяржаўнай сістэмы ўліку і кантролю ядзерных матэрыялаў Рэспублікі Беларусь, а таксама адзінай дзяржаўнай сістэмы ўліку і кантролю крыніц іанізуючага выпраменьвання вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 13. Перавозка ядзерных матэрыялаў, адпрацаваўшых ядзерных матэрыялаў і (або) эксплуатацыйных радыеактыўных адходаў**

Перавозка ядзерных матэрыялаў, адпрацаваўшых ядзерных матэрыялаў і (або) эксплуатацыйных радыеактыўных адходаў павінна ажыццяўляцца ў адпаведнасці з гэтым Законам і актамі заканадаўства ў галіне перавозкі небяспечных грузаў.

Пры перавозцы ядзерных матэрыялаў, адпрацаваўшых ядзерных матэрыялаў і (або) эксплуатацыйных радыеактыўных адходаў суб'екты перавозкі небяспечных грузаў абавязаны ажыццяўляць мерапрыемствы па папярэджанні інцыдэнтаў і аварый і прымаць меры па лакалізацыі і ліквідацыі наступстваў у выпадку іх узнікнення, а таксама мерапрыемствы па ахове работнікаў (персаналу), грамадзян, навакольнага асяроддзя і маёмасці ад наступстваў магчымых аварый пры перавозцы.

Лакалізацыя і ліквідацыя наступстваў аварый пры перавозцы ядзерных матэрыялаў, адпрацаваўшых ядзерных матэрыялаў і (або) эксплуатацыйных радыеактыўных адходаў ажыццяўляюцца сіламі і сродкамі суб'ектаў перавозкі небяспечных грузаў і спецыялізаваных падраздзяленняў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 4
## РАЗМЯШЧЭННЕ І ЎЗВЯДЗЕННЕ ЯДЗЕРНАЙ УСТАНОЎКІ І (АБО) ПУНКТА ЗАХОЎВАННЯ

**Артыкул 14. Прыняцце рашэння аб размяшчэнні і ўзвядзенні ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання**

Рашэнні аб размяшчэнні і ўзвядзенні ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання прымаюцца, у тым ліку па прапанове зацікаўленых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, з улікам наступных патрабаванняў:

наяўнасці патрэбнасцяў у іх для вырашэння сацыяльна-эканамічных задач Рэспублікі Беларусь і асобных яе рэгіёнаў з улікам магчымых наступстваў размяшчэння ўказаных аб'ектаў;

адсутнасці пагрозы бяспекі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання з боку размешчаных паблізу грамадзянскіх або ваенных аб'ектаў;

наяўнасці ўмоў, неабходных для экалагічна бяспечнага размяшчэння ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання, якія адказваюць патрабаванням заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў, што павінна пацвярджацца станоўчымі заключэннямі дзяржаўных і іншых экспертыз, прадугледжаных заканадаўствам;

іншых патрабаванняў, устаноўленых заканадаўствам.

**Артыкул 15. Адмена рашэння аб узвядзенні ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання**

Рашэнне аб узвядзенні ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання павінна быць адменена, а іх узвядзенне спынена ў выпадку выяўлення фактараў, якія цягнуць зніжэнне ўзроўню бяспекі гэтых аб'ектаў, забруджванне навакольнага асяроддзя або іншыя неспрыяльныя наступствы, на падставе заключэнняў дзяржаўных і іншых экспертыз, прадугледжаных заканадаўствам.

Адмена рашэння аб узвядзенні ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання ажыццяўляецца органам або службовай асобай, якія прынялі рашэнне аб узвядзенні ўказаных аб'ектаў.

Прапановы аб адмене рашэння аб узвядзенні ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання ўносяцца ў орган або службовай асобе, якія прынялі такое рашэнне, рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, органамі мясцовага кіравання і самакіравання, а таксама грамадскімі аб'яднаннямі і іншымі арганізацыямі і грамадзянамі з абгрунтаваннем фактараў, указаных у частцы першай гэтага артыкула.

Страты, звязаныя з адменай рашэння аб узвядзенні ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання, падлягаюць пакрыццю за кошт арганізацый, па віне якіх своечасова не былі выяўлены і ўлічаны фактары, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула.

**Артыкул 16. Праект на ядзерную ўстаноўку і (або) пункт захоўвання**

Распрацоўка праекта на ядзерную ўстаноўку і (або) пункт захоўвання ажыццяўляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства аб будаўніцтве, архітэктуры і горадабудаўніцтве, заканадаўства аб ахове і выкарыстанні зямель, заканадаўства аб нетрах, заканадаўства аб санітарна-эпідэмічным дабрабыце насельніцтва, заканадаўства аб ахове насельніцтва і тэрыторый ад надзвычайных сітуацый, заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў, у тым ліку тэхнічных нарматыўных прававых актаў.

У праекце на ядзерную ўстаноўку і (або) пункт захоўвання ў абавязковым парадку павінны быць абгрунтаваны памеры неабходнага да прадастаўлення зямельнага ўчастка, неабходнасць устанаўлення абмежаванняў (абцяжаранняў) правоў у выкарыстанні зямельнага ўчастка пад праектуемыя ядзерную ўстаноўку і (або) пункт захоўвання з улікам размяшчэння функцыянальных капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іншых аб'ектаў вытворчай, транспартнай, інжынернай інфраструктуры і ўстанаўлення санітарна-ахоўнай зоны і зоны назірання.

Праект на ядзерную ўстаноўку і (або) пункт захоўвання павінен прадугледжваць мерапрыемствы па бяспечным вывадзе іх з эксплуатацыі, мерапрыемствы па бяспечным абыходжанні з ядзернымі матэрыяламі, адпрацаваўшымі ядзернымі матэрыяламі і (або) эксплуатацыйнымі радыеактыўнымі адходамі ў якасці абавязковага этапу любога цыклу ядзернай тэхналогіі.

Па праекце на ядзерную ўстаноўку і (або) пункт захоўвання праводзяцца прадугледжаныя заканадаўствам дзяржаўныя і іншыя экспертызы, якія пацвярджаюць бяспеку ўказаных аб'ектаў.

**Артыкул 17. Санітарна-ахоўная зона і зона назірання**

Для абароны грамадзян і аховы навакольнага асяроддзя ў раёне размяшчэння ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання ў адпаведнасці з гэтым Законам, заканадаўствам аб радыяцыйнай бяспецы і заканадаўствам аб санітарна-эпідэмічным дабрабыце насельніцтва могуць устанаўлівацца санітарна-ахоўная зона і зона назірання.

Санітарна-ахоўная зона ўстанаўліваецца ў мэтах змяншэння шкоднага ўздзеяння іанізуючага выпраменьвання, звязанага з дзейнасцю па выкарыстанні атамнай энергіі, на здароўе грамадзян.

Зона назірання ўстанаўліваецца ў мэтах забеспячэння атрымання дакладнай інфармацыі аб натуральным радыяцыйным фоне і радыеактыўным забруджванні атмасфернага паветра, паверхневых і падземных водаў вакол раёна размяшчэння ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання.

У санітарна-ахоўнай зоне забараняецца размяшчэнне капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), якія не адносяцца да функцыянавання ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання, а таксама іншых аб'ектаў вытворчай, транспартнай, інжынернай інфраструктуры, не прадугледжаных праектам на ядзерную ўстаноўку і (або) пункт захоўвання.

Змяненне функцыянальнага прызначэння капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў) і іншых аб'ектаў вытворчай, транспартнай, інжынернай інфраструктуры, прадугледжаных праектам на ядзерную ўстаноўку і (або) пункт захоўвання і размешчаных у санітарна-ахоўнай зоне, допускаецца па ўзгадненні з дзяржаўнымі органамі па рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі на падставе прапановы эксплуатуючай арганізацыі.

Неабходнасць устанаўлення санітарна-ахоўнай зоны і зоны назірання, іх памеры і межы вызначаюцца праектам на ядзерную ўстаноўку і (або) пункт захоўвання ў адпаведнасці з патрабаваннямі бяспекі, прадугледжанымі тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі, і ўзгадняюцца з упаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі і ўстановамі, якія ажыццяўляюць дзяржаўны санітарны нагляд.

Памеры санітарна-ахоўнай зоны і зоны назірання вакол ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання ўстанаўліваюцца з улікам магчымых узроўняў знешняга выпраменьвання, а таксама велічыні і плошчаў магчымага распаўсюджвання радыеактыўных выкідаў у атмасфернае паветра і (або) скідаў у паверхневыя і падземныя воды. Парадак узгаднення, устанаўлення і абазначэння межаў санітарна-ахоўнай зоны і зоны назірання, а таксама патрабаванні па іх ахове і выкарыстанні вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

У санітарна-ахоўнай зоне і зоне назірання ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі і ўстановамі, якія ажыццяўляюць дзяржаўны санітарны нагляд, могуць уводзіцца абмежаванні гаспадарчай дзейнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам.

У санітарна-ахоўнай зоне і зоне назірання павінны ажыццяўляцца радыяцыйны кантроль і радыяцыйны маніторынг навакольнага асяроддзя ў адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

## ГЛАВА 5
## УВОД У ЭКСПЛУАТАЦЫЮ І ВЫВАД З ЭКСПЛУАТАЦЫІ ЯДЗЕРНАЙ УСТАНОЎКІ І (АБО) ПУНКТА ЗАХОЎВАННЯ

**Артыкул 18. Прыёмка і ўвод у эксплуатацыю ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання**

Прыёмка ў эксплуатацыю ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб будаўніцтве, архітэктуры і горадабудаўніцтве, у тым ліку тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі.

Увод у эксплуатацыю ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання ажыццяўляецца ў адпаведнасці з праграмай уводу ў эксплуатацыю ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання, распрацаванай эксплуатуючай арганізацыяй на падставе праектаў указаных аб'ектаў. Праграма ўводу ў эксплуатацыю ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання ўзгадняецца з дзяржаўнымі органамі па рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі і зацвярджаецца органам або службовай асобай, якія прынялі рашэнне аб размяшчэнні і ўзвядзенні ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання. Тэрміны распрацоўкі, узгаднення і зацвярджэння праграмы ўводу ў эксплуатацыю ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання ўстанаўліваюцца тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі.

**Артыкул 19. Працяг тэрміну эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання**

Рашэнне аб працягу тэрміну эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання пасля заканчэння прадугледжанага іх праектам нарматыўнага тэрміну эксплуатацыі прымаецца органам або службовай асобай, якія прынялі рашэнне аб узвядзенні гэтых аб'ектаў.

Прапанова аб працягу тэрміну эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання ўносіцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання або іншай дзяржаўнай арганізацыяй, у распараджэнні якіх знаходзіцца ядзерная ўстаноўка і (або) пункт захоўвання, пры наяўнасці адпаведных абгрунтаванняў эксплуатуючых арганізацый, узгодненых ва ўстаноўленым парадку з дзяржаўнымі органамі па рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі.

**Артыкул 20. Вывад з эксплуатацыі альбо абмежаванне эксплуатацыйных характарыстык ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання**

Вывад з эксплуатацыі альбо абмежаванне эксплуатацыйных характарыстык ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне выкарыстання атамнай энергіі.

Эксплуатуючай арганізацыяй за пяць гадоў да заканчэння ўстаноўленага праектам на ядзерную ўстаноўку і (або) пункт захоўвання нарматыўнага тэрміну эксплуатацыі распрацоўваецца праграма вываду з эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання, якая павінна змяшчаць меры па дэмантажы ўказаных аб'ектаў, абыходжанні з ядзернымі матэрыяламі, адпрацаваўшымі ядзернымі матэрыяламі і (або) эксплуатацыйнымі радыеактыўнымі адходамі, а таксама меры па далейшым кантролі і дзяржаўным наглядзе за ўказанымі аб'ектамі.

Праграма вываду з эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання ўзгадняецца з дзяржаўнымі органамі па рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі і ўносіцца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання або іншай дзяржаўнай арганізацыяй, у распараджэнні якіх знаходзяцца ядзерная ўстаноўка і (або) пункт захоўвання, на зацвярджэнне ў орган або службовай асобе, якія прынялі рашэнне аб узвядзенні ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання.

У выпадку выяўлення ў працэсе эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання фактараў, якія цягнуць зніжэнне ўзроўню бяспекі гэтых аб'ектаў, забруджванне навакольнага асяроддзя або іншыя неспрыяльныя наступствы, на падставе заключэнняў дзяржаўных і іншых экспертыз, прадугледжаных заканадаўствам, орган або службовая асоба, якія прынялі рашэнне аб узвядзенні ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання, прымаюць рашэнне аб датэрміновым вывадзе з эксплуатацыі альбо рашэнне аб абмежаванні эксплуатацыйных характарыстык ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання.

Прапановы аб датэрміновым вывадзе з эксплуатацыі альбо прапановы аб абмежаванні эксплуатацыйных характарыстык ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання ўносяцца дзяржаўнымі органамі, органамі мясцовага кіравання і самакіравання, а таксама грамадскімі аб'яднаннямі, іншымі арганізацыямі або грамадзянамі ў орган або службовай асобе, якія прынялі рашэнне аб узвядзенні ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання.

Датэрміновы вывад з эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання альбо абмежаванне эксплуатацыйных характарыстык гэтых аб'ектаў ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з праграмай датэрміновага вываду з эксплуатацыі, праграмай абмежавання эксплуатацыйных характарыстык ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання, распрацаванымі эксплуатуючай арганізацыяй. Указаныя праграмы павінны быць распрацаваны, узгоднены і зацверджаны на працягу аднаго года з моманту прыняцця рашэння аб датэрміновым вывадзе з эксплуатацыі альбо рашэння аб абмежаванні эксплуатацыйных характарыстык ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання ў парадку, прадугледжаным часткай трэцяй гэтага артыкула.

**Артыкул 21. Фонд вываду з эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання**

Для выканання работ па вывадзе з эксплуатацыі, датэрміновым вывадзе з эксплуатацыі альбо абмежаванні эксплуатацыйных характарыстык ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання эксплуатуючай арганізацыяй стварaецца фонд вываду з эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання.

Парадак фарміравання фонду вываду з эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання ўстанаўліваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Для атамнай электрастанцыі або яе блока фонд вываду з эксплуатацыі фарміруецца за кошт сродкаў, атрыманых ад продажу электрычнай і цеплавой энергіі і аказання іншых паслуг, а таксама за кошт іншых крыніц, якія не супярэчаць заканадаўству.

Фонд вываду з эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання выкарыстоўваецца толькі для фінансавання мераў, прадугледжаных праграмамі вываду з эксплуатацыі, датэрміновага вываду з эксплуатацыі альбо абмежавання эксплуатацыйных характарыстык ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання.

## ГЛАВА 6
## ФІЗІЧНАЯ АХОВА АБ'ЕКТАЎ ВЫКАРЫСТАННЯ АТАМНАЙ ЭНЕРГІІ

**Артыкул 22. Фізічная ахова аб'ектаў выкарыстання атамнай энергіі**

Фізічная ахова аб'ектаў выкарыстання атамнай энергіі ажыццяўляецца ў мэтах:

прадухілення несанкцыянаванага пранікнення на тэрыторыю ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання, прадухілення несанкцыянаванага доступу да ядзерных матэрыялаў, адпрацаваўшых ядзерных матэрыялаў і (або) эксплуатацыйных радыеактыўных адходаў, іх выкрадання або пашкоджання;

своечасовага выяўлення, папярэджання і спынення пагроз бяспецы аб'ектаў выкарыстання атамнай энергіі, у тым ліку тэрарыстычнага і дыверсійнага характару;

выяўлення і вяртання зніклых або выкрадзеных ядзерных матэрыялаў, адпрацаваўшых ядзерных матэрыялаў і (або) эксплуатацыйных радыеактыўных адходаў.

**Артыкул 23. Забеспячэнне фізічнай аховы аб'ектаў выкарыстання атамнай энергіі**

Меры па забеспячэнні фізічнай аховы ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання павінны прадугледжвацца на ўсіх этапах праектавання, узвядзення, уводу ў эксплуатацыю, эксплуатацыі, абмежавання эксплуатацыйных характарыстык, працягу тэрміну эксплуатацыі, вываду з эксплуатацыі, а таксама пры абыходжанні з ядзернымі матэрыяламі, адпрацаваўшымі ядзернымі матэрыяламі і (або) эксплуатацыйнымі радыеактыўнымі адходамі.

Фізічная ахова аб'ектаў выкарыстання атамнай энергіі забяспечваецца эксплуатуючымі арганізацыямі і рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання ў межах іх кампетэнцыі.

Дзяржаўны нагляд за забеспячэннем фізічнай аховы аб'ектаў выкарыстання атамнай энергіі ажыццяўляецца ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі па рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі ў парадку, устаноўленым Урадам Рэспублікі Беларусь.

Забараняюцца эксплуатацыя ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання, а таксама правядзенне любых работ па выкарыстанні ядзерных матэрыялаў альбо абыходжанні з адпрацаваўшымі ядзернымі матэрыяламі і (або) эксплуатацыйнымі радыеактыўнымі адходамі, якія знаходзяцца ў любой форме і на любой стадыі абыходжання, калі не прыняты неабходныя меры па выкананні патрабаванняў па забеспячэнні іх фізічнай аховы.

**Артыкул 24. Абмежаванне правоў асобаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання**

У мэтах забеспячэння фізічнай аховы аб'ектаў выкарыстання атамнай энергіі і бяспекі работнікаў (персаналу) эксплуатуючых арганізацый перамяшчэнне і дзеянні асобаў, у тым ліку работнікаў (персаналу), якія знаходзяцца на тэрыторыі размяшчэння ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання, а таксама ў іх санітарна-ахоўных зонах, могуць быць абмежаваныя.

У мэтах выяўлення рэчываў, матэрыялаў і вырабаў, якія могуць быць выкарыстаны для ажыццяўлення акта незаконнага ўмяшання ў работу ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання, з прымяненнем спецыяльных сродкаў ажыццяўляюцца агляд рэчаў і (або) транспартных сродкаў, работнікаў (персаналу) эксплуатуючых арганізацый і грамадзян, якія наведваюць указаныя аб'екты, і іншыя працэдуры кантролю. Парадак ажыццяўлення агляду і іншых працэдур кантролю вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб ахоўнай дзейнасці.

На тэрыторыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання і ў іх санітарна-ахоўных зонах забараняецца правядзенне сходаў, мітынгаў, дэманстрацый, а таксама несанкцыянаваных масавых мерапрыемстваў.

## ГЛАВА 7
## АВАРЫЙНАЯ ГАТОЎНАСЦЬ І АВАРЫЙНАЕ РЭАГАВАННЕ

**Артыкул 25. Арганізацыя аварыйнай гатоўнасці і аварыйнага рэагавання**

Арганізацыя аварыйнай гатоўнасці і аварыйнага рэагавання заключаецца ў распрацоўцы мераў па забеспячэнні аварыйнай гатоўнасці і забеспячэнні аварыйнага рэагавання.

Меры па забеспячэнні аварыйнай гатоўнасці і аварыйнага рэагавання распрацоўваюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі актаў заканадаўства і ўстанаўліваюцца знешнімі і ўнутранымі аварыйнымі планамі.

**Артыкул 26. Знешні аварыйны план**

Знешнім аварыйным планам вызначаюцца зоны аварыйнага рэагавання і дзеянні рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, органаў мясцовага кіравання і самакіравання, дзяржаўных і іншых арганізацый і грамадзян, накіраваныя на ахову жыцця і здароўя грамадзян, ахову навакольнага асяроддзя і ахову маёмасці ў выпадку радыяцыйнай аварыі, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, у тым ліку на ядзернай установцы і (або) пункце захоўвання, размешчаных за межамі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь бліжэй за сто кіламетраў ад Дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь.

Распрацоўка знешняга аварыйнага плана і выкананне мерапрыемстваў па яго рэалізацыі ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі па рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі і органамі мясцовага кіравання і самакіравання.

Знешні аварыйны план зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь. Мерапрыемствы знешняга аварыйнага плана падлягаюць безумоўнаму выкананню. Эксплуатуючая арганізацыя за кошт уласных сродкаў і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам, падтрымлівае неабходны ўзровень матэрыяльна-тэхнічнага і кадравага забеспячэння знешняга аварыйнага плана.

**Артыкул 27. Унутраны аварыйны план**

Унутраны аварыйны план вызначае ў адпаведнасці са знешнім аварыйным планам дзеянні эксплуатуючай арганізацыі па ліквідацыі, абмежаванні або зніжэнні наступстваў радыяцыйнай аварыі, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі.

Унутраны аварыйны план распрацоўваецца і зацвярджаецца эксплуатуючай арганізацыяй пасля ўзгаднення з дзяржаўнымі органамі па рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі.

Унутраны аварыйны план павінен быць зацверджаны не менш чым за шэсць месяцаў да пачатку запланаванага ўводу ў эксплуатацыю ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання.

Распрацоўка, а таксама мерапрыемствы па рэалізацыі ўнутранага аварыйнага плана фінансуюцца за кошт сродкаў эксплуатуючай арганізацыі.

Унутраны аварыйны план праходзіць практычную праверку да ўводу ў эксплуатацыю і на працягу тэрміну эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання з перыядычнасцю, устаноўленай дзяржаўнымі органамі па рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі.

**Артыкул 28. Умовы і парадак распрацоўкі аварыйных планаў**

Умовы і парадак распрацоўкі аварыйных планаў, меры па ліквідацыі, абмежаванні або зніжэнні наступстваў радыяцыйнай аварыі, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, спосабы інфармавання грамадзян, а таксама меры па праверцы аварыйнай гатоўнасці вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь па прапанове дзяржаўных органаў па рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі.

**Артыкул 29. Абавязкі эксплуатуючай арганізацыі па забеспячэнні аварыйнай гатоўнасці і аварыйнага рэагавання**

Эксплуатуючая арганізацыя абавязана азнаёміць работнікаў (персанал) з аварыйнымі планамі і праводзіць спецыяльнае навучанне работнікаў (персаналу), якім трэба будзе выконваць абавязкі згодна з гэтым планам.

У выпадку ўзнікнення радыяцыйнай аварыі пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, якая прывяла да выкіду ў навакольнае асяроддзе радыеактыўных рэчываў звыш устаноўленых межаў, эксплуатуючая арганізацыя абавязана:

неадкладна праінфармаваць аб гэтым грамадзян, дзяржаўныя органы па рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі, органы мясцовага кіравання і самакіравання ў раёне аварыйнага рэагавання і іншыя дзяржаўныя органы;

прыняць дзеянні па ліквідацыі, абмежаванні або зніжэнні наступстваў радыяцыйнай аварыі;

кантраляваць апрамяненне асобаў, якія ўдзельнічаюць у ліквідацыі, абмежаванні або зніжэнні наступстваў радыяцыйнай аварыі, а таксама прыняць меры, накіраваныя на недапушчэнне перавышэння ўстаноўленых асноўных межаў дозаў апрамянення гэтых асобаў;

забяспечваць бесперапынны маніторынг выкіду радыеактыўных рэчываў у навакольнае асяроддзе;

забяспечваць аператыўнай інфармацыяй аб радыяцыйнай абстаноўцы адпаведныя дзяржаўныя органы, іншыя арганізацыі, грамадзян у зоне назірання ў адпаведнасці з аварыйнымі планамі;

выконваць іншыя абавязкі ў адпаведнасці з мерапрыемствамі, прадугледжанымі знешнім і ўнутраным аварыйнымі планамі і гэтым Законам.

Пры выкананні работ па ліквідацыі, абмежаванні або зніжэнні наступстваў радыяцыйнай аварыі, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, апрамяненне работнікаў (персаналу) эксплуатуючай арганізацыі звыш устаноўленых асноўных межаў дозаў апрамянення можа быць дапушчана (але не звыш эфектыўнай дозы патэнцыяльна небяспечнага апрамянення, устаноўленай нарматыўнымі прававымі актамі) толькі пры немагчымасці прыняць іншыя меры для выратавання грамадзян, прадухілення масавага апрамянення, а таксама пры пагрозе значнага радыеактыўнага забруджвання навакольнага асяроддзя. Эксплуатуючая арганізацыя абавязана загадзя інфармаваць работнікаў (персанал), якія прымаюць удзел у гэтых работах, аб магчымай рызыцы апрамянення звыш устаноўленых асноўных межаў дозаў апрамянення і атрымаць на гэта іх пісьмовую згоду.

## ГЛАВА 8
## ЭКСПЛУАТУЮЧЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ І АРГАНІЗАЦЫІ, ЯКІЯ ВЫКОНВАЮЦЬ РАБОТЫ І (АБО) АКАЗВАЮЦЬ ПАСЛУГІ ПРЫ АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ВЫКАРЫСТАННІ АТАМНАЙ ЭНЕРГІІ

**Артыкул 30. Асаблівасці дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, якая ажыццяўляецца эксплуатуючай арганізацыяй**

Эксплуатуючая арганізацыя і Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь узаемадзейнічаюць па пытаннях вызначэння рэжымаў работы атамнай электрастанцыі або яе блока і рэжымаў работы генерыруючага і іншага абсталявання, якое выкарыстоўваецца на атамнай электрастанцыі.

Любое ўмяшальніцтва ў дзейнасць па выкарыстанні атамнай энергіі, якая ажыццяўляецца эксплуатуючай арганізацыяй, што можа пацягнуць зніжэнне ўзроўню ядзернай бяспекі, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі і тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі, не допускаецца.

**Артыкул 31. Фонд фінансавання работ па падтрыманні і павышэнні бяспекі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання**

У мэтах фінансавання навукова-даследчых, доследна-канструктарскіх і іншых работ па падтрыманні і павышэнні бяспекі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання эксплуатуючая арганізацыя стварае фонд фінансавання работ па падтрыманні і павышэнні бяспекі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання, які павінен быць створаны да ўводу ў эксплуатацыю ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання.

Парадак фарміравання і выкарыстання гэтага фонду вызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 32. Абавязкі і адказнасць эксплуатуючай арганізацыі па забеспячэнні бяспекі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання**

Эксплуатуючая арганізацыя распрацоўвае і ажыццяўляе мерапрыемствы па падтрыманні і павышэнні бяспекі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання, стварае пры неабходнасці адпаведныя службы, якія ажыццяўляюць кантроль за бяспекай, прадстаўляе інфармацыю аб стане бяспекі гэтых аб'ектаў у дзяржаўныя органы па рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі ва ўстаноўленыя імі тэрміны.

Эксплуатуючая арганізацыя забяспечвае:

выкарыстанне ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання толькі для тых мэтаў, для якіх яны прызначаны;

арганізацыю і правядзенне работ у такім аб'ёме і такой якасці, якія адпавядаюць патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў, на ўсіх этапах размяшчэння, праектавання, узвядзення, уводу ў эксплуатацыю, эксплуатацыі, абмежавання эксплуатацыйных характарыстык, працягу тэрміну эксплуатацыі, вываду з эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання;

распрацоўку і рэалізацыю мераў па прадухіленні ўзнікнення радыяцыйнай аварыі пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі і па зніжэнні яе негатыўных наступстваў для работнікаў (персаналу), грамадзян і навакольнага асяроддзя;

бяспечнае для работнікаў (персаналу) і грамадзян абыходжанне з ядзернымі матэрыяламі, адпрацаваўшымі ядзернымі матэрыяламі і (або) эксплуатацыйнымі радыеактыўнымі адходамі;

фарміраванне і мэтавае выкарыстанне фонду вываду з эксплуатацыі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання і фонду фінансавання работ па падтрыманні і павышэнні бяспекі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання;

рэалізацыю правоў работнікаў (персаналу) на сацыяльныя гарантыі;

улік індывідуальных дозаў апрамянення работнікаў (персаналу);

распрацоўку і рэалізацыю мераў па ахове работнікаў (персаналу) і грамадзян у зоне назірання ў выпадку ўзнікнення радыяцыйнай аварыі пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі;

улік і кантроль ядзерных матэрыялаў, адпрацаваўшых ядзерных матэрыялаў, эксплуатацыйных радыеактыўных адходаў і іншых крыніц іанізуючага выпраменьвання;

ажыццяўленне фізічнай аховы аб'ектаў выкарыстання атамнай энергіі;

распрацоўку і рэалізацыю мераў пажарнай бяспекі на ядзернай установцы і (або) у пункце захоўвання;

радыяцыйны кантроль і радыяцыйны маніторынг у санітарна-ахоўнай зоне і зоне назірання;

падбор, падрыхтоўку, перападрыхтоўку і падтрыманне адпаведнай кваліфікацыі, а таксама неабходнай колькасці работнікаў (персаналу);

інфармаванне аб радыяцыйнай абстаноўцы грамадзян у зоне назірання;

выкананне іншых абавязкаў, устаноўленых заканадаўствам.

Эксплуатуючая арганізацыя ў адпаведнасці з заканадаўствам нясе адказнасць за невыкананне патрабаванняў па забеспячэнні бяспекі ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання.

У выпадку прыняцця ва ўстаноўленым парадку рашэнняў аб прыпыненні альбо спыненні дзеяння спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), які дае права на эксплуатацыю ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання, рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання або іншая дзяржаўная арганізацыя, у распараджэнні якіх знаходзяцца ўказаныя аб'екты, прымаюць меры па забеспячэнні іх бяспекі. Калі аднаўленне дзеяння такога спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) немагчыма, адпаведны рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання або іншая дзяржаўная арганізацыя, у распараджэнні якіх знаходзяцца ўказаныя аб'екты, прымаюць меры па стварэнні новай эксплуатуючай арганізацыі.

**Артыкул 33. Арганізацыі, якія выконваюць работы і (або) аказваюць паслугі пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі**

Арганізацыі, якія ажыццяўляюць праектныя і вышукальныя, навукова-даследчыя, доследна-канструктарскія і тэхналагічныя работы, канструяванне і выраб абсталявання для ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання, навуковае суправаджэнне, выкананне іншых работ і (або) аказанне іншых паслуг пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, забяспечваюць выкананне работ і (або) аказанне паслуг у такім аб'ёме і такой якасці, якія адпавядаюць патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў, і нясуць адказнасць за якасць выкананых работ і (або) аказаных паслуг на працягу нарматыўнага тэрміну эксплуатацыі, вызначанага праектам на ядзерную ўстаноўку і (або) пункт захоўвання.

Да арганізацый, указаных у частцы першай гэтага артыкула, якія выконваюць работы і (або) аказваюць паслугі непасрэдна на ядзернай установцы і (або) у пункце захоўвання альбо з ядзернымі матэрыяламі, адпрацаваўшымі ядзернымі матэрыяламі і (або) эксплуатацыйнымі радыеактыўнымі адходамі, прымяняюцца патрабаванні гэтага Закона ў дачыненні да эксплуатуючых арганізацый у частцы выконвання імі патрабаванняў па забеспячэнні ядзернай і радыяцыйнай бяспекі.

**Артыкул 34. Асаблівасці прававога становішча работнікаў (персаналу) эксплуатуючых арганізацый**

Работнікі (персанал) эксплуатуючых арганізацый адносяцца да работнікаў з асаблівым характарам працы. Працоўныя адносіны і працоўная дысцыпліна работнікаў (персаналу) эксплуатуючых арганізацый рэгулююцца заканадаўствам аб працы і патрабаваннямі адпаведнага дысцыплінарнага статута, які зацвярджаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Работнікі (персанал) эксплуатуючых арганізацый падлягаюць абавязковаму страхаванню ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, у тым ліку абумоўленых уздзеяннем іанізуючага выпраменьвання, у адпаведнасці з заканадаўствам аб страхаванні.

У дачыненні да работнікаў (персаналу) арганізацый, указаных у частцы першай артыкула 33 гэтага Закона, якія выконваюць работы і (або) аказваюць паслугі непасрэдна на ядзернай установцы і (або) у пункце захоўвання альбо з ядзернымі матэрыяламі, адпрацаваўшымі ядзернымі матэрыяламі і (або) эксплуатацыйнымі радыеактыўнымі адходамі, прымяняюцца патрабаванні частак першай і другой гэтага артыкула, а таксама артыкула 41 гэтага Закона.

Асаблівасці сацыяльна-бытавога забеспячэння асобных катэгорый работнікаў (персаналу) эксплуатуючых арганізацый вызначаюцца заканадаўствам.

## ГЛАВА 9
## АДКАЗНАСЦЬ ЗА ШКОДУ, НАНЕСЕНУЮ Ў ВЫНІКУ РАДЫЯЦЫЙНАЙ АВАРЫІ, ЯКАЯ ЎЗНІКЛА ПРЫ АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ВЫКАРЫСТАННІ АТАМНАЙ ЭНЕРГІІ. АДКАЗНАСЦЬ ЗА ПАРУШЭННЕ ЗАКАНАДАЎСТВА Ў ГАЛІНЕ ВЫКАРЫСТАННЯ АТАМНАЙ ЭНЕРГІІ

**Артыкул 35. Пакрыццё шкоды, нанесенай радыяцыйнай аварыяй, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі**

Шкода, нанесеная арганізацыям і грамадзянам радыяцыйнай аварыяй, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, альбо яе спалучэннем з таксічным, выбуховым або іншым небяспечным уздзеяннем, падлягае пакрыццю эксплуатуючай арганізацыяй у адпаведнасці з гэтым Законам і іншым заканадаўствам.

**Артыкул 36. Мяжа адказнасці за шкоду, нанесеную радыяцыйнай аварыяй, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, і асаблівасці яе пакрыцця**

Для пакрыцця шкоды, нанесенай радыяцыйнай аварыяй, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь альбо па яго даручэнні Урадам Рэспублікі Беларусь устанаўліваецца мяжа адказнасці.

Мяжа адказнасці за шкоду, нанесеную радыяцыйнай аварыяй, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, не можа быць меншай за мінімальны памер, устаноўлены міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Для забеспячэння пакрыцця шкоды, нанесенай радыяцыйнай аварыяй, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, эксплуатуючая арганізацыя павінна мець фінансавае забеспячэнне адказнасці, крыніцы фарміравання і памер якога вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь з улікам міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 37. Пакрыццё шкоды, нанесенай радыяцыйнай аварыяй, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, навакольнаму асяроддзю**

Эксплуатуючая арганізацыя нясе адказнасць за шкоду, нанесеную радыяцыйнай аварыяй, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, навакольнаму асяроддзю, у адпаведнасці з заканадаўствам.

У выпадку поўнай або частковай адмовы эксплуатуючай арганізацыі задаволіць прэтэнзію аб пакрыцці шкоды, нанесенай радыяцыйнай аварыяй, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, навакольнаму асяроддзю, іскі аб пакрыцці шкоды прад'яўляюць дзяржаўны орган, які ажыццяўляе дзяржаўны кантроль у галіне аховы навакольнага асяроддзя, у межах сваёй кампетэнцыі альбо пракурор.

**Артыкул 38. Адказнасць за парушэнне заканадаўства ў галіне выкарыстання атамнай энергіі**

Службовыя асобы дзяржаўных органаў, у тым ліку рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ў галіне выкарыстання атамнай энергіі, дзяржаўных органаў па рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі, органаў мясцовага кіравання і самакіравання, а таксама работнікі (персанал) эксплуатуючых арганізацый, арганізацый, якія выконваюць работы і (або) аказваюць паслугі пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, а таксама іншыя асобы за парушэнне заканадаўства ў галіне выкарыстання атамнай энергіі нясуць дысцыплінарную, адміністрацыйную, крымінальную і (або) іншую адказнасць.

## ГЛАВА 10
## ГАРАНТЫІ ПРАВОЎ ГРАМАДЗЯН І АРГАНІЗАЦЫЙ У ГАЛІНЕ ВЫКАРЫСТАННЯ АТАМНАЙ ЭНЕРГІІ

**Артыкул 39. Правы грамадзян і арганізацый на атрыманне інфармацыі ў галіне выкарыстання атамнай энергіі**

Грамадзяне, грамадскія аб'яднанні і іншыя арганізацыі маюць права ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку запытваць і атрымліваць ад дзяржаўных органаў і арганізацый інфармацыю па бяспецы ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання, якія намячаюцца да ўзвядзення, праектуюцца, узводзяцца, эксплуатуюцца і выводзяцца з эксплуатацыі, за выключэннем звестак, якія складаюць дзяржаўныя сакрэты, або інфармацыі, распаўсюджванне і (або) прадастаўленне якой абмежавана. Не допускаецца аднясенне да дзяржаўных сакрэтаў або да інфармацыі, распаўсюджванне і (або) прадастаўленне якой абмежавана, інфармацыі аб радыяцыйнай аварыі, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі.

Грамадзяне, грамадскія аб'яднанні і іншыя арганізацыі маюць права бясплатна атрымліваць інфармацыю аб радыяцыйнай абстаноўцы.

Грамадзяне, якія трапілі пад уздзеянне іанізуючага выпраменьвання, маюць права на атрыманне дакумента аб дозе атрыманага апрамянення. Парадак атрымання такога дакумента і яго форма вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 40. Правы грамадзян і арганізацый на ўдзел у фарміраванні палітыкі ў галіне выкарыстання атамнай энергіі**

Грамадзяне, грамадскія аб'яднанні і іншыя арганізацыі маюць права на ўдзел у абмеркаванні праектаў нарматыўных прававых актаў і дзяржаўных мэтавых праграм у галіне выкарыстання атамнай энергіі.

Грамадскія аб'яднанні і іншыя арганізацыі маюць права прапаноўваць сваіх прадстаўнікоў для ўдзелу ў правядзенні дзяржаўных і іншых экспертыз ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання на стадыі іх размяшчэння, праектавання, узвядзення, эксплуатацыі, вываду з эксплуатацыі альбо абмежавання эксплуатацыйных характарыстык ядзернай установкі і (або) пункта захоўвання.

Грамадскія аб'яднанні і іншыя арганізацыі маюць права праводзіць незалежныя экспертызы ў выпадках і парадку, устаноўленых заканадаўствам.

**Артыкул 41. Правы работнікаў (персаналу) эксплуатуючых арганізацый на сацыяльныя гарантыі**

Работнікі (персанал) эксплуатуючых арганізацый маюць права на сацыяльныя гарантыі за шкоднае ўздзеянне іанізуючага выпраменьвання на іх здароўе і за дадатковыя фактары рызыкі, якія прадастаўляюцца за кошт сродкаў эксплуатуючай арганізацыі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі, што вызначаюць віды, памеры і парадак прадастаўлення такіх сацыяльных гарантый, а таксама крыніцы, за кошт якіх ажыццяўляецца іх фінансаванне.

## ГЛАВА 11
## МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў ГАЛІНЕ ВЫКАРЫСТАННЯ АТАМНАЙ ЭНЕРГІІ

**Артыкул 42. Міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь у галіне выкарыстання атамнай энергіі**

Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, прадугледжаныя гэтым Законам, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 43. Абмен інфармацыяй з замежнымі дзяржавамі, Міжнародным агенцтвам па атамнай энергіі і іншымі міжнароднымі арганізацыямі ў галіне выкарыстання атамнай энергіі**

Абмен інфармацыяй з замежнымі дзяржавамі, Міжнародным агенцтвам па атамнай энергіі і іншымі міжнароднымі арганізацыямі ў галіне выкарыстання атамнай энергіі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 44. Увоз і вываз ядзерных установак, абсталявання, тэхналогій, ядзерных матэрыялаў, адпрацаваўшых ядзерных матэрыялаў, эксплуатацыйных радыеактыўных адходаў, работ і паслуг у галіне выкарыстання атамнай энергіі**

Увоз і вываз ядзерных установак, абсталявання, тэхналогій, ядзерных матэрыялаў, адпрацаваўшых ядзерных матэрыялаў, эксплуатацыйных радыеактыўных адходаў, работ і паслуг пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, уключаючы іх перадачу для дэманстрацыі на выстаўках, правядзення сумесных работ і ў іншых мэтах некамерцыйнага характару, ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, міжнароднымі абавязацельствамі Рэспублікі Беларусь аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь у галіне выкарыстання атамнай энергіі.

Увоз на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь адпрацаваўшых ядзерных матэрыялаў і (або) эксплуатацыйных радыеактыўных адходаў у мэтах іх захоўвання або пахавання допускаецца толькі для адпрацаваўшых ядзерных матэрыялаў і эксплуатацыйных радыеактыўных адходаў, якія ўтварыліся ў Рэспубліцы Беларусь.

**Артыкул 45. Паведамленне замежным дзяржавам аб радыяцыйнай аварыі, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі**

Паведамленне аб радыяцыйнай аварыі, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, што прывяла або можа прывесці да трансгранічнага распаўсюджання радыеактыўных рэчываў, ажыццяўляецца ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 46. Міжнародная дапамога ў выпадку радыяцыйнай аварыі, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі**

Прадастаўленне міжнароднай дапамогі ў выпадку радыяцыйнай аварыі, якая ўзнікла пры ажыццяўленні дзейнасці па выкарыстанні атамнай энергіі, у мэтах абмежавання яе наступстваў і ў мэтах аховы жыцця і здароўя грамадзян, аховы навакольнага асяроддзя і аховы маёмасці ад шкоднага ўздзеяння іанізуючага выпраменьвання ажыццяўляецца ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 12
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 47. Прывядзенне нарматыўных прававых актаў у адпаведнасць з гэтым Законам**

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь на працягу года:

падрыхтаваць і ўнесці ва ўстаноўленым парадку ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь прапановы па прывядзенні заканадаўчых актаў у адпаведнасць з гэтым Законам;

падрыхтаваць і ўнесці ва ўстаноўленым парадку праекты заканадаўчых актаў, якія вызначаюць віды, памеры і парадак прадастаўлення сацыяльных гарантый за шкоднае ўздзеянне іанізуючага выпраменьвання на здароўе работнікаў (персаналу) эксплуатуючых арганізацый і за дадатковыя фактары рызыкі, а таксама крыніцы, за кошт якіх ажыццяўляецца іх фінансаванне;

прывесці рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам;

забяспечыць прывядзенне рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, якія падпарадкаваны Ураду Рэспублікі Беларусь, іх нарматыўных прававых актаў у адпаведнасць з гэтым Законам;

прыняць іншыя меры, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

**Артыкул 48. Уступленне ў сілу гэтага Закона**

Гэты Закон уступае ў сілу праз дзесяць дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Да прывядзення актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Законам яны прымяняюцца ў той частцы, у якой не супярэчаць гэтаму Закону, калі іншае не ўстаноўлена Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

**Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь
А. ЛУКАШЭНКА.**

*30 ліпеня 2008 года, г. Мінск.
№ 426—З*

